

## Крытычнае мысленне ў вучняў

СТАР. 8



## Абараніцца і не стаць злачынцам

СТАР. 11



## Роля земнаводных у цывілізацыі

СТАР. 13

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 ЛІСТАПАДА 2016 г. СУБОТА № 229 (28339)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ЧОВЕН ПРЫПЛЫЎ ПА ОЛЬСЕ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхар вёскі Любонічы Кіраўскага раёна — Іван САЛАНОВІЧ у свой час зацікавіўся этнаграфіяй: яму вельмі хацелася адраджаць народную культуру, каб нашчадкі не забывалі, як жылі і працавалі іхнія продкі. Разам з жонкай Марыяй — майстрыцай і пявунняй — Іван стаў шукаць эксклюзіўныя прадметы народнага побыту. Неаднойчы яны аб'ехалі суседнія Бабруйскі, Клічаўскі і свой, Кіраўскі, раёны. Калі экспанатаў стала дастаткова, у вясковым клубе адкрылі музей Садановічаў, у якім і па сённяшні дзень галоўным экскурсаводам застаецца сам стваральнік. У музеі больш за 800 прадметаў. Але ў сваім паважаным узросце Іван Адамавіч хоча папоўніць сваю калекцыю да тысячы адзінак. Што да чоўна, у якім на фотаздымку стаіць музейшчык, дык некалі ў Любонічах жылі рыбакі, бо недалёка ад вёскі рэчка Ольса ўпадае ў Бярэзіну. Таму ў Любонічах яшчэ сустракаюцца сапраўдныя рарытэты — асінавыя чаўны.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль КАЛІНІН, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Сёння будаўнікі кажуць, што кепска прадаецца жыллё. Дык трэба зразумець фінансава-эканамічную абстаноўку, магчымасці грамадзян. Прадаць як мага даражэй — выгадна і будаўнікам, і вытворцам будматэрыялаў, але трэба арыентавацца на пакупніка, яго спажывецкія магчымасці. Я гэтага не бачу. Трэба сур'ёзна пераасэнсаваць гэтае пытанне. Жыллё павінна быць эфектыўным, а яго кошт — даступным».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.11.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9636 | ▼ |
| Еўра | 2,0804 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0304 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0764 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Бацькоўскі сход

# «У НАШАЙ СЯМ'І ЎСЁ ДОБРА»

## Грамадскае непрыманне прыёмных бацькоў і дзяцей — бар'еры, якія трэба пераадолець

**Дзеці спачатку нібы крыху сароселіся. Сціпла сядзелі за сталамі і па першым часе нават амаль не налягалі на прысмакі. Але вядучы святочнага ранішніка, які праходзіў у кавярні «Праванс», не дарэмна хлеб есць. За чвэрць гадзіны ён разварушыў аўдыторыю, і малыя госці паступова сталі адчуваць сябе вольна. Яны танцавалі, удзельнічалі ў гульнях і флэшмобах. Потым сталі больш актыўна частавацца піроржнымі ды фруктамі. А каля стала арт-грымёра Вольгі выстраілася немалая чарга.**

### Сустрэчы ў клубе

Названае кафэ разам з іншымі спонсарамі ды сацыяльна-педагагічным цэнтрам у Сусветны дзень дзіцяці наладзіла свята для брэсцкіх прыёмных сем'яў. На ранішнік сабралася 46 дзяцей у суправаджэнні 24 бацькоў. Свята сапраўды атрымалася добрым. І не толькі стараннямі самадзейных артыстаў, сярод якіх было нямала выканаўцаў і музыкантаў школьнага ўзросту, ды мецэнатаў. Многія з хлопчыкаў і дзяўчынак, выхаванцаў прыёмных сем'яў, ведаюць адно аднаго, яны з задавальненнем сустрэліся, размаўлялі. Яшчэ цікавей было ўбачыцца бацькам у такой вось нефармальнай абстаноўцы.

**Намеснік дырэктара сацыяльна-педагагічнага цэнтра Жанна ДАЛГАДЗІЛІНА** расказала, што прыёмныя бацькі на базе іх цэнтра праходзяць не толькі курсы падрыхтоўкі да свайго новага статусу, але і атрымліваюць пастаянную дапамогу, карыстаюцца кансультацыямі спецыялістаў. Створаны бацькоўскі клуб «7 Я», на пасяджэнні якога мамы і таты абменьваюцца вопытам, назіраннямі, раяцца з калегамі і спецыялістамі. У клубе пастаянна праводзяцца сумесныя мерапрыемствы для дзяцей і бацькоў, арганізоўваюцца паездкі і экскурсіі. І галоўнае, што кожны прыёмны бацька альбо маці пры ўзнікненні тэрміновага пытання ў любы час можа патэлефанаваць псіхолагу альбо педагогу, каб атрымаць параду. А такія сітуацыі перыядычна ўзнікаюць у любой прыёмнай сям'і, асабліва напачатку.

СТАР. 4

Паўднёвы Усход

Сумесны праект газеты «Звязда» і Магілёўскага аблвыканкама

# ГОРАД НА СКРЫЖАВАННІ ДАРОГ І ЭПОХ

**Летась у Магілёўскай вобласці была зацверджана праграма, якая павінна даць дадатковы імпульс развіццю эканамічнага патэнцыялу сямі паўднёва-ўсходніх раёнаў вобласці. Указам №235 для гэтага прадугледжаны сур'ёзныя льготы і прэферэнцыі, прывабныя для бізнесу і цікавыя для насельніцтва. Праграма будзе заклікаць спрыяць стварэнню новых працоўных месцаў, будаўніцтву жылля, адным словам — росквіту. У рамках праекта «Паўднёвы Усход» «Звязда» працягвае расказваць, чым сёння дыхаюць гэтыя раёны і наколькі яны могуць быць цікавыя патэнцыйным інвестарам. Мы пабывалі ў Чэрыкаўскім, Слаўгарадскім, Краснапольскім, Клімавіцкім і Хоцімскім раёнах. Цяпер нас вітае старадаўні Крычаў. Горад, які заўсёды знаходзіўся ў цэнтры вялікіх гістарычных падзей і эпох. Сёлета ён адзначыў свой 880-гадовы юбілей. У яго вельмі багатае мінулае, не менш цікавае сучаснае і — ёсць усе падставы спадзявацца — вялікая будучыня.**

### Ствараем новыя рабочыя месцы

Крычаў сярод гарадоў паўднёва-ўсходняга рэгіёна карыстаецца найбольшым попытам у інвестараў. Падчас апошняга міжнароднага інвестфоруму ў Магілёве яго наведалі венгры, каб азнаёміцца з умовамі вядзення бізнесу. З моманту падпісання 235-га Указа тут прыкметна ажывіўся бізнес. За гэты перыяд было створана 21 камерцыйнае прадпрыемства. Каб дзелавым людзям было прасцей знаёміцца з патэнцыялам раёна, тут распрацавалі вельмі зручны інвестыцыйны пашпарт.

СТАР. 5



Адчуйце сябе князем Пацёмкіным.

# НОВЫ ІМПУЛЬС ДЛЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўдзячны Славакіі за нармалізацыю адносін Беларусі і ЕС. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў на сустрэчы са старшынёй урада Славакіі Робертам Фіца.**

«Ведаю пазіцыю вашай краіны ў няпростыя для нас часы, калі было сур'ёзнае недастатковае разуменне ў Еўропе: якая Беларусь, якая ў нас палітыка, як мы тут жывём і працуем? Ваша краіна данесла да кіраўніцтва ЕС сапраўднае становішча ў Беларусі», — адзначыў Прэзідэнт, акцэнтаваўшы ўвагу на тым, што Славакія зрабіла нямала для таго, каб у Беларусі з ЕС былі нармалізаваны адносіны.

Аляксандр Лукашэнка таксама лічыць, што Беларусь актыўна супрацоўнічае са Славакіяй, асабліва ў сферы рэалізацыі сумесных праектаў. Беларускі бок зробіць усё неабходнае, каб пры роўных умовах прыярытэт быў аддадзены славацкаму бізнесу.

Акрамя таго, Прэзідэнт выказаў гатоўнасць абмеркаваць усе важныя для двухбаковага супрацоўніцтва пытанні і надзею на тое, што візіт славацкай дэлегацыі будзе новай прыступкай у развіцці двухбаковых адносін.

У сваю чаргу Роберт Фіца звярнуў увагу, што прыехаў у Мінск як прэм'ер-міністр асобнай дзяржавы — Славакіі, дзяржавы, якая старшынствуе ў ЕС. Ён сказаў, што Славакія разглядае Беларусь як дружалюбную краіну, а цяперашні візіт славацкай дэлегацыі паслужыць новым імпульсам у двухбаковым супрацоўніцтве.

Падчас перагавораў вялікая ўвага была ўдзелена перспектывам двухбаковых кантактаў у гандлёва-эканамічнай сферы, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Кіраўнік дзяржавы падтрымаў прапанову славацкага боку па сумесных праектах у фармацэўтыцы, атамнай энергетыцы, вытворчасці шын, дрэваапрацоўцы, газавай сферы, а таксама ў абароннай прамысловасці. Прычым беларускі бок гатовы ў самыя кароткія тэрміны прыступіць да дэталёвага абмеркавання гэтых праектаў.

Роберт Фіца выказаў шмат добрых слоў пра Беларусь, якая, на яго думку, адрозніваецца стабільным і дынамічным развіццём.

# ВІЗІТ У АЗЕРБАЙДЖАН

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 28—29 лістапада здзейсніць афіцыйны візіт у Азербайджанскую Рэспубліку.**

Праграмай візіту прадугледжаны перагаворы кіраўніка дзяржавы з Прэзідэнтам Азербайджана Ільхамам Аліевым у фармаце «сам-насам» і ў пашыраным складзе. Лідары дзвюх краін абмяркуюць стан і перспектывы развіцця беларуска-азербайджанскіх адносін, у тым ліку гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, работу па кааперацыйных праектах, узаемадзеянне ў сферы інвестыцый, аграпрамысловага комплексу, спорту.

Па выніках перагавораў чакаецца падпісанне шэрагу міжнародных дакументаў, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Запланавана таксама сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з прэм'ер-міністрам краіны Артурам Расі-задэ.

* * *

Напярэдадні візіту кіраўнік нашай дзяржавы даў інтэрв'ю інфармацыйнаму агенцтву Trend, у якім абазначыў асноўныя прыярытэты двухбаковых адносін. «Мы гатовы актыўна ўдзельнічаць у праектах, якія выходзяць за рамкі звычайнага гандлю. Гэта стварэнне сумесных вытворчасцей у розных сферах эканомікі на аснове інавацыйных ідэй, інтэнсіфікацыя супрацоўніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі, вытворчасці спажывецкіх тавараў, транспарту, развіцця інфармацыйных тэхналогій», — заявіў беларускі лідар. Перапрацоўка азербайджанскай нафты на беларускіх заводах уяўляе вялікі інтарэс, адзначыў Прэзідэнт.

На пытанне наконт нагорна-карабахскага канфлікту Аляксандр Лукашэнка заявіў, што беларуская пазіцыя застаецца нязменнай: праблема можа быць вырашана выключна за сталом перагавораў і ў адпаведнасці з прынцыпамі міжнароднага права. «Беларусь гатова аказаць неабходнае садзейнічанне бакам у пошуку мірнага выхаду з гэтага канфлікту. Мы зыходзім з таго, што няма для людзей большай каштоўнасці, чым мір і спакой на роднай зямлі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

# ФАКТАР СПАКОЮ Ў КРАІНЕ

**Так Прэзідэнт ацаніў працу Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў падчас рабочай сустрэчы са старшынёй Цэнтрвыбаркама Лідзіяй Ярмошынай.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што 20 снежня мінае тэрмін паўнамоцтваў дзеючага складу Цэнтрвыбаркама, і падзякаваў усім членам ЦВК за тую бескампрамісную і па-сапраўднаму адказную працу, якую яны праводзілі.

«Па-рознаму да гэтага могуць ставіцца ў нас асобныя «таварышы». Але нават яны разумеюць, што ў свеце, напэўна, няма дзяржавы, дзе б так эфектыўна працавала Цэнтральная выбарчая камісія, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы вывучалі гэтае пытанне, праводзілі сацыялагічныя даследаванні: не проста большасць — пераважная большасць станоўча ацэньвае працу ЦВК і старшыні».

На сустрэчы разглядаліся кандыдатуры, якія ўвойдуць у новы склад Цэнтрвыбаркама, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Акрамя таго, былі ўзгоднены патэнцыяльныя кіраўнікі ЦВК. Плануецца, што старшынёй камісіі застанецца Лідзія Ярмошына. На пасаду сакратара прапануецца начальнік арганізацыйна-прававога аддзела камісіі Алена Дмухайла.

Пасаду намесніка старшыні ЦВК па традыцыі зойме дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, якім цяпер з'яўляецца Вадзім Іпатаў.

Прэзідэнт таксама абмеркаваў з Лідзіяй Ярмошынай удасканаленне выбарчага працэсу і заканадаўства. Усе прапановы Цэнтрвыбаркама знайшлі падтрымку з боку кіраўніка дзяржавы.

## ■ Парламенцкі дзённік

# Чарнаморскі інтарэс

## Беларусь зацікаўлена ў рабоце з марскім рэгіёнам

**Гэтымі днямі парламенцкая дэлегацыя Рэспублікі Беларусь на чале са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаілам МЯСНІКОВІЧАМ узяла ўдзел у мерапрыемствах Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў-удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў (МПА СНД) і Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (ПА АДКБ) у Санкт-Пецярбургу.**

Спікер Савета Рэспублікі правёў сустрэчы з кіраўнікамі расійскага парламента — старшынёй Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расіі Валянцінай Мацвіенка і старшынёй Дзяржаўнай Думы Вячаславам Валодзіным. Бакі пацвердзілі ўзаемную зацікаўленасць у далейшай актывізацыі міжпарламенцкага дыялогу, абмеркавалі ход падрыхтоўкі чацвёртага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, узаемадзеянне на міжпарламенцкіх пляцоўках і ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза. На сустрэчы Міхаіла Мясніковіча з генеральным сакратаром Парламенцкай Асамблеі Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва Асафам Гаджыевым была адзначана зацікаўленасць Беларусі ў развіцці ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з краінамі чарнаморскага рэгіёна і Арганізацыяй Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва, у якой наша краіна мае статус назіральніка.

У ходзе пасяджэння Савета ПА АДКБ былі разгледжаны кадравыя пытанні (старшынёй абраны Вячаслаў Валодзін), а таксама праекты рэкамендацый, унесеных па ініцыятыве пастаянных камісій ПА АДКБ. У ходзе пасяджэння Савета МПА СНД адбыліся выбары старшыні Савета МПА СНД, на якіх была пераабраная спадарыня Валянціна Мацвіенка. Акрамя таго, беларуская парламенцкая дэлегацыя ўзяла ўдзел у сорак пятым пленарным пасяджэнні МПА СНД.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# У госці да партнёраў

## Віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў збіраецца з візітам у Астану

**Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Баласлаў ПІРШТУК выступіць на Міжнароднай канферэнцыі «25-годдзе незалежнасці Рэспублікі Казахстан: Вынікі. Дасягненні. Погляд у будучыню», якая пройдзе 28 лістапада ў Астане.**

Акрамя гэтага, падчас двухдзённай камандзіроўкі віцэ-спікер сустрэнецца з кіраўніцтвам Мажыліса (ніжняй палаты) казахстанскага парламента і кіраўнікамі парламенцкіх дэлегацый замежных краін.

Як паведаміла прэс-служба Палаты прадстаўнікоў, канферэнцыя праводзіцца напярэдадні святкавання Дня першага Прэзідэнта Казахстана і 25-годдзя Дня незалежнасці краіны. Яна заклікана стаць эфектыўнай пляцоўкай для публічнага абмеркавання вядучымі замежнымі і казахстанскімі палітыкамі, парламентарыямі і прадстаўнікамі навукі вынікаў развіцця дзяржавы за гады незалежнасці.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

# Парадак дня сфарміраваны

## На пасяджэнні Савета Палаты прадстаўнікоў абазначылі пытанні для разгляду на першай сесіі

**У прыкладны графік уключаны 28 праектаў законаў і адзін Дэкрэт Прэзідэнта. Законапраекты, якія парламентарыі плануюць разгледзець у бліжэйшы час, накіраваны на ўдасканаленне заканадаўства ў сферах дзяржаўна-прыватнага партнёрства, судовага ладу і судаводства, дэкларавання даходаў і маёмасці, адміністрацыйных правапарушэнняў.**

У парадак дня таксама ўключаны дзевяць праектаў законаў аб ратыфікацыі міжнародных пагадненняў Рэспублікі Беларусь, накіраваных на развіццё інтэграцыйных працэсаў у рамках ЕАЭС і СНД, а таксама на ўмацаванне двухбаковага супрацоўніцтва з Арменіяй, Босніяй і Герцагавінай, Гватэмалай, Польшчай і Туркменістанам. Яшчэ адным важным пытаннем, разгледжаным на пасяджэнні, стала фарміраванне дэлегацый Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь для ўдзелу ў міжнародных арганізацыях. Акрамя гэтага, ідзе актыўны працэс фарміравання рабочых груп па супрацоўніцтве з парламентамі замежных дзяржаў. Усяго дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў шостага склікання будзе створана каля 70 такіх груп.

Вырашэнне гэтых задач у значнай ступені звязана з ажыццяўленнем кантрольнай дзейнасці дэпутацкага корпуса. Па выніках абмеркавання гэтага пытання ўдзельнікі пасяджэння прынялі рашэнне стварыць пры Савеце Палаты прадстаўнікоў рабочую групу па арганізацыі вывучэння дэпутатамі практыкі прымянення заканадаўства Рэспублікі Беларусь і ўзаемадзеяння з мясцовымі органамі ўлады.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** звярнуў асаблівую ўвагу на неабходнасць своечасовай і якаснай падрыхтоўкі праектаў законаў і важнасць падтрымання пастаяннага дыялогу з грамадзянамі. Характарызуючы асаблівасці парламенцкай дыпламатыі, ён адзначыў, што галоўны крытэрый ацэнкі працы дэпутацкага корпуса — выніковасць у прасоўванні нацыянальных інтарэсаў на міжнароднай арэне.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by* ■

# Новы этап кааперацыі

**Беларусь і Славакія могуць ствараць сумесныя вытворчасці з перспектывай выхаду на адзіны рынак ЕАЭС і ЕС. Аб гэтым заявіў учора прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ на сустрэчы са старшынёй урада Славакіі Робертам ФІЦА.**

Андрэй Кабякоў прапанаваў зрабіць максімум намаганняў для стварэння станоўчай дынамікі развіцця нашых гандлёва-эканамічных адносін. У Славакіі функцыянуюць суб'екты тавараправоднай сеткі буйных беларускіх машынабудаўнічых прадпрыемстваў-экспарцёраў. «Беларусь зацікаўлена ў прасоўванні з дапамогай Славакіі шырокай наменклатуры прамысловай прадукцыі на рынак Цэнтральнай Еўропы», — падкрэсліў кіраўнік беларускага ўрада. На яго думку, вопыт паспяховага ўдзелу славацкіх кампаній у мадэрнізацыі беларускіх прадпрыемстваў павінен стаць асновай для пераходу на наступны этап прамысловай кааперацыі — стварэння сумесных высокатэхналагічных вытворчасцей з перспектывай выхаду на рынак Еўразійскага эканамічнага саюза, Еўрасаюза, а таксама трэціх краін.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | | |
|---|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | | Лот № 1. Капитальное строение (Здание административно-хозяйственное (клуб-контора) с инв. №200/С-60925, 1972 г.п., общ. пл. 1418,4 м² стоимостью 43 692,30 белорусских рублей |
| **Собственник (владелец) имущества** | | ОАО «Птицефабрика Городок» (УНП 390374176) |
| **Наличие обременений** | | Отсутствуют |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | | Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Хайсы, ул. Кедровая, 1 |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | | 14.12.2016 в 15.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3. |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by) Судебный исполнитель Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс: (80212) 610421, (8033) 6879148 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома №3642903001037 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505, **не позднее 15.00 13.12.2016 г.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. | |


# ПАТЭНЦЫЯЛ КРЭПАСЦІ ВЕЛІЗАРНЫ

**Брэсцкая крэпасць нядаўна адзначыла два юбілеі: 60-годдзе Музея абароны і 45-годдзе мемарыяльнага комплексу. У рамках святкавання адбылася прэзентацыя новага дакументальнага фільма «Цытадэль памяці», які быў зняты менавіта да названых дат пры падтрымцы Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.**



На ўрачыстым вечары з нагоды юбілеяў было шмат гасцей, у тым ліку і з Расіі. Напрыклад, сваякі легендарнага абаронцы крэпасці Самвела Мацевасяна. Сын і ўнук героя, якія жывуць у Маскве, нямала робяць для папулярызацыі брэсцкага помніка мужнасці і стойкасці савецкага народа. Гасцей шчыра прывітаў і падзякаваў ім **дырэктар мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу краіны Рыгор БЫСЮК.**

Рыгор Рыгоравіч расказаў прысутным, колькі кніг, навуковых зборнікаў, фотаальбомаў, буклетаў, мастацкіх і дакументальных фільмаў пра крэпасць створана апошнім часам з удзелам супрацоўнікаў мемарыяла. Гэта работа будзе працягнута. Тым больш што крэпасць не толькі помнік, прысвечаны падзеям апошняй вайны, але і цікавы фартыфікацыйны аб'ект сярэдзіны XIX — пачатку XX стагоддзяў.

— Патэнцыял крэпасці велізарны, і гэты патэнцыял наш калектыў гатовы рэалізоўваць, — падкрэсліў Рыгор Бысюк.

Тэма знайшла свой працяг на нядаўнім, 47-м пасяджэнні пастаянна дзеючага семінара пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі па пытаннях будаўніцтва Саюзнай дзяржавы. Удзельнікі семінара рэкамендавалі міністэрствам адукацыі дзвюх дзяржаў уключыць фільм «Цытадэль памяці» ў планы пазакласнай работы.

На пасяджэнні таксама абмеркавалі сумесны турыстычны праект «Брэсцкая крэпасць — Валгаград». У выпадку яго рэалізацыі дзеці, моладзь змогуць наведаць названыя гарады ў рамках адной паездкі, каб вывучаць гісторыю на месцы рэальных падзей.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

# Экспертыза па міжнародных стандартах

## У нашай краіне створана трохузроўневая сістэма даследавання наркатычных сродкаў

**У пятніцу, 25 лістапада, у Віцебску прэзентавалі адрамантаваны будынак упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці. Будынак, узведзены ў сярэдзіне 1960-х гадоў для школы працоўнай моладзі, змяніўся звонку і ўнутры. Тут стварылі ўмовы для правядзення самых складаных экспертыз пры дапамозе сучаснага абсталявання.**

У цяперашні час тут праводзяцца 35 галоўных відаў экспертыз. У тым ліку балістычныя, біялагічныя, генетычныя, хімічныя, дактыласкапічныя. Таксама даследуюцца почырк, наркотыкі, грошы і дакументы. Менавіта судовыя эксперты выяўляюць факты змены ідэнтыфікацыйных нумароў транспартных сродкаў, даследуюць спіртазмяшчальныя вадкасці.

Толькі за 9 месяцаў бягучага года абласное ўпраўленне выканала каля 36 тысяч экспертыз і амаль 3,5 тысячы даследаванняў. Акрамя таго, віцебскія судовыя эксперты дапамагалі супрацоўнікам праваахоўных органаў у правядзенні больш чым 14 тысяч аглядаў месцаў здарэнняў, больш чым 3 тысячы следчых дзеянняў, больш чым 2 тысячы аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў.

Разумная тэхніка цяпер дае магчымасць у самыя кароткія тэрміны з высокай дакладнасцю праводзіць даследаванні. Напрыклад, эксперты могуць па запісе голасу ўстанавіць асобу, аднавіць выдаленыя файлы. Ажыццяўляецца і ўсё больш запатрабаваная экспертыза радыёэлектронных прылад. У спецыялістаў ёсць неабходная тэхніка і прыборы для працы з праграмным забеспячэннем мабільных тэлефонаў. У лабараторыі аддзела судова-хімічных экспертыз могуць дакладна высвятліць прычыны атручвання і смерці.

**Старшыня Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь, генерал-маёр юстыцыі Андрэй ШВЕД** на цырымоніі адкрыцця новага будынка расказаў, што на абнаўленне і ўдасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы накіроўваюцца значныя сродкі. Дарэчы, не толькі бюджэтныя, але і заробленыя ад правядзення платных даследаванняў. Ён падкрэсліў, што завяршылася стварэнне трохузроўневай сістэмы судова-экспертнага забеспячэння працэдзіяння нарказлачыннасці.

— Яна ўнікальная на постсавецкай прасторы. Цяпер не толькі ў Мінску, абласных цэнтрах, але і ў буйных райцэнтрах ёсць найноўшае абсталяванне для даследаванняў усяго спектру наркотыкаў, — адзначыў генерал-маёр.

У другім паўгоддзі закупілі 7 спецыяльных спектрометраў для экспертыз наркотыкаў. Кошт аднаго — больш за 200 тысяч рублёў. Штогод за абслугоўванне кожнага прыбора трэба каля 20 тысяч. На сёння яны ўстаноўлены ў Бабруйску і Наваполацку. Днямі аналагічнае абсталяванне запрацуе ў Пінску, Лідзе і Мазыры.

— Пасля ўводу ў эксплуатацыю абсталявання ў райцэнтрах мы завяршаем фарміраванне трохузроўневай сістэмы даследавання. Кругласутачна за 30—40 хвілін можна правесці любы наркатычны сродак. На бліжэйшыя дзесяцігоддзі праваахоўныя органы і суды забяспечаны самым апаратыўным і высакаякасным судова-экспертным абсталяваннем, — дадаў Андрэй Швед.

З часам у Віцебску з'явіцца першы ў краіне судова-экспертны гарадок. Ужо распачата праектаванне чарговага пускавога комплексу. Усе экспертныя падраздзяленні будуць размешчаны ў адным месцы. Пакуль што некаторыя з іх знаходзяцца ў іншым будынку, недалёка ад чыгуначнага вакзала. Адчыняць і морг, які будзе адпавядаць сучасным стандартам. Абласны цэнтр даўно мае ў гэтым патрэбу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

■ Якасць анлайн

## СПАЖЫЎЦЫ МОГУЦЬ ПАКІНУЦЬ СВАЕ ВОДГУКІ АБ ЛЕПШЫХ ТАВАРАХ

**Як паведамілі ў прэс-службе Дзяржстандарта, цяпер, згодна з новым парадкам правядзення конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь», спажыўцы могуць пакінуць свае водгукі ў дачыненні да арганізацый і якасці іх прадукцыі і паслуг, якія паспяхова прайшлі першы — абласны — этап конкурсу і сталі фіналістамі.**

Водгукі, якія паступілі, рэспубліканская конкурсная камісія будзе ўлічваць пры падвядзенні канчатковых вынікаў конкурсу на другім — рэспубліканскім — этапе.

Для таго каб накіраваць водгук, трэба зайсці па спасылцы http://quality.gskp.by, выбраць намінацыю: «Харчовыя тавары», «Прамысловыя тавары для насельніцтва і вырабы народных промыслаў», «Прадукцыя вытворча-тэхнічнага прызначэння», «Паслугі насельніцтву» і націснуць кнопку «Падабаецца» ці «Не падабаецца». Акрамя таго, спажыўцы могуць накіраваць водгук у сакратарыят камісіі да 5 снежня на e-mail: ntc@belgiss.by.

Больш падрабязную інфармацыю аб конкурсе можна знайсці на сайце www.gosstandart.gov.by у рубрыцы «Конкурсы ў галіне якасці».

**Дар'я ГАСЦІЛОВІЧ**

## СУСТРЭЧА НА ПЕРАПРАВЕ

**У нядзелю, 27 лістапада, на Брылёўскім полі ў Барысаўскім раёне адбудзецца ваенна-гістарычная рэканструкцыя «Беразіно-2016».**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фестываль праілюструе пераправу Напалеона цераз Бярэзіну каля беларускіх вёсак Студзёнка і Брылі. Тады, 204 гады таму, руская армія спрабавала акружыць абяскроўленыя войскі французскага імператара і канчаткова іх знішчыць. Бітва стала настолькі знакавай, што ў французскай мове з'явілася новае слова — «berezina», якое азначае крушэнне ўсіх надзей. Ваенна-гістарычны фестываль, прысвечаны гэтаму змаганню, ужо даўно набыў міжнародны статус. На свяце чакаюць гасцей і ўдзельнікаў з Расіі, Украіны, краін блізкага і далёкага замежжа. У праграме таксама ўскладанне кветак да помнікаў рускім воінам, французскім салдатам, памятнага знака «Смутак і пакланенне», наведванне музея, майстар-класы па танцах, кірмашы-выставы народных рамеснікаў, інтэрактыўныя тэматычныя пляцоўкі для дарослых і дзяцей.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

# РУЛЬ У ПРЫГОЖЫХ РУКАХ


Вікторыя КАПУСЦІНА (г. Жлобін).
Фота БЕЛТА.

## У Магілёве адбыліся рэспубліканскія спаборніцтвы «АўтаЛэдзі-2016»

Барацьба за тытул «АўтаЛэдзі» ішла на аўтадроме Аб'яднанай тэхнічнай школы «ДТСААФ» №1 Магілёва пяць доўгіх гадзін. Сем амбіцыйных і чароўных удзельніц рэспубліканскага фіналу конкурсу розныя па прафесіі, але аднолькава ўпэўненыя і мабільныя за кошт свайго аўто, дэманстравалі ўменні ў майстэрстве фігурнага кіравання і практыкаваліся ў творчых паядынках. У выніку пераможцай стала жыхарка Клецка з Мінскай вобласці Алена Пацеліна, на другім месцы — Марыя Лукініч з Оршы Віцебскай вобласці, трэцяй стала Вікторыя Анішчанкава з Круглага Магілёўскай вобласці.

— Гэты конкурс не проста відовішчны. Адзін з яго важных аспектаў — патрыятычнасць. Не выпадкова старт фіналу «АўтаЛэдзі-2016» быў дадзены на Буйніцкім полі, якое стала сімвалам мужнасці і адвагі абаронцаў нашай краіны ў гады Вялікай Айчыннай вайны, — падкрэсліў **першы сакратар Магілёўскага абкама БРСМ Павел АЛЕКСА.**

Мерапрыемства праводзілася па ініцыятыве БРСМ, упраўлення ДАІ МУС Рэспублікі Беларусь пры падтрымцы «Магілёўскага аўтаклуба 4х4», Дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Беларуснафта» і грамадскага аб'яднання «АўтаАмерыка». Конкурс дапамагае павысіць прафесійны ўзровень жанчыны-кіроўцы, не аўтарытэт як удзельніка дарожнага руху і накіраваны на прафілактыку дарожна-транспартнага траўматызму, — адзначылі арганізатары.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*


ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **Лот № 1.** Капитальное строение (цех ремонта весового оборудования) с инв. №250/С-31535 общей площадью 726 м² стоимостью 92 000 рублей 60 копеек. **Лот № 2.** Капитальное строение (наземный склад) с инв. №250/С-29248 общей площадью 67,6 м² стоимостью 7 815 рублей 75 копеек. **Лот № 3.** Капитальное строение (наземный склад) с инв. №250/С-29250 общей площадью 67,6 м² стоимостью 7 814 рублей 90 копеек. **Лот № 4.** Капитальное строение (наземный склад) с инв. №250/С-29249 общей площадью 67,5 м² стоимостью 7 805 рублей 55 копеек. **Лот № 5.** Капитальное строение (наземный склад) с инв. №250/С-29251 общей площадью 67,2 м² стоимостью 7 782 рубля 60 копеек. **Лот № 6.** Капитальное строение (открытый склад) с инв. №250/С-29252 общей площадью 403 м² стоимостью 30 446 рублей 15 копеек. **Лот № 7.** Капитальное строение (склад) с инв. №250/С-29247 общей площадью 645,2 м² стоимостью 82 233 рубля 25 копеек |
|---|---|
| **Собственник (владелец) имущества** | ОАО «Тираспольская ПМК» (УНП 300125146) |
| **Наличие обременений** | Отсутствуют |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Полоцк, промузел «Ксты» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 14.12.2016 в 15.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3. |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by) Судебный исполнитель Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс (80212) 610421, (8033) 6879148 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома №3642903001037 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505, **не позднее 15.00 13.12.2016 г.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |


■ Запрашальнік

## ЛЁД І ХУТКАСЦЬ

### У гэтыя выхадныя канькабежны стадыён «Мінск-Арэны» прыме этап Кубка свету

**Самыя перспектыўныя юніёры і неасеньёры канькабежнага спорту выступяць на сталічным лёдзе. У спаборніцтвах, акрамя гаспадароў турніру, прымуць удзел прадстаўнікі больш чым дваццаці краін.**

Гэты этап упершыню будзе праходзіць у новым фармаце. Акрамя групы юніёраў, медалі ў шасці дысцыплінах будуць разыгрываць і спартсмены маладзёжнага ўзросту (да 23 гадоў). Нашу краіну на гэтым этапе прадстаўляць чэмпіён свету сярод юніёраў 2016 года на дыстанцыі 500 метраў Ігнат Галавацюк, а таксама члены нацыянальнай каманды Аляксей Кірпічнік, Глеб Астапаў, Антон Капусцін, удзельнікі другіх зімовых юнацкіх Алімпійскіх гульняў-2016 Яўгенія Вараб'ёва, Ганна Ніфонтава, Яўген Балгоў і Віктар Рудэнка. Сваё рэнамэ ў гонцы каманднага спрынту будзе пацвярджаць і бронзавы прызёр чэмпіянату свету сярод юніёраў гэтага года Станіслаў Ігнаценка.

У суботу пройдуць забегі на дыстанцыі 1000 і 3000 метраў і камандны спрынт. У нядзелю медалі будуць разыграны ў масстарце, а таксама на дыстанцыях 500 і 1500 метраў. Кошт білета для дарослых складзе 5 рублёў, для дзяцей — 3 рублі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Здарэнне

## ЗАТРЫМАЛІ ПРАЗ СЕМ ХВІЛІН ПАСЛЯ РАБАВАННЯ

**У сталіцы праваахоўнікі па «гарачых слядах» затрымалі маладога чалавека, які здзейсніў грабеж у адносінах да грамадзянкі Кітая.**

— Каля 23 гадзін яна, студэнтка адной з нашых ВНУ, стаяла каля пад'езда і размаўляла па тэлефоне. Раптоўна падбег невядомы малады чалавек і вырваў з рук дзяўчыны «Iphone 6S», пасля чаго кінуўся наўцёкі, — расказала **прэс-афіцэр Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ.** — Студэнтка пачала клікаць на дапамогу. Яе крык пачулі супрацоўнікі аддзела дэпартамента аховы, якія патрулявалі тэрыторыю. Міліцыянеры імгненна ацанілі сітуацыю, пачалі пошук зламысніка, і ўжо праз сем хвілін той быў затрыманы. Ім аказаўся 19-гадовы навучэнец адной з прафесійна-тэхнічных устаноў. Зараз хлопцу пагражае пакаранне да чатырох гадоў пазбаўлення волі ўключна.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# «У НАШАЙ СЯМ'І ЎСЁ ДОБРА»

## Адаптацыя

І самая тыповая з іх — адаптацыя дзіцяці ў новых умовах, калі хлопчык альбо дзяўчынка трапляюць у сямейны калектыў, дзе трэба жыць па правілах, да якіх яны не прывыклі. Ну, напрыклад, дзіця жыло ў кватэры з нядбайнымі бацькамі, дзе дарослыя забаўляліся п'янкамі, дзе нормай былі нецвярозыя кампаніі, шум, песні, а то і скандалы да раніцы. Малыя пры гэтым былі поўнасцю пакінутыя самі сабе. Іх ніхто не вучыў прыбіраць за сабой, сачыць за сваім адзеннем і знешнім выглядам, рыхтаваць урокі, нават чысціць зубы перад сном. А тут пачынаюцца патрабаванні, звязаныя з распарадкам дня, пэўныя абавязкі і іншыя непрывычныя рэчы. І дзеці вельмі часта пачынаюць выказваць пратэст самым нечаканым чынам. Тут ужо патрэбныя цярпенне і мудрасць бацькоў.

Жанна Адольфаўна згадала адносна нядаўні выпадак з хлопчыкам, які з прытулку перайшоў у сямейны дзіцячы дом. Справа ўскладнялася тым, што з двара свайго новага дома школьнік бачыў дом сваіх кроўных бацькоў. Тыя эмоцыі і ўспаміны, вядома, не праходзілі бясследна для дзіцячай душы і выліваліся ў своеасаблівы пратэст. Прыёмныя бацькі спачатку спрабавалі справіцца самі, потым раіліся са спецыялістамі. Пасля размовы з новымі бацькамі і хлопчыкам Жанна Далгадзіліна западозрыла, што на малога дрэнна ўплываюць яго біялагічныя бацькі. Пайшла да іх, пагаварыла і падазрэнні пацвердзіліся. Але педагогу ўдалося пераканаць гэтых людзей, што такім чынам яны толькі шкодзяць свайму дзіцяці. Яны крыху памянялі рыторыку размоў пры сустрэчах з сынам. І абстаноўка ў сям'і стала наладжвацца.

## Пераадоленне

Яшчэ педагог з вялікім стажам лічыць, што пратэст у дзяцей нярэдка выклікае стаўленне да іх навакольных. Вельмі часта ў асяроддзі равеснікаў яны адчуваюць сябе не такімі, як усе. Дзеці — народ жорсткі, часам, не асабліва ўсведамляючы наступстваў, могуць нанесці адчувальную псіхалагічную траўму аднакласніку альбо аднакласніцы нават не словам, а інтанацыяй, з якой вымаўляецца слова «прыёмны». Пераадолець бар'ер адчування сябе непаўнавартым членам грамадства ці канкрэтнай супольнасці для малога чалавека бывае вельмі складана. Але не пераадолеўшы яго, такі чалавек ніколі не стане паспяховым. Таму і бацькі, і тыя, хто рыхтуе бацькоў, звяртаюць на гэта асаблівую ўвагу. Дарэчы, падобныя праблемы бываюць і ў бацькоў, яны нібы крыху сарамяюцца свайго статусу, а павінны несці яго горда і пачуваць сябе самадастатковымі. Быць прыёмнымі бацькамі вельмі цяжкая і пачэсная праца. І ў рэшце рэшт грамадства ацэніць намаганні і ўклад людзей, якія ахвяруюць частку свайго цяпла чужым дзецям. Сёння напружаная сітуацыя на рынку працы, шмат мужчын і жанчын застаюцца без работы. Але, скажыце, многія з іх пагадзіліся б узваліць на плечы груз адказнасці прыёмнага бацькоўства? Вось і я пра тое.



Юлія ГУЛЯЕВА з дачкой Васілінкай.

Значыць, грамадства мусіць ацаніць і падтрымаць гэтых людзей, іншымі словамі, аддаць ім належнае. І сведчаннем таму душэўнае мерапрыемства, пра якое згадвалася вышэй. Галіна і Георгій Хмяльніцкія, гаспадары кафэ «Праванс», выступілі галоўнымі спонсарамі свята. Іх падтрымала артгрупа «Халідэй». Удзельнікі названага калектыву, як і іншыя артысты, працавалі бясплатна. Ваеннаслужачыя Брэсцкай памежнай групы перадалі падарункі. Яны, дарэчы, пастаянна падтрымліваюць сацыяльна-педагагічны цэнтр. Любое такое мерапрыемства, паездка, экскурсія азначаюць удзел таго ці іншага спонсара. На шчасце, іх не становіцца менш, што сведчыць аб сталенні нашага грамадства.

## Прыманне

Першымі, з кім давялося пазнаёміцца аўтару гэтых радкоў на ранішніку, сталі прыёмная мама Юлія Гуляева і яе цудоўная дачушка Васіліна Выркоўская. Юлія ўзяла Васілінку ва ўзросце 1,5 года. Дзяўчынка не хадзіла, медыцынская даведка займала не адзін ліст. Цяпер Васіліна — вельмі актыўная, прыгожае, кантакнае дзіця. Праўда, у сваё шэсць гадоў яна выглядае на чатыры і крыху адстае ў развіцці ад равеснікаў. Але яны з мамай не здаюцца, ходзяць на заняткі і працэдуры фактычна кожны дзень, і Юлія спадзяецца, што паступова дзіця выраўняецца з іншымі. У іх, Юліі і Васіліны, нават колер валасоў падобны. І што мяне асабліва парадавала, Юлія Гуляева адразу пагадзілася на асобную сустрэчу, каб расказаць аб праблемах і клопатах прыёмнай маці. Да гэтага, крыху раней мне даводзілася сустракацца з адмовай бацькоў. А тут наадварот, людзі не камплексуюць, яны гатовыя дзяліцца вопытам, вучыцца ў іншых.

Як, дарэчы, шматдзетныя маладыя бацькі Ала і Дзмітрый Зданевічы, пра якіх я пісала летась («Звязда» за 28 лютага 2015 года — «Любоў — гэта дзеянне»). Тады ў іх разам з прыёмным сынам было чацвёра дзяцей, зараз — пяцёра. І прыйшлі на свята ўсе разам. Самы маленькі са Зданевічаў сядзеў увесь час на руках у мамы і таты. Меншыя весяліліся з іншымі дзецьмі. А васьмікласнік Валера значна пасталеў. Яго ўзялі з дзіцячага дома чатыры гады таму. За гэты час Ала і Дзмітрый сутыкнуліся з многімі праблемамі прыёмнай сям'і, але падобна на тое, годна іх пераадольваюць. У тую сустрэчу яны здзівілі мяне сваёй дарослайласцю і мудрасцю, нягледзячы на тое, што абаім у раёне 30 гадоў. Можа, таму, што Ала рана засталася без роднай маці і ўсё жыццё марыла пра вялікую сям'ю, якую яна напоўніць святлом. Можа, дало плады строгае рэлігійнае выхаванне, якое цяперашня бацькі атрымалі ў сваіх сем'ях. Але для іх правілы, традыцыі, нормы сямейнага жыцця — тое, што пераглядку не падлягае. Таму, несумненна, гэты хлопчык многаму навучыцца ў сваёй новай сям'і. А яны апякуюць яшчэ аднаго выхаванца дзіцячай установы, наведваюць яго, падтрымліваюць, запрашаюць у госці. На пытанне, як цяпер складваюцца іх справы, Ала адказала лаканічна: «У нас усё добра». Значыць, так і ёсць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Прававая гасцёўня

# ВЯРНУЦЬ ДАЎГІ СТАЛА ПРАСЦЕЙ

*Чула, што ў заканадаўстве, якое рэгулюе здзяйсненне выканаўчых надпісаў аб спагнанні запазычанасці па асобным відам гаспадарчых дагавораў, нядаўна адбыліся змены, што тычацца прадстаўляемых дакументаў. Што менавіта было зменена і навошта?*

**Валянціна Г.,** *Уздзенскі раён.*



**На пытанне адказвае Алена МІРОШНІКАВА, галоўны спецыяліст упраўлення натарыята і загсаў Міністэрства юстыцыі Беларусі:**

Сапраўды, пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 16 жніўня 2016 г. №638 унесены дапаўненні ў пералік дакументаў, паводле якіх спагнанне выконваецца ў бясспрэчным парадку на падставе выканаўчых надпісаў (далей — Пералік), у частцы ўказання дакументаў, якія прадстаўляюцца натарыусу для здзяйснення выканаўчых надпісаў аб спагнанні запазычанасці па асобных відах гаспадарчых дагавораў.

Напрыклад, для здзяйснення выканаўчага надпісу аб спагнанні запазычанасці па дагавору субарэнды рухомай маёмасці, пры ўмове ўстанаўлення арэнднай платы ў цвёрдай суме плацяжоў, якія ўносяцца перыядычна або адначасова, няўстойкі (штрафу, пені) у сувязі з такой запазычанасцю, калі яе выплата прадугледжана заканадаўствам або дагаворам, спагнальнік павінен прадставіць натарыусу наступныя дакументы:

дагавор субарэнды і яго завераную копію, завераную копію дагавора арэнды, завераную спагнальнікам копію дакумента, які ўтрымлівае згоду арэндадаўца на здачу арэндаванай маёмасці ў субарэнду (за выключэннем выпадкаў, калі такая згода прадугледжана ў дагаворы арэнды ці ёсць адзнака арэндадаўца на дагаворы субарэнды). А таксама дакументы, якія пацвярджаюць перадачу маёмасці па дагавору субарэнды, і дакумент аб разліку сумы запазычанасці, аформлены адпаведным чынам.

Аналагічныя дапаўненні ўнесены ў Пералік і для некалькіх іншых відаў дагавораў. Напрыклад, для дагавора субарэнды нежылога памяшкання ў будынках, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці і ўласнасці юрыдычных асоб (індывідуальных прадпрымальнікаў), а таксама для дагавора субпадраду.

Пералік дапоўнены адпаведнымі часткамі, якія прадугледжваюць дакументы, неабходныя для спагнання запазычанасці па названых дагаворах.

Змены закранулі таксама пункт 25 Пераліку, у якім прадугледжаны дакументы, што ўстанаўліваюць запазычанасць па дагаворах куплі-продажу, пастаўкі, падраду, перавозкі, платнага аказання паслуг, захоўвання, а таксама няўстойку (штраф, пені) у сувязі з такой запазычанасцю, калі яе выплата прадугледжана заканадаўствам або дагаворам, прызнаных даўжніком у пісьмовай форме.

Пастановай унесены карэкціроўкі ў частцы ўказання асоб, якія падпісваюць дакумент аб разліку сумы запазычанасці, і прадстаўлення дакументаў, што пацвярджаюць паўнамоцтвы гэтых асоб на яго падпісанне.

Для спагнання запазычанасці ў бясспрэчным парадку на падставе выканаўчых надпісаў натарыусаў па дагаворах аб аказанні паслуг сувязі, па патрабаваннях, заснаваных на крэдытным дагаворы, і іншых дагавораў з улікам заключаных дагавораў уступкі патрабавання, а таксама ў выпадку пераводу даўжніком (са згоды крэдытора) сваёй запазычанасці Пералік дапоўнены пунктам 28, дзе вызначаюцца дадатковыя дакументы, якія павінен прадставіць спагнальнік для здзяйснення адпаведнага выканаўчага надпісу.

Унесеныя змены і карэкціроўкі накіраваны на спрашчэнне працэдуры спагнання даўгоў па пералічаных дагаворах.

**Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыя- лістамі Мінюста мы будзем шукаць на іх адказы.**


Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** | | | |
| **Продавец** | **ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Октябрьская, 16** | | | |
| **ЛОТ № 1:** | | | | |
| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| Б 3/к Административно-бытовой корпус | Здание многофункциональное | 702,8 кв.м | 500/С-45993 | г. Минск, ул. Октябрьская, 16 |
| **Начальная цена с учетом НДС 20%** | | **1 553 358 бел. руб. (BYN)** | | |
| **ЛОТ № 2:** | | | | |
| Г 1/к Производственный корпус | Здание многофункциональное | 4157,2 кв.м | 500/С-45994 | г. Минск, ул. Октябрьская, 16 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | | **3 841 485,60 бел. руб. (BYN)** | | |
| **ЛОТ № 3:** | | | | |
| Д 1/к Производственный корпус | Здание многофункциональное | 1115 кв.м | 500/С-45995 | г. Минск, ул. Октябрьская, 16 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | | **1 535 610 бел. руб. (BYN)** | | |
| **ЛОТ № 4:** | | | | |
| Ж 1/к Производственный корпус | Здание многофункциональное | 886,1 кв.м | 500/С-45996 | г. Минск, ул. Октябрьская, 16 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | | **1 352 570,40 бел. руб. (BYN)** | | |

**Сведения о земельном участке**:

**Кадастровый номер:** 500000000003004776. Адрес: г. Минск, ул. Октябрьская, 16. **Площадь (га): 1,7466. Категория:** Земли промышленности, транспорта, связи, энергетики, обороны и иного назначения. **Целевое назначение:** эксплуатация и обслуживание зданий многофункциональных по ул. Октябрьской, 16, зданий специализированных иного назначения по ул. Октябрьской, 16, 16/6, 16/7. **Вид права:** предоставлен продавцу на праве аренды по 31.03.2026. Земельный участок является неделимым и будет предоставлен покупателям в общую долевую аренду. **Обременения (ограничения):** Водоохранная зона рек и водоемов, площадь 1,7466 га; Охранная зона линий связи и радиофикации, площадь 0,0446 га; Охранная зона электрических сетей, площадь 0,0065 га; Охранная зона объектов газораспределительной системы, площадь 0,0204 га; Зона охраны недвижимых материальных историко-культурных ценностей, площадь 0,8318 га

**Условие аукциона:** дальнейшее использование объектов недвижимости являющихся предметом аукциона новым собственником должно производиться в соответствии с утвержденным проектом детальной планировки, разработанным в соответствии с генеральным планом г. Минска. При приобретении права собственности на материальную историко-культурную ценность новый собственник (владелец) этой историко-культурной ценности, обязан в течение одного месяца подписать охранное обязательство по форме установленной Министерством культуры Республики Беларусь. Невыполнение этого условия влечет за собой признание такой сделки недействительной

**Обременения:** объекты недвижимости обременены договорами аренды. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № **3012343260010**; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – **3012743260072**; в евро (EUR) – **3012343265060**; в российских рублях (RUB) – **3012743260098**; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **WWW.CPO.BY**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **28.12.2016 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **27.12.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |
| **Сайт организатора аукциона** | **WWW.CPO.BY** |



**Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Мингорисполкома объявляет о проведении публичных торгов в рамках исполнительных производств о взыскании задолженности**

**с Демчука Сергея Всеволодовича**

**ЛОТ №1. Земельный участок с кадастровым номером 623685505101000198, площадью 0,2500 га, расположенный по адресу: Минский район, д. Лапоровичи.**
**Стоимость – 167 196 белорусских рублей 12 копеек.**

**ЛОТ №2. Объект недвижимости (недвижимое улучшение: капитальное строение (жилой дом) с инвентарным номером 614/С-770 и земельный участок с кадастровым номером 624885003601000003, расположенный по адресу: Минская обл., Смолевичский район, Озерицко-Слободской с/с, д. Ляды, 37А.**
**Стоимость – 947 281 белорусских рублей 50 копеек.**

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.
Подробная информация об имуществе размещена на сайте:
**http://just-minsk.gov.by/,**
а также в помещении отдела принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Мингорисполкома: г. Минск, ул. Коллекторная, 3.

**Торги состоятся 21.12.2016 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Коллекторная, 3, каб. 14**

По вопросам проведения и участия в торгах следует обращаться к:
судебный исполнитель Русецкий Алексей Павлович,
т./ф. (017) 200-12-93, +375-44-529-25-11,
начальник отдела Шмарловская Ирина Владимировна,
т. 200-13-48 +375-44-529-25-01
**с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00**
**или по адресу: г. Минск, ул. Коллекторная, 3.**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900002445 в ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Минск, код 795, УНП 100223493 отдела принудительного исполнения УПИ ГУЮ Мингорисполкома не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

# ГОРАД НА СКРЫЖАВАННІ...



Такім будзе духоўна-гістарычны цэнтр на Замкавай гары.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Тут і пра гісторыю, і пра пляцоўкі, і пра ўсе віды інжынерных камунікацый, і пра парадак падаткаабкладання, і пра прэферэнцыі, — кажа **намеснік старшыні Крычаўскага райвыканкама Дзмітрый БАЧКОЎ**. — Мы вызначылі 9 прыярытэтных напрамкаў. У нас зручнае геаграфічнае становішча, мы знаходзімся ўсяго за 40 кіламетраў ад расійскай мяжы. Вядзём працу па крыніцах аднаўляльнай энергіі. Да паслуг інвестараў пляцоўка для вытворчасці цэменту мокрым спосабам. Ёсць умовы для разліву бутыляванай вады. У Чырвонай Будзе можна наладзіць выраб пладовага віна. Акрамя гэтага, мы развіваем турыстычны напрамак. І нам ёсць што паказаць акрамя палаца князя Пацёмкіна. Збіраемся стварыць у Крычаве духоўна-гістарычны цэнтр. У нас знаходзіцца Замкавая гара, дзе размешчаны помнік XIX стагоддзя — Свята-Мікалаеўская царква. На базе гэтага помніка і будзе функцыянаваць цэнтр. І тут мы працуем сумесна з БНТУ.

У Крычаве не толькі запрашаюць інвестараў, але і займаюцца падрыхтоўкай сваіх. З 30 верасня тут на базе Крычаўскага рынка дзейнічае Цэнтр па падтрымцы прадпрымальніцтва. Яго наўмысна размясцілі побач са службай занятасці.

— Нядаўна прыходзіла дзяўчына, цікавілася, што трэба, каб адкрыць сваю справу, — прыводзіць прыклад **спецыяліст Цэнтра Дзяніс ПЕРСІЯНЦАЎ.** — Мы падказалі варыянты, цяпер справа за ёй. Наогул, спектр нашых паслуг вялікі. Распрацоўваем бізнес-планы, займаемся аўдытам, прасоўваем праекты мясцовых ініцыятыў, прадстаўляем тэхнічную дапамогу ў сферы ІТ.

## На льготных умовах

Па дарозе на прадпрыемства па вытворчасці цэментава-стружачных пліт (ЦСП), якое было створана з уступленнем ў дзеянне Указа 235, любуемся домікамі, зробленымі з яго прадукцыі. «Гэта жыллё для трох шматдзетных сем'яў, якія стаяць на чарзе па паляпшэнні жыллёвых умоў, — каментуе **намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Крычаўскага райвыканкама Галіна КІРПІЧОВА**. — Плошча кожнага доміка — каля 100 квадратных метраў, так што будзе дзе разгарнуцца».

Праект з доляй аўстрыйскага капіталу рэалізуе ў Крычаве кампанія «Белзамежбуд» (БЗБ).

— На наш выбар паўплывала ўсё, у тым ліку і прэферэнцыі, — кажа **дырэктар сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю ЦСП «Белзамежбуд» Генадзь БАЧКОЎ.** — Вялікую ролю адыграла тое, што раён прамысловы і мяжуе з Расіяй. А гэта наш галоўны спажывец прадукцыі. На экспарт ідзе больш за 80%. Цяпер збіраемся насыціць беларускі рынак, паколькі мы адзіныя ў краіне ствараем гэты імпартазамяшчальны прадукт. У рабоце выкарыстоўваем выключна беларускія матэрыялы. У Крычаўскім раёне знаходзяцца асноўныя нашы сыравінныя запасы — цэмент, прычым якасны, плюс лес.

За месяц прадукцыйнасць працы на прадпрыемстве склала 2660 метраў кубічных, у перспектыве — павялічыць выпуск да 5 тысяч кубоў. Тут створана 126 працоўных месцаў, а пры выхадзе яго на поўную магутнасць будзе 240. І гэта ў планах праз год.

**Раман ХАМІДУЛІН** адзін з тых, каму пашчасціла тут працаўладкавацца.

— У мяне свабодны дыплом Беларуска-расійскага ўніверсітэта, — кажа Раман, які працуе тут аператарам фармуючай машыны. — Пасля заканчэння некалькі месяцаў спрабаваў рэалізаваць свае веды ў сельскай гаспадарцы, а потым восем месяцаў быў беспрацоўны. Калі знаёмыя падказалі, што тут ёсць работа, я доўга не раздумваў.

Непасрэдны начальнік Рамана **Юрый БУДЗЯНАЎ**, які кіруе цэхам па вытворчасці цэментава-стружкавых пліт, перайшоў сюды з цэментнага завода. Кажа, што прывабіла сучасная вытворчасць і добры заробак.

## Год вялікіх адкрыццяў

Хуткімі тэмпамі вядзецца ў Крычаве будаўніцтва сярэдняй школы №8, на базе якой будзе створаны сучасны шматфункцыянальны адукацыйны цэнтр на 1020 месцаў. На плошчах школы плануецца размясціць два цэнтры — карэкцыйна-развіваючы для дзяцей-інвалідаў і сацыяльна-педагагічны — філіялы мастацкай і музычнай школ. «Зараз вядзецца падводка камунікацый і ўнутранае аздабленне, — кажа **намеснік старшыні райвыканкама Жана ДЗМІТРЫЕВА**. — Наогул гэты год стаў для нас багатым на адкрыцці. Нядаўна ўвялі ў строй арэндны шматпавярховы дом. Перад Новым годам збіраемся здаць яшчэ адзін, пабудаваны з ільготным крэдытаваннем. Адкрылі ўрачэбную амбулаторыю ў раёне хлебазавода, зрабілі капітальны рамонт дзіцячага садка».

— З нашым горадам ганчарныя промыслы звязаны вельмі цесна. Я яшчэ застаў той час, калі на кірмашах мясцовыя жыхары выстаўлялі свае тавары з гліны, — кажа **дырэктар дзіцячай школы выяўленчых мастацтваў Крычава Міхаіл ГАРБУНОЎ**, які працуе тут з 1977 года — дня заснавання ўстановы, а з 1982-га яе ўзначальвае. — Вырабы куплялі для побытавых патрэб, а свістулькі — у якасці абярэгаў ад розных бед і няшчасцяў. Фестываль «Крычаўскі канёк» дапаможа нам вярнуцца да вытокаў. Ён дае магчымасць паглядзець на стыль працы майстроў з другіх раёнаў, параўнаць, павучыцца адзін у аднаго.

Кераміка — гэта толькі адзін з кірункаў, які вывучаюць крычаўскія дзеці. Юныя мастакі гэтай школы ўпрыгожылі сцены галерэі паміж новым лячэбна-дыягнастычным корпусам бальніцы і аддзяленнем тэрапіі. Настрой пацыентам падымаюць карціны з прыродай, птушкамі, кветкамі. У жыццесцвярджальныя фарбы яны размалявалі і прыпыначныя павільёны, каб не сумна было чакаць аўтобус. Выцінанка, роспіс па тканіне, саломапляценне — разнавіднасцей творчасці, з дапамогай якіх можна развіць свой густ і талент, у школе дастаткова. Да мастацтва тут далучаюцца 370 дзяцей, і колькасць жадаючых удасканаліць свае творчыя схільнасці толькі павялічваецца. У самім Крычаве працуе 4 філіяла гэтай школы і яшчэ 6 дзейнічае на вёсках. За 7 гадоў вучобы дзеці атрымліваюць вельмі добрую падрыхтоўку. Шмат хто з іх потым ідзе ў мастацкія вучылішчы і вышэйшыя ўстановы. Выпускнікі школы працуюць у Акадэміі мастацтваў, магілёўскім каледжы мастацтваў і нават у Маскве. Адна дзяўчына была мадэльерам у вядомага куцюр'е Вячаслава Зайцава.

### Даведка «Звязды»

**Крычаўскі раён займае плошчу 77 754 гектары, мяжуе з Клімавіцкім, Чэрыкаўскім, Мсціслаўскім раёнамі Магілёўскай вобласці і Шумяцкім раёнам Смаленскай вобласці. На яго тэрыторыі пражывае 33 924 чалавекі, непасрэдна ў горадзе — 26 609. Крычаўская зямля багата мелам, пяском, пясчана-гравійнымі сумесямі. Лясы займаюць болей чвэрці плошчы раёна. Маюцца біялагічны мікразаказнік, гідралагічны і паляўнічы заказнікі мясцовага значэння. Раён перасякаюць буйныя чыгуначныя шляхі Унеча-Орша, Магілёў-Рослаў і аўтамабільны — Масква-Брэст. Добраўпарадкаваная дарога злучае Крычаў з Мсціславам, Беліцай і Ходасамі. На тэрыторыі раёна размешчана 85 помнікаў гісторыі і культуры, сярод якіх сапраўдная жамчужына — палац XVIII стагоддзя князя Рыгора Пацёмкіна, фаварыта расійскай імператрыцы Кацярыны II.**

У пачатку лістапада ў Крычаве быў урачыста здадзены ў эксплуатацыю новы лячэбна-дыягнастычны корпус бальніцы. У сценах трохпавярховага будынка размясціліся прыёмнае аддзяленне, лабараторыя, дыягнастычныя кабінеты, рэанімацыя, аперацыйны блок і палаты для хворых. У падарунак ад губернатара бальніца атрымала фібрагастраскоп для эндаскапічных абследаванняў страўніка, райвыканкам перадаў відэалапараскапічную стойку, а Міністэрства аховы здароўя прэзентавала рэнтгеналагічны апарат на тры працоўныя месцы.

«Створаны ўсе ўмовы для аказання высакаякаснай медыцынскай дапамогі пацыентам — сучасныя аперацыйныя залы сабраны ў адным блоку. Прасторныя аддзяленні рэанімацыі і анестэзіялогіі дазваляюць зручна размясціць пацыентаў і забяспечваюць камфортныя ўмовы працы для супрацоўнікаў», — кажа **намеснік галоўнага ўрача Крычаўскай райбальніцы Алена ТУПІЦЫНА.**

## «Крычаўскі канёк»

Менавіта пад такой назвай ужо другі год запар горад збірае на пленэр майстроў па кераміцы з усходняга рэгіёна Беларусі і Расіі. Крычаў заўсёды славіўся сваімі традыцыямі ў гэтай галіне мастацтва. Свістулькі ў выглядзе конікаў вядомы далёка за межамі раёна. А верабей на кані наогул эксклюзіў і нешта накшталт тутэйшага брэнда.



Галерэя бальніцы ў афармленні юных талентаў са школы выяўленчых мастацтваў.

## Адчуйце сябе князем Пацёмкіным

Князь Рыгор Пацёмкін узвёў палац, які да нашых дзён ўпрыгожвае горад. Гэта самы яскравы прыклад таго, што можа зрабіць інвестар. Унікальны будынак плошчай 1120 квадратных метраў пабудаваны ў стылі рускага класіцызму па праекце архітэктара Таўрычаскага палаца ў Санкт-Пецярбургу Івана Старова. Калі глядзець на яго з вышыні птушынага палёту, можна ўбачыць, што абрысы маюць форму літары «Е» — так фаварыт аддзячыў вялікай гасударыні за яе падарунак. Кацярына II наведала палац 19 студзеня 1787 года падчас паездкі па новых губернях. Тут яна абедала і начавала. Сёння кожны мае магчымасць прайсціся па тых залах, дзе гуляла імператрыца са сваімі фрэйлінамі. Супрацоўнікі ўнікальнага помніка архітэктуры адраджаюць традыцыю Пацёмкінскіх часоў ладзіць балі. «Гэта можа стаць разыначкай нашага горада, — спадзяецца **дырэктар установы Уладзімір МІШЧАНКА.** — Шмат было станоўчых водгукаў, калі мы правялі першы баль. А яшчэ мы аказваем эксклюзіўную паслугу для маладажонаў. У нашым палацы знаходзіцца загс, і жаніх з нявестай могуць замацаваць свой шлюб у прысутнасці князя Пацёмкіна і нават самой Кацярыны.

Бліжэйшыя мерапрыемствы, на якія тут запрашаюць усіх ахвотных, — Пацёмкінская ёлка і Пацёмкінскія забавы. Летась паўдзельнічаць у навагодніх святах прыязджалі магіляўчане, а зараз ёсць заяўкі са Смаленска і нават Масквы. Сёлета Пацёмкінскія ёлкі пачнуцца ўжо з 10 снежня, а забавы — з 24. Гасцей чакае сустрэча з гістарычнымі асобамі, прагулкі па палацаваму парку, катанні на конях і нават дэгустацыя дранікаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## ■ Зачапіла




### Д. КАСКО «Потым яны гатовыя купіць хоць дзесяць аўтакрэслаў. Але позна...»

*(«Звязда» за 22 лістапада)*

— Мяне вельмі ўсхваляваў артыкул аб правільнай перавозцы дзяцей у машыне. Я заўсёды думала, што не можа быць нічога больш надзейнага, чым рукі родных, якія моцна прыціскаюць да сябе любімае дзіця. Ды і само малое так значна спакайней сядзіць. Раней ніхто нават не задумваўся, што можа быць па-іншаму! А цяпер мільён самых розных прыстасаванняў, каб зрабіць паездку як мага больш бяспечнай. І гэта правільна: дарога — справа вельмі сур'ёзная, а ўсе забавы трэба пакінуць на потым. Дзіцяці трэба тлумачыць, што адшпільвацца або вылазіць з крэсла амаль гэтак жа небяспечна, як гуляць з запалкамі. Я нават адразу пасля прачытання артыкула патэлефанавала сыну, каб тэрмінова бег у магазін за крэслам. У мяне ўнук, 4 годзікі, пры сустрэчы абавязкова простай мовай раскажу яму аб правілах. Гэта той выпадак, калі жыццё нашых родных і блізкіх — у нашых руках.

**Антаніна Леанідаўна**, *г. Валожын.*

### І. АСТАШКЕВІЧ. «Есть ли психологи в своем отечестве?»

*(«Союз—Евразия» за 22 лістапада)*

— Я заўсёды лічыў, што мінулае трэба ведаць і памятаць, бо без яго няма будучыні. Вядома, сёння многія жадаюць знайсці і знаходзяць сувязь новага прэзідэнта ЗША (ці хоць бы яго зяця) з Беларуссю. Але не менш важна ведаць, што на той жа зямлі, дзе ты цяпер жывеш, нарадзіліся людзі, якія змаглі зрабіць штосьці значнае ў маштабах усёй краіны і нават усяго свету.

Шматлікія маленькія гарады ва ўсім свеце ўславілі вялікія выхадцы з іх. Нямецкі філосаф Імануіл Кант — Кёнігсберг, дзе правёў усё сваё жыццё. Іспанскі архітэктар Антоніа Гаўдзі — не толькі Барселону, дзе знаходзяцца амаль усе яго тварэнні, але і невялікі Рэўс, дзе нарадзіўся. Вялікі рускі навуковец Дзмітрый Мендзялееў — Табольск, дзе прайшлі яго дзяцінства і юнацтва. Гэтыя гарады шырока вядомыя менавіта дзякуючы знакамітасцям. Дарэчы, на тэрыторыі Беларусі нарадзіўся не толькі Марк Шагал, якога праславіла Францыя, але і авіяканструктар Павел Сухой, дыпламат Андрэй Грамыка, палітык Анатоль Чубайс, амерыканскі пісьменнік Айзек Азімаў і многія іншыя.

Напэўна, папулярызаваць такія імёны (у тым ліку і вялікага псіхолага Льва Выгоцкага) у адпаведнасці з месцам іх нараджэння ці пражывання трэба не толькі для ўзняцця самаацэнкі, нацыянальнай самасвядомасці тых, хто жыве цяпер. Вялікія людзі ўяўляюць сабой і прадмет для гонару, і прыклад для пераймання. Акрамя таго, гэта нагода для прыцягнення ў населены пункт турыстаў, якія цікавяцца той ці іншай тэматыкай.

**Ігар ШЧАГЛОЎ.**

### Н. ЗІГУЛЯ. «Сем разоў адмерай»

*(«Звязда» за 23 лістапада)*

— Тэма захавання аўры парка ў Падміколлі вельмі актуальная і своечасовая. Галоўнае — не нарабіць цяпер чагосьці такога, за што нам будзе сорамна перад нашчадкамі. Падміколле — адно са старажытных месцаў Магілёва, дзе ёсць добрая магчымасць падчас экскурсій расказваць пра нашы сапраўдныя карані. Сёння нам вядомы месцы знаходжання падмуркаў Свята-Пакроўскай царквы, касцёла Святога Антонія, сінагогі. Яны — як сведчанне той талерантнасці, якая існавала паміж канфесіямі. Мы можам аднавіць атмасферу мінулых часоў без усялякіх там інавацыйных праектаў і гандлёва-забаўляльных цэнтраў. Неабходна пакінуць гэты кавалачак сапраўднай гісторыі Магілёва ў яго аўтэнтычным выглядзе. Мы радуемся, што гісторыя захавала для нас унікальны ансамбль Свята-Мікольскага манастыра. І будзе цудоўна, калі будучы парк стане сімвалам адраджэння Магілёва, якім ён быў у найлепшыя гады свайго росквіту.

**Святлана СТРОГІНА,**
**намеснік дырэктара Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя П. Масленікава.**

### Н. ЮШКЕВІЧ, В. КАНЮТА. «За аб'ектыўную гістарычную памяць» *(«Звязда» за 24 лістапада)*

— А між іншым у суседзяў-расіян замах на гістарычную памяць караецца па законе. Адмаўленне фактаў, вызначаных прысудам Міжнароднага ваеннага трыбунала, ухваленне злачынстваў, распаўсюджванне лжывых звестак аб Другой сусветнай вайне, а таксама абраза сімвалаў воінскай славы пагражае крымінальнай адказнасцю.

Перамога Савецкага Саюза над фашызмам — беспрэцэдэнтная і вялікая падзея. Вынікі Другой сусветнай вайны фактычна прадвызначылі цэнтры сілы ў свеце. Перагледзець іх — азначае аддаць лідарства іншым краінам. Савецкі народ заплаціў вельмі высокую цану, каб сёння расіяне і беларусы, нашчадкі салдат Перамогі, адмовіліся ад сваёй гісторыі. Такога ніколі не будзе!

**Іван Пятровіч**, *г. Магілёў*

# РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ООО «СЕОгруппсервис» на праве собственности

| № лота | Описание | Начальная цена продажи без учета НДС, доллары США | Задаток, бел. руб./ доллары США | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | 1. Наименование: Арочное сооружение с инвентарным номером 600/С-95015. Назначение: Арочное сооружение. Общая площадь — 176,7 кв.м. Площадь застройки – 186 кв.м. 1986 г.п. Количество этажей – 1 шт.<br>**Адрес:** Минская обл., Минский р-н, севернее п. Михановичи.<br>2. Наименование: Асфальтовое покрытие с инвентарным номером 600/С-104738. Назначение: Сооружение неустановленного назначения. Дата ввода в эксплуатацию – 1986. Составные части и принадлежности: Сооружение, состоящее из асфальтового покрытия с бетонными бортами В (площадь 1490.3 кв.м.), асфальтового покрытия Г (площадь 521.6 кв.м.) **Адрес:** Минская обл., Минский р-н, севернее п. Михановичи.<br>3. Наименование: Ограждения с инвентарным № 600/С-104739 1986 г.п. Назначение: Сооружение неустановленного назначения. Составные части и принадлежности: Железобетонное ограждение — А. Протяженность — 460,6 м.<br>**Адрес:** Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, севернее аг. Михановичи, воинская часть 52188.<br>4. Наименование: Резервуары для хранения светлых нефтепродуктов (инв.№22,23,24,25) с инвентарным № 600/С-104740. Назначение: Сооружение специализированное для органов государственного управления, обороны, государственной безопасности, внутренних дел. Составные части и принадлежности: Сооружение, состоящее из резервуара РВС-400 ( инв.№23) литера Р, РВСК-400 ( инв.№24) литера С, РВС-400 ( инв.№25) литера Т, РВСК-400 ( инв.№22) литера У. **Адрес:** Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, севернее п. Михановичи, У-2.<br>**Примечания:** Общий объем 1600 м куб. | 380 000 | 50 000,00/ 25 000 | 5 |

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

Земельный участок площадью 7,0484 га с кадастровым номером 623684200001000269. Целевое назначение: Земельный участок для обслуживания зданий и сооружений военного городка №109 "Михановичи". Право аренды. Срок действия по 13.04.2044. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) — Претендент на покупку, должен подписать с Доверителем договор купли-продажи в течение 10 (десяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания договора купли-продажи.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 1,5 % (Одного целого пяти десятых процента) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Валюта торгов – доллар США.
Валюта платежа – белорусский рубль по курсу Национального банка Республики Беларусь на день осуществления платежа (для резидентов Республики Беларусь).
Валюта платежа – доллар США (для нерезидентов Республики Беларусь).
Платежи и расчеты с резидентами и нерезидентами Республики Беларусь во исполнение договора осуществляются в соответствии с законодательством Республики Беларусь, регулирующим расчеты при проведении валютных операций.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь и настоящим договором для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 28.12.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток для резидентов Республики Беларусь перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369.
Задаток для нерезидентов Республики Беларусь перечисляется в долларах США на р/с 3012232135083 в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29; МФО 153001739, счет 0105140412 в VTB Bank (Deutschland) AG, г. Франкфурт-на-Майне, SWIFT код OWHBDEFF.
Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ООО «СЕОгруппсервис», проводимом 28 декабря 2016 г.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений 26.12.2016 в 12.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта: Крук Дмитрий Михайлович: (029) 338-56-24.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**Организатор аукциона ● адрес: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 3 этаж.**
**● +375 17 306-00-57 ● +375 29 550-09-52 ● + 375 29 356-90-03 ● www.ino.by ● e-mail: torgi@ino.by**

**РУП «Белпочта» объявляет о проведении переговоров по выбору подрядной организации для выполнения ремонтно-строительных работ на объекте «Текущий ремонт (замена заполнений оконных и дверных проемов) в здании общежития РУП «Белпочта» по ул. Надеждинская, 23 в г. Минске».**

Процедура переговоров состоится **«30» ноября 2016 года в 10.00** по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10. Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел. 293-55-29.

УНП 101015738

Извещение о проведении 27 декабря 2016 года аукционных торгов по продаже имущества, проводимых в электронной форме на электронной торговой площадке «МИНСК-НЕДВИЖИМОСТЬ»

| | |
|---|---|
| Номер электронного извещения | 1480001128404 |
| Предмет электронных торгов (сведения о продаваемом имуществе) | Не завершенный строительством незаконсервированный объект «Автозаправочная станция с комплексом дорожного сервиса на территории Минского района»; проектируемая площадь 18 720 кв. м. (наименование объекта в соответствии с инвестиционным договором от 01.03.2010 № ИД-40 – «Автозаправочная станция с комплексом дорожного сервиса на землях д. Валерьяново Боровлянского сельсовета») |
| Местонахождение продаваемого имущества | Минская область, Минский район, Боровлянский с/с, д. Валерьяново |
| Сведения о земельных участках | кадастровый номер - 623680601601000838, площадь - 0,8740 га; кадастровый номер - 623680600001000450, площадь - 0,2358 га; кадастровый номер - 623680601601000836, площадь - 0,2893 га; кадастровый номер - 623680601601000837, площадь - 3,9305 га |
| Продавец (собственник), организатор электронных торгов | Унитарное предприятие «Октан-АЗС-Сервис», 220089, г. Минск, ул. Железнодорожная, д. 35 |
| Оператор ЭТП «МИНСК-НЕДВИЖИМОСТЬ» | Государственное предприятие «МГЦН», ул.К.Маркса, 39, к.10, 220030, г.Минск |
| Начальная цена предмета электронных торгов (с учетом НДС) | 8 334 257,40 бел. руб. (83 342 574 000 бел. руб. образца 2000 года) |
| Шаг торгов | 5 процентов от начальной цены предмета электронных торгов |
| Сумма задатка | 196 470,00 бел. руб. (1 964 700 000 бел. руб. образца 2000 года) |

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом информационной торговой системы ЭТП «МИНСК-НЕДВИЖИМОСТЬ» (далее – Регламент).
Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на сайте ЭТП по электронному адресу minskestate.by, пройти аккредитацию на ЭТП, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.
**Задаток** перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г.Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 не позднее срока окончания приема документов на участие в электронных торгах.
**Дата и время начала проведения электронных торгов:** 27 декабря 2016 года в 11.00 (по времени на сервере ЭТП «МИНСК-НЕДВИЖИМОСТЬ»).
**Победителем электронных торгов** признается участник электронных торгов, предложивший наибольшую цену за предмет электронных торгов.
В случае, если электронные торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником электронных торгов либо электронную регистрацию прошел только один участник, предмет электронных торгов продается этому участнику (претенденту на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется победителем электронных торгов (претендентом на покупку) в течение трех рабочих дней со дня проведения электронных торгов.
**Договор купли-продажи** между продавцом и победителем электронных торгов (претендентом на покупку) заключается после предъявления продавцу копий платежных документов о перечислении суммы затрат на организацию и проведение электронных торгов и подписывается не позднее 10 рабочих дней со дня проведения электронных торгов.
**Оплата стоимости** приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (претендентом на покупку) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
**Прием заявлений** на участие в электронных торгах с прилагаемыми документами осуществляется по 26.12.2016 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб.6.
Дата и время окончания срока подачи заявок: 26.12.2016 в 15.00.
Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «МИНСК-НЕДВИЖИМОСТЬ».
По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефонам: (017)385-96-75, (029)615-11-11.
Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017)385-96-75, (029)615-11-11 (Унитарное предприятие «Октан-АЗС-Сервис»).

**Извещение о проведении открытых аукционов по продаже земельных участков в частную собственность**
**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.(0212) 42-61-62.

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем.участка. Размер начальной цены и задатка (с учетом/до деноминации). |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221285916601000096, площадью 0,1462 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Шилы, ул. Приозерная, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Сосно), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000В. **Нач. цена:** 1 568,74/ 15 687 400 бел.руб. **Задаток:** 156,87/1 568 700 бел.руб. |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №221285905601000077, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Койтово, ул. Центральная, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина). **Нач. цена:** 1 031,89/10 318 900 бел.руб. **Задаток:** 103,18/1 031 800 бел.руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 27.12.2016 в 16.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 28.11.2016 с 8.30 по 26.12.2016 до 17.30 по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314090173 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Мазоловский сельисполком). Условия аукциона: получить в отделе архитектуры и строительства Витебского райисполкома техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию данного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления в течение 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство капитального строения (здания, сооружения). |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем.участка. Размер начальной цены и задатка (с учетом/до деноминации). |
|---|
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 222180217101000021, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, Бегомльский с/с, д. Студёнка, ул. Криничная, 8А для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов, охранная зона электрических сетей. **Нач. цена:** 3 000/30 000 000 бел.руб. **Задаток:** 300/3 000 000 бел.руб. |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым № 222180202601000069, площадью 0,1895 га по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, Бегомльский с/с, д. Будачи, ул. Озёрная, участок 5 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов. **Нач. цена:** 3 000/30 000 000 бел.руб. **Задаток:** 300/3 000 000 бел.руб. |
| Лот №3. Земельный участок с кадастровым № 222180202601000070, площадью 0,0896 га по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, Бегомльский с/с, д. Будачи, ул. Солнечная, участок 3 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов, охранная зона электрических сетей. **Нач. цена:** 3 000/30 000 000 бел.руб. **Задаток:** 300/3 000 000 бел.руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона**: 28.12.2016 в 12.00 по адресу: г. Докшицы, ул. Ленинская, 31 в Докшицком райисполкоме. **Срок внесения задатков и приема документов**: с 28.11.2016 с 8.30 по 27.12.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в рабочие дни с 8.30 до 17.30. в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Реквизиты для внесения задатка:** 3600317016604 ОАО «АСБ «Беларусбанк», МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901. Получатель платежа: ГУ МФ по Витебской области (Бегомльский сельисполком). Условия аукциона: осуществить гос.регистрацию права частной собственности на зем.участок в течение 2 месяцев со дня получения решения и протокола о результатах аукциона; получить техническую документацию на жилой дом и разрешение на его строительство в срок, не превышающий 1 года; в течение 1 года со дня получения свидетельства о гос.регистрации, создания зем.участка и возникновения права на него приступить к занятию участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство). |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем.участка. Размер начальной цены и задатка (с учетом/до деноминации). |
|---|
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 221880417801000023, площадью 0,2387 га по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Стодолищенский с/с, д. Село, ул. Церковная, 3 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (озеро Тиосто), охранная зона электрических сетей до и свыше 1000 В. **Нач. цена:** 1 000/10 000 000 бел.руб. **Задаток:** 100/1 000 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600316117025 ОАО АСБ «Беларусбанк», код банка 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа – ГУ МФ РБ по Витебской области (Стодолищенский сельсовет). |
| Лот № 2. Земельный участок с кадастровым № 221880417801000024, площадью 0,2421 га по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Стодолищенский с/с, д. Село, ул. Церковная, 5 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (озеро Тиосто), охранная зона электрических сетей до и свыше 1000 В. **Нач. цена:** 1 000/10 000 000 бел.руб. **Задаток:** 100/1 000 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600316117025 ОАО АСБ «Беларусбанк», код банка 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа – ГУ МФ РБ по Витебской области (Стодолищенский сельсовет). |
| Лот № 3. Земельный участок с кадастровым № 221882207301000113, площадью 0,1499 га по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Вайханский с/с, д. Мариамполь, пер.Полевой, 58А для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (озеро Лосвидо). **Нач. цена:** 2 000/20 000 000 бел.руб. **Задаток:** 200/2 000 000 бел.руб. **Реквизиты для внесения задатка**: 3600316027001 ОАО АСБ «Беларусбанк», код банка 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа – ГУ МФ РБ по Витебской области (Вайханский сельсовет). |
| Лот № 4. Земельный участок с кадастровым № 221882207301000112, площадью 0,1499 га по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Вайханский с/с, д. Мариамполь, ул. Озёрная, 1 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (озеро Лосвидо), охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 В. **Нач. цена:** 2 000/20 000 000 бел.руб. **Задаток:** 200/2 000 000 бел.руб. **Реквизиты для внесения задатка**: 3600316027001 ОАО АСБ «Беларусбанк», код банка 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа – ГУ МФ РБ по Витебской области (Вайханский сельсовет). |
| Лот №5. Земельный участок с кадастровым № 221887001601000123, площадью 0,1236 га по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Пальминский с/с, д. Ботали, пер. Девятый, участок 6 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (озеро Лосвидо). **Нач. цена:** 2 000/20 000 000 бел.руб. **Задаток:** 200/2 000 000 бел.руб. **Реквизиты для внесения задатка:** 3600316087009 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа – ГУ МФ РБ по Витебской области (Пальминский сельсовет). |
| **Дата, время и место проведения аукциона**: 27.12.2016 в 11.00 по адресу: г. Городок, ул. Пролетарская, 2 в Городокском райисполкоме. **Срок внесения задатков и приема документов**: с 28.11.2016 с 8.30 по 26.12.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Условия аукциона: разработать на основании утвержденного акта выбора места размещения зем.участка с соблюдением требований градостроительного паспорта проектную документацию на строительство жилого дома и согласовать ее с главным архитектором района, получить разрешение на строительство; занять зем.участок в течение года со дня получения свидетельства (удостоверения) о гос. регистрации в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство, иное освоение зем.участка). |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем.участка. Размер начальной цены и задатка (с учетом/до деноминации). |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым № 225880700201000112, площадью 0,2196 га по адресу: Витебская обл., Шумилинский р-н, Добейский с/с, аг. Амбросовичи, пер.Озерный, 4 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона водного объекта (озеро Будовесть). **Нач. цена**: 724,24/7 242 400 бел. руб. **Задаток:** 72,42/724 200 бел.руб. Реквизиты для внесения задатка: р/с 3600331015001 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Добейский сельисполком). |
| **Дата, время и место проведения аукциона**: 29.12.2016 в 10.00 по адресу: Витебская обл., г. п. Шумилино, ул. Короткина, 10, каб.226 в Шумилинском райисполкоме. **Срок внесения задатков и приема документов**: с 28.11.2016 с 8.30 по 28.12.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. Условия аукциона: получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство жилого дома в срок, не превышающий одного года; приступить к занятию зем.участка не позднее 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство капитального строения (здания, сооружения). |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон. Представляются: гражданином - копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина - нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками - оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) - документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем.участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос.регистрацией права на зем.участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона; снять из-под габаритов зданий (пятен застройки) на занимаемом зем.участке плодородный слой почвы, сохранить и использовать его в соответствии с ПСД; осуществить (завершить) строительство в сроки, определенные ПСД. Инженерные коммуникации и сооружения на зем.участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем.участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 - зем.участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос.регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона - участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем.участка. Конт.тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

# Сорочинский сельский исполнительный комитет извещает о продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь

| Дата, время и место проведения аукциона | 27 декабря 2016 года в 10.00 в здании Сорочинского сельисполкома д. Сорочино | |
|---|---|---|
| Место, дата и время начало и окончания приема заявлений, прилагаемых документов | Заявления принимаются с 28 ноября 2016 года до 23 декабря включительно с 8.00 до 17.00 в рабочие дни в здании Сорочинского сельского исполнительного комитета по адресу: Витебская область, Ушачский район, д.Сорочино. Граждане представляют паспорт гражданина РБ, его ксерокопию и квитанцию об уплате задатка.<br>Телефоны: 5-27-92, 5-39-31. (8-029) 183-08-66, (8033) 3242526 | |
| Наименование объекта | Земельный участок | |
| Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | |
| Место расположения | Витебская область, Ушачский район, д. Лутово | Витебская область, Ушачский район, д. Белое |
| Характеристика земельного участка | Расположен на берегу озера Лутово. Граница земельного участка примыкает к озеру. | Расположен на берегу озера Троща. Граница земельного участка примыкает к озеру. |
| Кадастровый номер | 224986014101000030 | 224986000901000071 |
| Площадь земельного участка ( га) | 0,2500 | 0,2500 |
| Порядок осмотра на местности земельного участка, выставляемого на аукцион | Осмотр земельного участка будет производиться по обращению граждан в комиссию по проведению аукционов | |
| Начальная цена, руб. | 2 000 | |
| Размер задатка, руб. | 200 рублей, уплачивается при подаче заявления на регистрацию участника аукциона. Получатель: Сорочинский сельский исполнительный комитет, р/с 3641328061451, филиал 216 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 648, г. Полоцк, УНП 300007045, код платежа 04901 | |
| Условия продажи объекта | Внесение победителем аукциона платы за земельный участок, возмещение расходов, связанных с изготовлением документации и его проведением, — 1680,88 рублей + затраты за опубликование объявления | Внесение победителем аукциона платы за земельный участок, возмещение расходов, связанных с изготовлением документации и его проведением, — 1835,20 рублей + затраты за опубликование объявления |

## Марыя ЗАХАРЭВІЧ:

# «У мяне былі ролі, якімі можна ганарыцца»

**Гэтымі днямі святкавала 80-гадовы юбілей народная артыстка Беларусі Марыя ЗАХАРЭВІЧ — адна з самых яркіх зорак нацыянальнай сцэны. З гэтай нагоды ў серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» выдавецтва «Мастацкая літаратура» пабачыла свет кніга «Марыя Захарэвіч. Талент, адухоўлены любоўю». Тут змешчаны ўспаміны землякоў, калег, сяброў Марыі Георгіеўны, інтэрв'ю з любімай актрысай, а таксама вершы, прысвечаныя ёй. Мы ўбачыліся з Марыяй Захарэвіч, каб пагутарыць пра сустрэчы з класікамі, важныя жыццёвыя падзеі і згадаць некаторыя эпізоды дзяцінства.**



### СПАТКАННІ, ШТО ПОМНЯЦЦА

***— Марыя Георгіеўна, кожны неабыякавы да нашай нацыянальнай культуры чалавек добра ведае старонкі вашай жыццёвай і творчай біяграфіі. Але ў вашым жыцці ўсё ж такі быў цікавы эпізод, пра які мы амаль нічога не ведаем. Гэта пасяджэнне арганізацыйнага камітэта Савецкага фонду культуры, якое адбылося ў Маскве. Што важна, ад Беларусі былі запрошаны толькі вы і Васіль Быкаў. У спісе членаў аргкамітэта — шмат гучных імёнаў. Што вам запомнілася з той паездкі ў Маскву?***

— Ведаеце, спіс удзельнікаў, канешне, унікальны. І, вяртаючыся ў тыя гады, я ўспамінаю, пра што мы гаварылі, што хвалявала ўсіх, якія пытанні ўзнімаліся. Напрыклад, пытанні тэатра, кіно. Вядома, паловы ці больш з гэтых людзей ужо няма. Але я нават забылася, што была ў гэтым аргкамітэце. Аднойчы знайшла гэты спіс і падумала: «Божа мой, і сапраўды, у кампаніі якіх вялікіх людзей я была!» Такія асобы — і Расул Гамзатаў, і Валянцін Распуцін, і Мустай Карым... Мая Плісецкая, Людміла Зыкіна, Раіса Гарбачова... Мне даваліся нават выступаць. Праўда, не на пасяджэнні аргкамітэта, а на многіх іншых. А трапіла я ў спіс таму, што мы даволі часта былі ў Маскве, удзельнічалі ў вялікіх канцэртах — нашых, беларускіх. Уявіце: тэатральнай актрысе выступаць на сцэне Вялікага тэатра СССР, прычым двойчы. Гэта было ў час святкавання 100-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа. У мяне захаваліся ўсе гэтыя праграмы, я гляджу і ўспамінаю: што чытала на стагоддзе Коласа? Аказваецца, верш Кастуся Кірэенкі «Беларусь — Расія». Таксама выступала я ў Калоннай зале Дома саюзаў, у Крамлёўскім Палацы з'ездаў, у Доме літаратара на юбілейным вечары Івана Шамякіна, на іншых вечарах, у Зорным гарадку. Удзельнічала ў вялікіх гала-канцэртах у Маскве. І чытала там заўсёды «Край паэтаў» Пімена Панчанкі. Гэты верш так спадабаўся Валянціне Церашковай, што, калі яна прыехала ў Мінск, папрасіла мяне прачытаць яго. А калі было 80-годдзе Ніны Сняжковай (былы намеснік старшыні Савета Міністраў БССР. — **Д.П.**), гераіня свята таксама папрасіла мяне прачытаць менавіта гэты верш. Яна вельмі любіла беларускую паэзію. І, канешне, тое, што я ўдзельнічала ва ўсіх урадавых канцэртах, пачынаючы з інстытута, напэўна, і прынесла мне вядомасць.

***— Шмат паэтаў і празаікаў прысвяцілі вам вершы, нарысы. Сустрэча з якім творцам найбольш запомнілася?***

— На жаль, не вельмі часта мы сустракаліся для таго, каб проста пагутарыць. Магу сказаць толькі пра Уладзіміра Караткевіча. Мы з ім сапраўды пасябравалі, ён заўсёды да мяне вялікі клопат праяўляў: і дадому прыходзіў, і ў вёску прыязджаў, — гэта для мяне была вялікая маральная падтрымка. Асабліва ў той час, калі я трапіла ў аварыю і ляжала ў бальніцы. З Максімам Танкам, хоць мы і землякі, спачатку толькі віталіся. Парай слоў перакінемся — і ўсё. Але пазней, помню, была «Паэтычная пятніца» ў Доме літаратара па яго кнізе «Дарога, закалыханая жытам». Мы сур'ёзна да яе рыхтаваліся. Максім Танк быў вельмі задаволены. Пасля паэт запрасіў мяне на свой юбілейны творчы вечар, які праходзіў у нас на радзіме. Мы разам ехалі. Ён шмат расказваў. Завіталі ў яго родную вёску. Максім Танк расказваў пра дрэвы, якія сам пасадзіў, пра калодзеж, пра сваю хату. У ёй мы таксама пабывалі. Шмат жартавалі. А пасля таго вечара ў Мядзеле мы да яго зноў заехалі дадому. Ноччу. Была жывая яшчэ жонка Максіма Танка. Прывезлі столькі падарункаў — ён быў вельмі задаволены. Пазней, незадоўга да смерці Максіма Танка, мы з Нінай Загорскай прыйшлі да яго. Купілі не кветкі — усялякай зеляніны на кірмашы. У паэта якраз быў урач. Мы дачакаліся, пакуль доктар пойдзе. Максім Танк выйшаў да нас, вельмі дзякаваў. Пасля расказваў пра жонку, пра тыя вершы, якія прысвяціў ёй. Чытаў іх. Такой была мая апошняя сустрэча з Максімам Танкам...

***— Марыя Георгіеўна, каго яшчэ з беларускіх класікаў можаце прыгадаць, з кім вы вось так, неафіцыйна, сустракаліся?***

— Канешне, Івана Шамякіна. Я многа яго чытала. Вы ведаеце, нікога не абдзяліла з беларускіх паэтаў. Ніколі. На радыё з маім удзелам былі нават не дзясяткі, а сотні перадач. Усё тое, пра што вам расказвала, — я маю на ўвазе канцэрты — ніхто іх не здымаў, не фатаграфаваў. А радыё... Напісанае, як кажуць, застаецца. І тое, што цяпер у залатым фондзе радыё, таксама. Слухаеш і здзіўляешся: як хапала сіл столькі паспяваць?

### ВЫТОКІ АСОБЫ — У СЯМ'І

***— У нас ёсць дрэвы-сімвалы— «елка ў пары з хваінаю», «явар і каліна», апетыя класікамі. Дзве бярозы каля роднай хаты ў вёсцы Навасёлкі для вас гэта...***

— ...той помнік, што пакінуў мой бацька. Ён пасадзіў дзве бярозы, паклікаў маму і сказаў: «Гэта будзе помнікам нам з табой». Пасадзіў іх у адзін корань. Зараз бярозы вельмі магутныя. І, канешне, я іх даглядаю. Дарагі татаў падарунак застаўся.

***— Марыя Георгіеўна, раскажыце, калі ласка, пра вашых бацькоў. Што прыемнае засталося для вас цяпер, калі прыязджаеце да роднай хаты?***

— Я была адна ў бацькоў. Адна дачушка. Прычым нарадзілася ў даволі сталыя іх гады. Разумею, што значыла для таты з мамай. Але я не была пястушкай. Я так спачувала ім! Спачувала тату, які шмат працаваў. Тату звалі Георгій Мікалаевіч. А ў жыцці — Юрка. Памятаю, як тата збіраўся на касьбу, браў з сабой кавалак жаўтаватага сала. Калі вяртаўся, кашулю яго, белую ад солі, можна было паставіць. Я выпадкова захавала дзённікі, якія вёў тата. Цяпер у гэтым сшытку і мае дзённікі. Уявіце, якая цяжкая праца была ў калгаснікаў. Я не ведаю, як яны вытрымлівалі. Напрыклад, такі запіс у дзённіку: «Кожны дзень вазіў гной, 8—10 вазоў». А што такое накласці воз гною? Былі і іншыя віды цяжкай працы. Нават калі тата ўжо захварэў, усё роўна брыгадзір загадваў працаваць. І хату тата пабудаваў сваімі рукамі. Я сказала, што яна ніколі не будзе прадавацца, ніколі. Але, канешне, самую складаную работу выконвалі талакой. Як раней было. Таму гэта бясцэнны дар, які застаўся ад маіх бацькоў. Яшчэ, напрыклад, мая дзіцячая фатаграфія. Мама казала, што яна чатыры дні капала торф, каб зарабіць грошы і сфатаграфаваць мяне, — усё гэта дорага каштуе. У мяне яшчэ захавалася з польскіх часоў маміна хустка. У цудоўным стане. Маму звалі Ганна Іванаўна. А па-вясковаму — Ганэта. Яна была ткачыхай. У мяне ручнікі, сатканыя мамай, захаваліся. І многае іншае. Маму нават запрашалі ў розныя вёскі, каб яна паказвала сваё майстэрства. Яна і пявуння была.

***— І вы, Марыя Георгіеўна, таксама прыгожа спяваеце.***

— І я таксама пявуння была... *(усміхаецца).*

***— Аднойчы ў інтэрв'ю вы сказалі пра свайго тату «глыбінны». Што мелі на ўвазе?***

— Глыбінны? Разумееце, я пагляджу на яго партрэт, якіх у мяне толькі два — маленькія фотаздымкі, і думаю, што ён нечым вельмі падобны на Васіля Быкава. Тата звычайна больш слухаў, быў маўчуном. Помню, як у яго дапытвалася (я ж хацела, каб усё было добра дома): «Тата, ці хопіць ужо на карову, ці дастаткова накасіў? Ці многа яшчэ трэба?» Яму было вельмі прыемна — я ж бачыла. Ён і задачкі рашаў (з матэматыкай дрэнна ў мяне было), маляваў мне, таму што не атрымлівалася. Тата вельмі любіў мяне.

### І НА СЦЭНЕ, І НА КІНАЭКРАНЕ

***— Вы ўвасобілі шмат вобразаў. Але галоўны сярод іх — вобраз Маці.***

— Безумоўна. Мяне часта запрашалі і ў кіно. Асабліва ў ваенныя фільмы, дзе я здымалася з дзецьмі. Акрамя таго, выступала на стадыёнах падчас рэспубліканскіх свят — таксама ў вобразе Маці.

***— Дазвольце нагадаць некаторыя з фільмаў, дзе вы здымаліся: «Зімародак», «Сыны ідуць у бой», «Руіны страляюць», «Людзі на балоце», «Подых навальніцы», «Час выбраў нас» і іншыя. Пра гэты эпізод вашага жыцця мы ведаем, на жаль, не вельмі шмат.***

— У той час на ўсе галоўныя ролі запрашалі маскоўскіх ці ленінградскіх актрыс. А нам даставаліся маленькія эпізадычныя ролі. Але і гэтаму мы былі рады. Я, напрыклад, ганаруся гэтым, мне не сорамна за маленькія ролі. Адметна і тое, што мяне бралі без ніякіх проб. І, канешне, я многім паспела сказаць «дзякуй» пры іх жыцці. Напрыклад, Віктар Тураў мяне часта запрашаў здымацца, Віталь Чацверыкоў, Міхаіл Пташук. Юрыю Цвяткову, які зняў мяне ў фільме «Ясь і Яніна», я сказала: «Дзякуй за тое, што ты мяне хоць прыгожую зняў, а то я заўсёды ў ваенных фільмах захутаная» *(смяецца)*. Тут ён хоць трошкі пашкадаваў мае гады... Ведаеце яшчэ што? Вялікая справа была для мяне як для актрысы не толькі здымацца, але і агучваць ролі, а таксама дубліраваць іншых акцёраў. Агучыць — гэта значыць зрабіць ролю. І ў мяне такіх работ было даволі шмат. Я агучвала расійскіх, латвійскіх актрыс. А дубляж для мяне таксама праца, і я лічу, што сыграла ў «Знаку бяды» Сцепаніду на беларускай мове. Міхаіл Пташук мяне запрасіў. У «Маці ўрагану» па Караткевічу я таксама агучвала галоўную гераіню. Пасля Пташук запрасіў мяне яшчэ агучыць лэдзі Макбет.

***— Ваша тэатральнае жыццё таксама можна назваць разнапланавым. Прычым кожны вобраз — яркі, запамінальны.***

— У фінале спектакля «Пагарэльцы» мая гераіня гаворыць прыкладна наступнае: «Калі даецца чалавеку пасада, заўсёды думай аб тым, каму яна дастаецца, чым гэта абернецца для людзей праз год, дзесяць гадоў». Такая роля ў мяне была — нешматслоўная. Своеасаблівыя пытанні гледачу, зварот да яго. Дзякуй богу, я іграла разнапланавыя ролі. Уявіце: Камісар у «Аптымістычнай трагедыі» і Мона ў «Безыменнай зорцы» — жанчына, якая жыве за кошт іншага чалавека. Гэта такія розныя полюсы! Варвара ў «Навальніцы» і Ганна ў «Людзях на балоце». Дзякуй богу, у мяне былі ролі, якімі можна ганарыцца. Але былі і даволі вялікія прастоі. Адзін з маіх сяброў прыслаў мне п'есу, якую мы потым ігралі з Наталляй Гайдай. П'еса называлася «Інструкцыя па выжыванні для old lady». Мы назвалі яе «Я не пакіну цябе».

**«Расказваю юнакам і дзяўчатам, як мы жылі і як яны павінны даражыць сваімі бацькамі — не грашыма».**

***— А вы былі рэжысёрам гэтага спектакля.***

— Так, я была рэжысёрам, але я не лічыла сябе ім — проста мне быў зразумелы гэты матэрыял. Ён быў мне даступны. Мы з Наталляй Гайдай зрабілі спектакль у нашай грымёрцы. Усё было абгаворана і сыграна менавіта там. Я наогул люблю, калі рэпецірую што-небудзь. Вельмі люблю развіваць, капацца, паглыбляцца... Помню, калі мы ставілі спектакль «Верачка» паводле п'есы Андрэя Макаёнка, у працэсе рэпетыцый я не была, як кажуць, абыякавай. Рэжысёр Яўген Веніямінавіч Радамысленскі (пасля ён стаў рэктарам школы-студыі МХАТ) гэта заўважыў. І пасля, на мастацкай нарадзе, сказаў неймавернае ў той час: «Я хочу, чтобы вводы в этот спектакль делала Мария Георгиевна». А ў нас ажа ёсць асістэнты рэжысёра. Гэта было ашаламляльным для мяне...

А тады, каб зрабіць на Малой сцэне спектакль «Я не пакіну цябе», часу было вельмі мала. І мы паспелі. Ведаеце, такога поспеху я не адчувала за ўсё сваё жыццё. Цэлыя дэлегацыі — не адзін-два чалавекі, а цэлыя дэлегацыі — прыходзілі пасля спектакля да нас у грымёрку. І нават пасол каралевы Вялікабрытаніі прыйшоў. І прадстаўнікі пасольстваў, і малдаўская дыяспара, і нашы вядомыя людзі...

***— А ці ездзілі на гастролі з гэтым спектаклем?***

— Мы ездзілі на міжнародныя фестывалі. Два разы выступалі ў Маскве, адзін раз у Кіеве і адзін — у Гомелі. У Кіеве нас вельмі цёпла прымаў Багдан Ступка. А ў Маскве выступалі ў адным з тэатраў і ў тэатральных цэнтры. Там якраз прысутнічалі Ніна Лявонаўна Сняжкова і Галіна Уладзіміраўна Мураўская — наш прафесар з Бараўлян. Так што мы з гэтым спектаклем мелі поспех.

### ЗАПАВЕТЫ НАСТУПНІКАМ І ВУЧНЯМ

***— Акцёры Мінскага абласнога тэатра, што ў Маладзечне, і цяпер з удзячнасцю ўспамінаюць вас. Асаблівa — майстар-клас, які вы праводзілі для іх.***

— Я і цяпер, шчыра кажучы, не разумею, як магла згадзіцца на гэта. Кожны дзень уставаць у сем раніцы...

***— Вы спачатку ездзілі з Мінска, а потым заставаліся начаваць у тэатры...***

— Так, даводзілася ездзіць са сталіцы, а потым і начаваць у тэатры. Начавала ў касцюмернай. І ў грымёрцы, калі было холадна. З аднаго боку, я не разумею, як мяне хапала на ўсё. Але цяпер успамінаю — і нешта цёплае ў маёй душы нараджаецца, таму што такі ўнікальны калектыў быў! І мне там было так цёпла і ўтульна! Тры спектаклі, пастаўленыя на сцэне Мінскага абласнога тэатра, я лічу вельмі дастойнымі. Адзін з іх — «Характары» Васіля Шукшына... Галоўнае — тая п'еса Івана Мележа, якую ён мне падарыў, была пастаўлена ў гэтым тэатры. Гучалі ў спектаклі і рамансы на творы Генадзя Бураўкіна.

***— А вы ж таксама спявалі.***

— Я аднойчы спявала. Я часта думаю: якая ж была смелая! На такое асмеліцца — каб праспяваць вершы. Але мне так хацелася! У афішы значылася: «Прызнанне ў любові». На мужчынскае свята, 23 лютага. Цудоўныя вершы Генадзя Бураўкіна! І ён мяне прасіў, каб я паказала гэта. Аднойчы я адзін верш праспявала на юбілеі Бураўкіна.

***— Антон Чэхаў калісьці сказаў: «Абыякавасць — гэта параліч душы». Як, на вашу думку, можна вылечыць душы людзей ад абыякавасці?***

— Ад абыякавасці? Мне здаецца, што, можа, ёсць людзі, ад нараджэння надзеленыя вялікай дабрынёй. Ці калі чалавек сам апынецца ў складанай жыццёвай сітуацыі, тады ён, можа, паспачувае іншаму чалавеку.

***— Як зараз дапамагчы зрабіць дастойны выбар юнакам і дзяўчатам і ў прафесійным, і ў жыццёвым плане? Што можа аб'яднаць людзей, павысіць іх культурны ўзровень?***

— Ведаеце, калі я выступаю перад моладдзю (а такіх выступленняў падчас падарожжаў у рамках культурна-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да Святыняў» з Дабрадатным Агнём было вельмі шмат), то перш за ўсё расказваю пра наша жыццё. Апавядаю юнакам і дзяўчатам, як мы жылі і як яны павінны даражыць сваімі бацькамі — не грашыма. Я кажу ім: «У вас усіх зараз мабільныя тэлефоны. Вы пазванілі — і ўсё. А лепш вы напішыце... Як гэта каштоўна! Я захавала ўсе пісьмы і паштоўкі, якія мне дасылалі. У мяне вялікі архіў. Гэта такое багацце! Напішыце маці ці каму-небудзь яшчэ добрыя словы. Разгарніце кнігу. Адкрыйце нашу беларускую літаратуру, якой па праву можам ганарыцца. Чытаць паэзію — гэта трэба патрапіцца, трэба думаць. Дык нырніце туды, падумайце. Не будзьце легкадумнымі...» І ўсё. Пасля сустрэчы яны акружаюць мяне. Калі фатаграфуемся, я думаю, што, калі хаця б аднаму, двум, траім мае словы запалі ў душу, — гэта ўжо вельмі каштоўна. Вось і ўся навука.

І ўвогуле, я лічу, што, калі ў розных кутках Беларусі, нават у самых аддаленых вёсачках, людзі пазнаюць мяне па голасе, — гэта найвышэйшая ўзнагарода.

**Дзмітрый ПЯТРОВІЧ.**

# ПАКАЛЕННЕ «ГУГЛ»

## Навошта сучаснаму чалавеку крытычнае мысленне?

**Цікавы эксперымент правёў былы настаўнік англійскай мовы з Кентукі Тэры Хейк. Ён прапанаваў вучням 8—9 класаў адказаць на адно пытанне: «Як сучасныя раманы характарызуюць чалавецтва?» А затым са здзіўленнем назіраў, як школьнікі, не раздумваючы, звярнуліся за адказам да Google. Прычым задалі «гуглу» толькі што пачутае ад дарослага пытанне даслоўна...**

Пэўны час таму Тэры Хейк пакінуў выкладанне ў школе, каб запусціць кампанію Teach Thought, якая стварае кантэнт для падтрымкі інавацыйнага выкладання і навучання. На яго погляд, у інтэрнэта — велізарны адукацыйны патэнцыял, але настаўнікі павінны перабудавацца і перастаць проста выдаваць сваім вучням інфармацыю (яна і так сёння даступная ў сецыве), а замест гэтага сфакусіравацца на развіцці ў вучняў крытычнага мыслення.

«Нам уласцівая ілюзія, што мы нешта разумеем толькі таму, што «загуглілі» гэта. І замест таго, каб «патаптацца» вакол новай інфармацыі, паглыбіцца ў яе як след, рухаемся далей — да наступнага паняцця або ідэі», — кажа Хейк. Адна з яго рэкамендацый настаўнікам — задаваць пытанні такім чынам, каб Google толькі дапамагаў стварыць адказ, а не падаваў яго за пару клікаў. «Паспрабуйце прапанаваць ім паразважаць над «вялікімі» пытаннямі, якія не маюць канкрэтных адказаў. У гугл-цэнтрычным свеце мае сэнс вярнуцца да класічнай чалавечай практыкі назірання, вывучэння і выказвання здагадкі», — раіць Хейк.

Крытычнае мысленне і выкарыстанне стратэгій актыўнага навучання аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў міжнароднага навукова-практычнага семінара, які прайшоў у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі (АПА) і сабраў педагогаў з 11 краін: Балгарыі, Венгрыі, Латвіі, Партугаліі, Польшчы, Румыніі, Сербіі, Славеніі, Турцыі, Францыі, Эстоніі і Беларусі. Мерапрыемства праводзілася ў рамках праграмы прафесійных абменаў і павышэння кваліфікацыі Савета Еўропы «Pestalozzi» пры садзейнічанні Міністэрства адукацыі. «Чаму вучыць і як вучыць у XXI стагоддзі?» — гэта пытанне гучала рэфрэнам.

### Знайсці кветку ў джунглях?

— Вызначэнне новых падыходаў да адукацыі хвалюе практычна ўсю сусветную супольнасць. Якімі якасцямі і кампетэнцыямі павінны валодаць вучні, каб быць паспяховымі ў сучасным зменлівым інфармацыйным грамадстве? — разважае **кіраўнік Цэнтра прафесійнага развіцця і інавацыйнай адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Алена РАДЗЕВІЧ**. — Англійскі пісьменнік-фантаст Ніл Гейман у сваім артыкуле «Чаму наша будучыня залежыць ад чытання?» выказаў наступную думку: «Інфармацыя мае кошт, а правільная інфармацыя неацэнная. На працягу ўсёй гісторыі чалавецтва мы жылі ў часы недахопу інфармацыі. Яна была каштоўнай рэччу. І тыя, хто валодалі ёю, маглі разлічваць на ўзнагароджанне. У апошнія гады мы адышлі ад недахопу інфармацыі і падышлі да перанасычэння ёю. Зараз задача не ў тым, каб знайсці рэдкую кветку ў пустыні, а ў тым, каб адшукаць канкрэтную расліну ў джунглях. Нам патрэбная дапамога ў навігацыі, каб знайсці сярод гэтай інфармацыі тое, што нам сапраўды трэба».


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Праблемныя пытанні ўзнікаюць і праз супярэчнасць паміж патрабаваннем сучаснага грамадства да якасна новага навучання і нежаданнем многіх настаўнікаў адыходзіць ад стэрэатыпаў, змяняць традыцыйныя педагагічныя падыходы і свае звычкі. Сучасная адукацыя будуецца не вакол фігуры настаўніка, а вакол фігуры вучня. Педагог перастаў быць адзінай крыніцай інфармацыі ў класе, а вучні больш не з'яўляюцца пасіўнымі слухачамі. І чым хутчэй педагогі гэта зразумеюць, тым лепш. Мы ўсе стаім перад праблемай выбару інфармацыі. У гэтай сітуацыі патрабуецца ўменне не толькі яе здабыць, але і асэнсаваць, і крытычна ацаніць. Атрымліваючы новую порцыю інфармацыі, вучні павінны навучыцца разглядаць яе з розных пазіцый, рабіць высновы адносна яе дакладнасці і каштоўнасці.

### Чытаю і не разумею

Дарэчы, расійскія навукоўцы б'юць трывогу: здольнасць разумець тэксты, крытычна ацэньваць прадастаўленую ім інфармацыю дэманструюць толькі 2% расійскіх навучэнцаў. Не лепшая сітуацыя назіраецца і ў іншых краінах, прычым не толькі сярод падрастаючага пакалення. Няздольнасць чытаць вялікія тэксты, аналізаваць і пераўтвараць інфармацыю — ужо не прагноз фантастаў, а рэальнасць, у якой жывуць нашы дзеці. Пра функцыянальную непісьменнасць пачалі задумвацца на Захадзе прыблізна ў 80-я гады XX стагоддзя. Яе з'яўленне ў развітых заходніх краінах супала з пераходам да інфармацыйнага грамадства.

Людзі, якія церпяць ад функцыянальнай непісьменнасці, пазнаюць словы, але не «бачаць» тэкст, не ўмеюць знаходзіць у ім мастацкі сэнс ці тэхнічную карысць. Некаторыя даследчыкі лічаць, што функцыянальная непісьменнасць нават горшая за звычайную, паколькі ўказвае на глыбокія парушэнні ў механізмах мыслення, увагі і памяці.

— Сёння важна, каб вучань не толькі ведаў, як «гугліць», але і ўмеў ацаніць атрыманае і прыняць правільнае рашэнне. Гэта можна лічыць адной з самых актуальных адукацыйных задач, — тлумачыць Алена Радзевіч. — Гаворачы аб крытычным мысленні, многія часта робяць памылку, прымаючы яго за прадмет, які павінен выкладацца ў школе, або за набор навыкаў і метадаў, якія можна выпрацаваць і прымяніць. А калі гэта не так. Што ж такое крытычнае мысленне? Паводле амерыканскага псіхолага Даяны Халперн, гэта гатоўнасць да планавання, гнуткасць, імкненне выпраўляць свае памылкі, усведамленне і аналіз уласных разважанняў, пошук кампрамісных рашэнняў.

Выкарыстанне разнастайнай медыяінфармацыі на школьных уроках дазваляе навучыць выяўленню схаваных у ёй сэнсаў, разуменню светапогляду аўтара. На такіх матэрыялах вельмі зручна навучаць школьнікаў аргументацыі ўласных выказванняў і фарміраваць уменне не толькі слухаць, але і чуць апанента, адным словам развіваць крытычнае мысленне.

— На ўроку вучні могуць адпрацоўваць тэхналогію пошуку інфармацыі, работу з бібліятэчнымі каталогамі, гіпертэкставымі пошукавымі сістэмамі. Роля настаўніка — накіроўваць работу навучэнцаў, вучыць іх граматна складаць пошукавыя запыты, падбіраць ключавыя словы і г.д. Уменне крытычна ацэньваць інфармацыю дапаможа падрастаючаму пакаленню арыентавацца ў інфармацыйных патоках, выпрацоўваць устойлівасць да медыяманіпуляцый і прымаць незалежныя прадуманыя рашэнні, — падкрэслівае спецыяліст. — Педагогам, якія адважацца адказаць на выклікі сучаснага інфармацыйнага свету, прыйдзецца працаваць побач з тымі, хто не хоча нічога змяняць. Гэта зробіць іх працу больш складанай, але ад гэтага не менш удзячнай і важнай.

### Калі не ведаеш, куды плыць?

**Прафесар кафедры педагогікі і менеджменту адукацыі АПА, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Мікалай ЗАПРУДСКІ** спыніўся на такой новай стратэгіі навучання, як актыўная ацэнка. Яна прымяняецца настаўнікамі ўжо ў многіх краінах свету.

— У Еўропе гэта тэхналогія вядомая пад назвай Formative Assessment, а беларускія педагогі назвалі яе АА (актыўная ацэнка). Практыка сведчыць, што менавіта гэта стратэгія навучання дае найбольш адукацыйны эфект, — падкрэслівае Мікалай Запрудскі. — Для педагога актыўная ацэнка — гэта прыняцце іншай уласнай прафесійнай пазіцыі і сваёй ролі на ўроку. Акрамя таго, гэта разуменне іншай, самастойнай пазіцыі вучня. Усё навучанне ў межах актыўнай ацэнкі пранізана зваротнай сувяззю: ад настаўніка да вучня, ад настаўніка да бацькоў, ад вучня да другога вучня, ад вучня да бацькоў. Навучэнцы маюць магчымасць пастаянна бачыць і разумець свае поспехі, разумець свае памылкі і працаваць над імі. Актыўная ацэнка падказвае, у якім кірунку ім рухацца далей, матывуе і прымушае браць на сябе адказнасць за сваё навучанне.

Як адзначае Мікалай Запрудскі, пры традыцыйнай практыцы мэты ўрока фармулюе выключна настаўнік, а вучні тут — толькі «матэрыял», з якім ён працуе. Галоўнае — работа настаўніка, як рытуал, напісаны ім план, а вынік урока мае другаснае значэнне.

— Мэта павінна быць не толькі ў настаўніка, але і ў вучняў. Нездарма Сенека казаў: **«Калі вы не ведаеце, куды плысці, ні адзін вецер не будзе вам спадарожным».** Тое ж і з вучнем, які пачуў толькі тэму ўрока, але не ведае яго мэты, не ведае, што павінен вывучыць і навошта. Калі адкрыем яму таямніцу, навошта мы вывучаем, ён стане нашым саюзнікам. Галоўнае — не перабраць з высокімі чаканнямі ў дачыненні да вучняў, бо мэта можа ператварыцца ў мару, — папярэджвае прафесар. — Мэту можна параўнаць з цаглінкай, з якой складаецца будынак пад назвай «урок», але калі мэта не адпавядае заяўленым патрабаванням, яна падобна да цаглінкі, пакладзенай наўскос.

Пры актыўнай ацэнцы ў вучня няма залежнасці ад адзнакі. Адна са стратэгій АА — вучымся на памылках. Калі педагог дае магчымасць памыляцца, істотна змяняюцца паводзіны вучняў, яны смялей пачынаюць выказвацца, дзяліцца цікавымі ідэямі, задаваць пытанні, агучваць гіпотэзы. Настаўнік — не кантралёр, а партнер у працэсе навучання.

### Правіла непадымання рукі

Сапраўднае мастацтва — уменне задаваць на ўроку пытанні. Педагог павінен прадумаць ключавое пытанне, на якое на працягу 45 хвілін навучэнцы будуць шукаць адказ. Гэта той «кручок», які чапляе ўвагу вучня і не адпускае, пакуль задача не будзе вырашана.

Мікалай Запрудскі раіць педагогам больш шырока прымяняць адкрытыя пытанні, пытанні, якія правакуюць дыскусію, ствараюць праблемную сітуацыю.

— Пытайцеся не пра тое, што называецца цывілізацыяй, а, напрыклад, які сэнс вучань укладвае ў гэта паняцце. Скажам, замест пытання пра пабудову цвёрдых цел карысна пацікавіцца, чым абумоўлена менавіта такая іх пабудова. Самы эфектыўны спосаб заахвоціць вучняў думаць — гэта задаваць ім стымулюючыя пытанні.

Цікавае назіранне: дзеці, якія да школы ахвотна распытваюць бацькоў і выхавальнікаў пра ўсё, што яны бачаць, страчваюць такую цікаўнасць у школе. Чаму? Магчыма, гэта вынік таго, што інфармацыю яны атрымліваюць раней, чым паспяваюць ёю зацікавіцца? Да таго ж педагог, часцей за ўсё, не пакідае ім часу на развагі і роздум. На пытанне «Як доўга чакаеце адказу?» большасць настаўнікаў прызнаюцца, што некалькі секунд — да першай узнятай рукі.

Бадай што самае нязвыклае для беларускіх педагогаў у тэхналогіі актыўнай ацэнкі — гэта правіла непадымання рукі, якое змяншае для вучняў верагоднасць адседзецца, так бы мовіць, у глядзельнай зале, нават калі ідзе работа ў групе. Бо як толькі хтосьці падымае руку, то менш хуткія і паспяховыя вучні адразу спыняюць пошук адказу на пытанне. Прычым па тэхналогіі актыўнай ацэнкі таго, хто будзе адказваць, вызначае не педагог, а лёсаванне, напрыклад, з дапамогай палосак з імёнамі. Выклікаць любога вучня могуць у любы час, таму заўсёды трэба быць гатовым да адказу. Ёсць у гэтым і яшчэ адзін вялікі плюс — канкурэнцыя ў класе змяняецца на супрацоўніцтва.

***

І напрыканцы яшчэ адна акалічнасць, якую давядзецца ўлічваць, выхоўваючы пакаленне «гугл». Шматлікія даследаванні паказваюць, што калі людзі ведаюць, што ў іх ёсць кругласутачны доступ да інфармацыі, яны хутчэй спрабуюць запомніць, дзе і як знайсці гэтую інфармацыю, чым унікнуць у саму яе сутнасць. Навошта запамінаць даты дзён нараджэння сяброў, калі іх можна знайсці ў сацыяльных сетках? Але ёсць і іншае меркаванне: лёгкі доступ да любой інфармацыі вызваляе ў нашым мозгу большую прастору для заняткаў творчай дзейнасцю, з чым папярэднім пакаленням не так шанцавала. Адным словам, дыскусіі працягваюцца...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda*

### Прыклады ключавых пытанняў на ўроку:

**Што агульнага паміж скланеннем лічэбнікаў і дзіцячым канструктарам?**

**Першая сусветная вайна — выпадковасць ці заканамернасць?**

**Чаму тое, што выводзіцца з арганізма, не падобнае да таго, што ім спажываецца?**

**Ці можна зрабіць так, каб вада кіпела толькі ў палове пасудзіны?**

**Як вы разумееце надпіс на пакеце з малаком «Тлустасць 3,6 працэнта»?**

**Салёнасць Балтыйскага мора складае 0,76%. Колькі вады трэба выпарыць, каб атрымаць кілаграм солі?**

**Якімі аргументамі можа даказаць ці аспрэчыць сцвярджэнне, што шкло не раствараецца?**


ПРИГЛАШЕНИЕ

**Унитарное предприятие Национального олимпийского комитета Республики Беларусь «Спортивно-оздоровительный комплекс «ОЛИМПИЙСКИЙ»**

**ПРОВОДИТ АУКЦИОН №113 ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ИЗОЛИРОВАННОГО НЕЖИЛОГО ПОМЕЩЕНИЯ СРОКОМ НА ТРИ ГОДА**

| | Предмет аукциона (право заключения договора аренды), цель использования помещения | Площадь, м² | Начальная цена продажи до деноминации | Начальная цена продажи после деноминации |
|---|---|---|---|---|
| | **г. Минск, ул. Я. Колоса, 2, пом. 2** | | | |
| 1 | Изолированное нежилое помещение № 1 в выходе на чердак (под офис) | 13,2 | 448 800 | 44,88 |
| | **г. Минск, пр-т Независимости, 49 пом. 3** | | | |
| 2 | Изолированное нежилое помещение № 4 на 5 этаже (под офис) | 38,3 | 1 302 200 | 130,22 |
| | **г. Минск, пр-т Независимости, 80А** | | | |
| 3 | Изолированное нежилое помещение № 24 и часть коридора № 27 на 2 этаже (под офис) | 15,7 | 533 800 | 53,38 |

**Аукцион состоится «27» декабря 2016 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 2а, конференц-зал. Документы на участие принимаются по «26» декабря 2016 года до 17.00 включительно по адресу: 220012, г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.**

**Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Телефоны для справок (017) 290-49-06, 290-47-18, 290-49-11. Интернет: www.dvs.by.**

**Организатор аукциона (продавец) – УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ», г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.**

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота **расчетный счет 3012208250015, ОАО «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, МФО 153001964, УНП 101 508 270, УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ».** Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом на расчетный счет организатора аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения.

Победитель аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан возместить УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона.

■ Рэха Першай сусветнай

# НЯМЫЯ СВЕДКІ

**Карэспандэнт «Звязды» пабывала на адных з самых недаступных пахаванняў воінаў Вялікай вайны**

**Стагоддзе таму на беларускай зямлі разгарнулася адна з самых кровапралітных бітваў Першай сусветнай вайны. За 12 дзён Нарачанскай аперацыі загінула і было паранена 78 тысяч афіцэраў і ніжніх чыноў Рускай імператарскай арміі. Прычым большасць — каля 50 тысяч воінаў — палегла ўсяго за чатыры дні. Было гэта пад Паставамі ў халодныя сакавіцкія дні...**



Пахаванні нямецкіх салдат паміж вёскамі Драбышы і Малой Ольсяй.

Фота Андрэя МАЦУРА.

Нямецкія гісторыкі і дагэтуль хаваюць дакладную колькасць сваіх землякоў, забітых і параненых пад Нарачч. Тое, што іх было не проста шмат, сведчаць вайсковыя пахаванні (прычым абодвух ваюючых бакоў), якімі ўсыпана пастаўская зямля.

Каб ушанаваць памяць тых, хто загінуў каля Нарачы вясной 1916-га, мясцовыя жыхары, святары і краязнаўцы з іншых рэгіёнаў Беларусі сёлета зноў выправіліся ў дарогу. Каля пахаванняў, многія з якіх знаходзяцца ў былой франтавой зоне, гадоў 80, а можа, і больш, не было столькі людзей. Магчыма, і не будзе — тут, на месцы самага пекла Нарачанскай аперацыі, праходзіць мяжа з Літвой. Некаторыя магілы размяшчаюцца якраз на лініі, што падзяляе тэрыторыю на дзве самастойныя сёння дзяржавы.

## Пункт № 1. Перавознікі

На сельскіх могілках у вёсцы Перавознікі адно пахаванне прыкметна адрозніваецца ад іншых. Замест мармуровых або бетонных надмагілляў — вялікі крыж, пад якім вечным сном спіць некалькі дзясяткаў чалавек. Старажылы, пакуль маглі, даглядалі пахаванне. Потым яго напаткала забыццё. І калі б не дырэктар Юнькаўскага ясляў-сада — базавай школы Аляксандр Кузняцоў, так і не даведаліся б новыя пакаленні аб тым, што тут спачываюць салдаты Рускай арміі.

— Да мяне звярнуўся мясцовы жыхар, які расказаў, што на сельскіх могілках у вёсцы Перавознікі пахаваны салдаты Першай сусветнай вайны, — прыгадвае Аляксандр Кузняцоў. — Была тут і магіла афіцэраў, але, на жаль, не захавалася.

Падчас Нарачанскай аперацыі ў вёсцы знаходзіўся штаб 2-й Сібірскай стралковай дывізіі, якая ў першыя дні баёў панесла вельмі вялікія страты: толькі за адны суткі загінула і было паранена 55 афіцэраў і 5200 стралкоў. Кіруючыся гэтымі фактамі і лічбамі, Аляксандр Кузняцоў зрабіў выснову, што тут пахаваны менавіта воіны гэтай дывізіі.

— Мясцовым жыхарам запомнілася, што калі ў вёску прывезлі загінулых стралкоў, яны мелі вельмі жудасны выгляд, — працягвае дырэктар школы. — Меркавалі, што тыя палеглі падчас газавай атакі. Але вядома, што ў перыяд Нарачанскай аперацыі шмат воінаў засталося каля нямецкіх пазіцый. Таму калі атрымалася забраць целы загінулых, выгляд якіх па аб'ектыўных прычынах быў жудасным, іх пахаванне адбылося там, дзе размяшчаліся органы кіравання гэтай дывізіі. Верагодна, у вёсцы знаходзіўся шпіталь, і на сельскіх могілках хавалі тых, хто памёр ад ран.

## Пункт № 2. Драбышы — Малая Олься

Калі едзеш з вёскі Драбышы ў Малую Ольсю, цяжка не заўважыць сельскія могілкі, якія размясціліся якраз каля дарогі. І, напэўна, былі б яны звычайнымі, калі б сярод грамадзянскіх пахаванняў не ўзвышаліся арыгінальныя помнікі Першай сусветнай вайны і бетонныя крыжы — надпісы на іх сведчаць, што тут спачываюць нямецкія салдаты. Мяркуецца, што хавалі на могілках і воінаў Рускай арміі.

Бетонныя крыжы на нямецкіх магілах усталёўваліся ў канцы 1920-х — пачатку 1930-х гадоў на грошы міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа. Дзякуючы гэтаму захаваліся многія імёны. На надмагіллях таксама ўказаны нумары нямецкіх вайсковых часцей, даты смерці воінаў, якіх хавалі тут з восені 1915 па 1917 год.

— Існуе такое выказванне: калі не шануеш мінулае, будучыня выстраліць у цябе з гарматы, — гаворыць заснавальнік дабрачыннага культурна-гістарычнага фонду памяці Першай сусветнай вайны «Крокі», лаўрэат прэміі Прэзідэнта Беларусі «За духоўнае адраджэнне» Барыс Цітовіч. — Яно поўнасцю адносіцца да Першай сусветнай вайны, паколькі яе героі былі апляванымі, а сама вайна ўвогуле стала напаўзабытай. Калі б памяць аб ёй жыла і былі зроблены адпаведныя высновы, Другая сусветная вайна магла б не адбыцца, а можа, прайшла б у іншым фармаце.



А так выглядаюць могілкі ў фотаальбоме нямецкага 17-га пяхотнага палка «Граф Барфус».

Фота з калекцыі Уладзіміра БАГДАНАВА.

## Пункт № 3. Норкавічы

Яшчэ нядаўна да могілак нямецкага 52-га рэзервовага пяхотнага палка, якія знаходзяцца на пагорку вёскі Норкавічы, дабрацца было праблематычна. Адасобленыя ад мясцовых жыхароў, яны паціху зарасталі бур'янам і дрэвамі, у выніку чаго ператварыліся ў гушчар. Каб адшукаць хоць якія сведчанні Вялікай вайны, мясцовым энтузіястам, членам валанцёрскага руху «Заходні рубеж» давялося папрацаваць тут не адзін дзень.

— Два разы абышоўшы аб'ект, мы ледзь трапілі ў зараснікі, — расказвае лідар валанцёрскага руху Андрэй Мацур. — Ачысціўшы тэрыторыю, акрамя цэнтральнага помніка, знайшлі некалькі плоскіх пліт, але разабраць, што на іх напісана, немагчыма. Верагодна, на гэтым месцы пахаваны і рускія салдаты.

Знойдзены помнік, а менавіта вялікі камень, паведамляе, што тут спачываюць 4 афіцэры і 44 салдаты Брандэнбургскага 52-га рэзервовага пяхотнага палка, якія загінулі ў сакавіку 1916 года. На фотаздымку з калекцыі вядомага фатографа і журналіста, аўтара кнігі «Бітва каля Нарачы» Уладзіміра Багданава бачна, як выглядалі могілкі ў 1916—1917 гадах. «Магчыма, пахаванне воінаў тут ажыццяўлялася і пазней, бо на фотаздымку відаць, што тут спачывае больш чым 50 чалавек», — перакананы Уладзімір Багданаў.

## Пункт № 4. Ярэва

У адрозненне ад папярэдніх могілак пахаванне нямецкіх салдат, якое знаходзіцца літаральна каля хаты мясцовай жыхаркі ў вёсцы Ярэва, заўжды дагледжанае. Быццам грыбамі пасля дажджу, зямля ўсыпана надмагільнымі крыжамі. На ўсіх, а іх каля 30, — надпісы на нямецкай мове. Старажылы ўспамінаюць, што калісьці тут стаяў і помнік. Але што з ім адбылося, ніхто не ведае. Тое, што ён сапраўды быў, сведчыць і нямецкі фотаздымак 1917 года з калекцыі Уладзіміра Багданава. На помніку салдатам і унтэр-афіцэрам 2-й роты 17-га пяхотнага палка змяшчаецца спіс тых, хто загінуў у сакавіку 1916 года пад Паставамі. Адно з пералічаных прозвішчаў калекцыянер адшукаў на надмагільным крыжы.

— У палкавой гісторыі 17-га пяхотнага палка «Граф Барфус» гаворыцца, што амаль усе, хто ўказаны ў спісе на помніку, загінулі ў баях 19—21 сакавіка каля вёскі Мажэйкі, — удакладняе Уладзімір Багданаў.

У Ярэве ёсць яшчэ адзін напамін аб падзеях стогадовай даўнасці. Амаль у цэнтры вёскі стаіць памятны крыж, які нагадвае аб тым, што на гэтым месцы знаходзіліся вялікія могілкі нямецкіх салдат 17-га пяхотнага палка «Граф Барфус». Мяркуючы па арыгінальных фотаздымках, узніклі яны восенню 1915 года. Па ўспамінах мясцовых жыхароў, яшчэ пасля Другой сусветнай вайны тут стаялі бетонныя крыжы. У 1970-х гадах могілкі былі зруйнаваны, на гэтым месцы пабудавалі мехдвор.

## Пункт № 5. Свілэлі

На пад'ездзе да вёскі Свілэлі толькі няўважлівы не ўбачыць прыгожы бярозавы гай. Але не відаць з дарогі салдацкіх пахаванняў, абазначаных бетоннымі крыжамі. Ад некаторых з іх засталіся толькі фрагменты. На большасці надмагілляў — нямецкія прозвішчы. Але спачываюць тут і расійскія воіны. З 43 знойдзеных крыжоў (па падліках экспертаў тут пахавана каля 100 вайскоўцаў) 5 ушаноўваюць памяць байцоў Рускай арміі. Хто канкрэтна ляжыць у гэтых магілах, невядома.

— З 38 нямецкіх крыжоў толькі 15 імянных, — гаворыць Уладзімір Багданаў. — Для нямецкай арміі гэта нонсэнс. Іншага такога месца я не ведаю. Гэта гаворыць пра тое, што целы былі настолькі знявечаны, што нельга было ўстанавіць імёны. Магчыма, тут пахаваны тыя, каго знайшлі пазней, — калі растаяў снег і расчысцілі засыпаныя зямлёй траншэі.

## Пункт № 6. Мікулішкі

Вёскі ўжо даўно не існуе. Няма і могілак, якія размяшчаліся побач з Мікулішкамі. Пра тое, што тут пахаваны салдаты Першай сусветнай вайны, нагадвае некалькі бетонных крыжоў, а таксама слупкоў — верагодна, ад былой агароджы. Па ўспамінах мясцовых жыхароў, гэта толькі невялікая частка надмагілляў. У другой палове мінулага стагоддзя тэрыторыя могілак у ходзе сельскагаспадарчых работ паступова скарачалася. Пахаванні былі зраўнаваны з зямлёй, крыжы раскіданы па полі. Цяпер тут — невялікі неўзараны ўчастак, за сто метраў ад якога праходзіць мяжа з Літвой.

— Гэтае поле з'яўляецца эпіцэнтрам самых жорсткіх баёў, — расказвае Уладзімір Багданаў. — Поле, якое без перабольшання залітае крывёю. Адсюль мы бачым лес, так званы лес Гіндэнбурга, дзе было спынена рускае наступленне, аплачанае тысячамі жыццяў.

Вось як немцы апісваюць наступленне рускіх войск у адной з палкавых гісторый: «Насупраць нас стаялі рускія ў злучаных паміж сабой лясах. Закончыўшы падрыхтоўку, яны выступалі густымі масамі. Настолькі густымі, што артылерыя і кулямёты не паспявалі знішчаць атакуючых з-за невялікай дыстанцыі атакі. Напіралі ўсё новыя і новыя масы, у якіх наша артылерыя 42-й дывізіі сваім пагібельным агнём вырывала шырокія прабоіны. Трупы ляжалі, нібы горы. Па іх крочылі новыя атакуючыя, самі ахопленыя жахам. Рэдка дзе горы трупаў былі такія высокія, як тут». Аддавалі немцы належнае і мужнасці праціўніка: «Адважныя рускія камандзіры, якія не жадалі выпускаць перамогу, па адным і групамі спрабавалі скачкамі пераадолець ураган нямецкага загараджальнага агню. Але гэта былі скачкі насустрач смерці...»

## Пункт № 7. Вілейты

У тым жа самым лесе Гіндэнбурга, што непадалёк ад вёскі Вілейты, знаходзяцца могілкі нямецкага 232-га рэзервовага пяхотнага палка. Аб напружанасці баёў, якія адбыліся тут ранняй вясной 1916 года, сведчыць той факт, што размяшчаюцца яны непасрэдна на баявых пазіцыях, якраз каля нямецкіх акопаў.

Большасць салдат, пахаваных тут, загінула ў адзін дзень — 21 сакавіка. Менавіта тады абодва бакі панеслі самыя вялікія страты. На могілках — каля 80 бетонных пліт, якія ўвекавечваюць імёны салдат 232-га нямецкага палка. 38 расійскіх вайскоўцаў, пахаваныя немцамі ў брацкай магіле, як і ў большасці выпадкаў, безыменныя.

— Аб гэтых могілках да мінулага года не ведаў ніхто, — узнаўляе гісторыю пошуку Уладзімір Багданаў. — Нават мясцовы жыхар, даволі сталы чалавек, сказаў, што чуе пра іх упершыню.

Плоскія надмагіллі проста засыпала лісцем, яны аказаліся пад пластом глебы. І каб не дрэва, якое ўпала і каранямі падняло адну з пліт, эксперт па пахаваннях Першай сусветнай вайны наўрад ці даведаўся б нешта новае аб гэтым месцы. Паколькі даводзілася бачыць падобныя пахаванні шмат разоў, Уладзімір Багданаў пачаў уважліва праглядаць мясцовасць: не можа адна стандартная пліта быць сярод лесу. Па колькасці захаваных пліт гэта самыя вялікія могілкі салдат Першай сусветнай вайны ў Пастаўскім раёне і адны з найбуйнейшых у Беларусі.

* * *

Насамрэч, гэта толькі частка пахаванняў, якія на тэрыторыі нашай краіны ў напамін аб сабе пакінула Вялікая вайна. Толькі ў Пастаўскім раёне пакуль выяўлена 40 могілак Першай сусветнай, а па ўсёй Беларусі іх больш за трыста. Пра існаванне гэтых маўклівых сведчанняў мінулых падзей сёння мала хто ведае. Да многіх з іх прырода праклала жывую загарадзь. Але асноўную агароджу сваім забыццём і абыякавасцю паставілі людзі.

На думку намесніка старшыні Пастаўскага райвыканкама Юрыя Кісялёва, актуальны сёння ваенна-гістарычны турызм мог бы стаць часткай турыстычнай дзейнасці ў пастаўскім рэгіёне. «Нам неабходна захаваць гістарычную памяць аб трагізме той вайны і гаварыць аб гэтым дзеля таго, каб сучаснае пакаленне разумела ўвесь жах мінулых падзей, памятала аб іх і ўсімі сіламі, сродкамі імкнулася не дапусціць развязвання чарговага ваеннага сутыкнення», — лічыць ён.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

*Пастаўскі раён.*

***Больш фота глядзіце на сайце zviazda.by***

■

# Вярнуцца з вайны

**У Быхаўскім раёне перапахавалі 35 байцоў, якія загінулі на гэтай тэрыторыі падчас Вялікай Айчыннай вайны**

**У раёне вёсак Рыжкаўка, Прыбаражжа і Грудзінаўка ў ліпені 1941-га ў акружэнне трапіў штаб 45-га стралковага корпуса генерала Эрмана Магона разам з падраздзяленнямі 148-й Саратаўскай і 187-й Чарнігаўскай стралковых дывізій. Кроў тут лілася ракой, як, зрэшты, і па ўсёй Быхаўшчыне, праз якую праходзіў Дняпроўскі рубеж.**

— Пасля фарсіравання немцамі Дняпра на левым беразе ракі да сярэдзіны ліпеня ішлі самыя жорсткія баі, — расказвае **ваенны пісьменнік, кіраўнік Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага клуба ВІККРУ Мікалай БАРЫСЕНКА.** — Напор нямецкай жалезнай армады 4-й танкавай дывізіі стрымлівала каля 10 стралковых дывізій Чырвонай Арміі. Назваць іх усе мы пакуль не можам. Дакладна вядомы толькі чатыры — 187-я, 148-я, 137-я Горкаўская і 102-я стралковыя дывізіі. На поле бітвы засталіся ляжаць тысячы нашых воінаў. Шмат іх палягло і ў 1943—1944 гадах. Тут некалькі месяцаў стаяў фронт.



**Больш чым праз 70 гадоў родныя Івана ЖЫГУНА (злева) і Васіля ЗАКАРЭЦКАГА атрымалі першыя весткі пра іх.**

Гэтым летам пашукавікі клуба ВІККРУ разам з прадстаўнікамі 52-га асобнага спецыялізаванага батальёна і брэсцкімі калегамі паднялі астанкі яшчэ 35 савецкіх байцоў і камандзіраў, якія загінулі тут у 1941—1944 гадах. Тыя 5 медальёнаў, якія атрымалася знайсці, далі надзею даведацца прозвішчы герояў. На жаль, прачытаць удалося толькі тры імені — капітана Міхаіла Серыка, камандзіра батальёна Чарнігаўскай 187-й стралковай дывізіі, радавых Івана Жыгуна і Васіля Закарэцкага. Усе яны — ураджэнцы Украіны, а загінулі падчас абароны Беларусі. Міхаілу Серыку на той момант было 30 гадоў. Жыгуну было менш. Год нараджэння Васіля Закарэцкага прачытаць не атрымалася.

У Быхаўскім раёне аднесліся да памяці абаронцаў з вялікай павагай. З кастрычніка па лістапад тут прайшло тры перапахаванні. Акрамя Новага Быхава жалобная цырымонія адбылася ў вёсцы Сялец. Там знайшоў свой апошні прытулак і радавы Васіль Закарэцкі. А ў першыя дні лістапада на могілках вёскі Грудзінаўка развіталіся з капітанам Міхаілам Серыкам і чырвонаармейцам Іванам Жыгуном.

У Быхаўскім райваенкамаце паведамілі, што атрымалася выйсці на сувязь з унучкамі Васіля Закарэцкага і Івана Жыгуна. Абедзве жывуць у Палтаўскай вобласці. Прыехаць на перапахаванне яны не змаглі, але абяцалі пабываць на магілах сваіх гераічных дзядоў у маі ці летам. На жаль, родных камандзіра Міхаіла Серыка пакуль не знайшлі. У райваенкамаце паведамілі, што зрабілі пісьмовы запыт у Чарнігаўскі ваенкамат з просьбай дапамагчы адшукаць яго блізкіх. Пакуль адказу не было.

Родныя Жыгуна і Закарэцкага перадалі ў архіў ВІККРУ фота сваіх дзядоў. Так што цяпер мы ведаем герояў нават у твар, што таксама рэдкасць. У воінскіх пахаваннях на Магілёўскай зямлі знайшлі вечны спакой 340 тысяч камандзіраў і радавых Чырвонай Арміі, нам вядомы толькі 70 тысяч з іх. Пошукі між тым працягваюцца, бо нездарма кажуць, што нязнойдзеныя або непахаваныя салдаты заўсёды застаюцца на перадавой. Яны павінны вярнуцца з вайны. Іх чакаюць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў
ФАРПОСТ СПАКОЮ
№ 12 (30)

■ Памяць

# ІМЁНЫ, УПІСАНЫЯ Ў ВЕЧНАСЦЬ

## Магілёўскія міліцыянеры знайшлі новыя звесткі пра подзвігі сваіх гераічных калег

**Для ўвекавечвання памяці таварышаў па службе ўжо і так зроблена не мала. Ва ўпраўленні ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама ёсць галерэя партрэтаў яго кіраўнікоў пачынаючы з 1938 года, працуе зала гісторыі гэтай службы, па ўсёй вобласці ўсталёўваюцца памятныя дошкі і адкрываюцца помнікі. Але ў гісторыі міліцыі, якая налета будзе адзначаць свой 100-гадовы юбілей, яшчэ хапае белых плям. У Магілёўскім інстытуце МУС за апошнія 4 гады ўстанавілі 14 раней невядомых імёнаў. А яшчэ знайшлі новыя звесткі пра батальён міліцыі капітана Уладзімірава, які амаль цалкам загінуў падчас абароны Магілёва.**



Дзмітрый ПАНУЖДАЕЎ упэўнены, што веданне гісторыі дапамагае стаць патрыётам.

### Народжаная рэвалюцыяй

**Намеснік начальніка інстытута па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні палкоўнік міліцыі Дзмітрый ПАНУЖДАЕЎ** над аднаўленнем гісторыі міліцыі працуе не першы год. На яго рахунку дзве напісаныя ў суаўтарстве кнігі, прысвечаныя гэтай службе, вялікі вопыт працы з першакрыніцамі ў архівах. Асабліва яму цікавы самы змрочны перыяд станаўлення гэтай службы — ліхія 20-я гады мінулага стагоддзя. Памятаеце тэлесерыял «Народжаная рэвалюцыяй»? Дарэчы, тыя 14 прозвішчаў супрацоўнікаў магілёўскай і бабруйскай міліцыі, якія аднавіў менавіта ён, якраз з гэтага перыяду. Малодшы пешы міліцыянер Еўстафій Півановіч знік без звестак 15 студзеня 1923 года, крыху пазней было знойдзена яго знявечанае цела. У схватцы з узброенымі дзэерцірамі ў раёне Асавецкага сельсавета на Бабруйшчыне 5 лістапада 1920 года загінулі адразу тры супрацоўнікі Бабруйскай павятовай міліцыі — Леонцій Рыбак, памочнік Уладзімір Дзятлаў, малодшы міліцыянер Мікалай Трусаў. Скупыя міліцэйскія зводкі — адзінае, што нагадвае сёння пра гэтых людзей. Амаль праз 100 гадоў пасля тых падзей практычна немагчыма знайсці інфармацыю, калі яны нарадзіліся, хто іх родныя.

— У 1920-я гады ў радах міліцыі была вялікая цякучка кадраў, пастаянныя чысткі, — кажа Дзмітрый Пануждаеў. — Асабісты склад у тыя гады абнаўляўся амаль на 90%. Час быў вельмі неспакойны, бандытызм квітнеў у поўную моц. Выклік новай уладзе кідалі не толькі крымінальныя асобы, часта так званымі народнымі мсціўцамі станавіліся дзеці заможных бацькоў. Савецкая ўлада з такімі, як вядома з гісторыі, не цырымонілася. Іх маглі адлічыць з інстытута, саслаць на катаргу. Яны збягалі, вярталіся дадому і збіралі вакол сябе аднадумцаў. І насельніцтва не заўсёды было супраць іх.

Аднойчы ў Нацыянальнай бібліятэцы палкоўніку трапіла на вочы рэдкая кніга 1927 года выдання пра першыя 10 год існавання савецкай міліцыі. Гэта была сапраўдная знаходка, бо ўтрымлівала ў сабе багаты фактальны матэрыял. Ведаючы кошт такім выданням, Дзмітрый Пануждаеў скапіраваў яе з пачатку да канца. Але глядзець без дрыжыкаў гэтую кнігу цяжка — вельмі шмат фота з трунамі, у якіх ляжаць зусім яшчэ маладыя людзі. Тагачасныя летапісцы захавалі для будучых пакаленняў сваіх паслядоўнікаў каштоўны матэрыял. «Гісторыя дзесяцігоддзя патрабавала ад работнікаў міліцыі шмат ахвяр. Мы таксама не павінны забывацца: гісторыя рэвалюцыі не сёння, дык заўтра спытае гэтыя спіскі», — гаворыцца ў прэамбуле. Яны сталі па-сапраўднаму працоўнымі для сённяшняга пакалення міліцыі, якое па каліву вярнае знікльыя ў часе імёны.

— У главе, прысвечанай загінулым барацьбітам, я знайшоў успамін пра Якава Будагоўскага, — расказвае палкоўнік міліцыі. — У пачатку 2000-х мне даваліся размаўляць з яго дачкой, яна даслала фота свайго бацькі. З дапамогай гэтай кнігі мы ўдакладнілі дату і абставіны гібелі яшчэ аднаго нашага калегі Царанкова. А на адным са здымкаў я ўбачыў каля труны твар знаёмага чалавека — Сямёна Файнштэйна. У 1924 годзе ён быў назначаны начальнікам акруговай міліцыі, якая ў той час аб'ядноўвала палову раёнаў Магілёўскай вобласці. З 1924-га па 1930 год да рэарганізацыі акруг у раёны ён кіраваў без аніякіх нараканняў. Усюды, дзе прыходзілася чытаць пра яго, гаворыцца, як ён якасна выконваў сваю работу. За старанні быў узнагароджаны срэбным гадзіннікам. У 1930 годзе сляды яго згубіліся. Цікава, што далей было з ім? У архіве знайшоўся дакумент, што ў 1965 годзе ў Самары яго віншавалі з 70-годдзем. Збіраемся папрасіць нашых самарскіх калег знайсці яго асабістую справу.

### Без тэрміну даўнасці

Даследаванні дапамагаюць знайсці шмат цікавых, раней невядомых фактаў з біяграфіі былых супрацоўнікаў магілёўскай міліцыі. У Нацыянальнай бібліятэцы Дзмітрый Пануждаеў, гартаючы Веснік НКУС РСФСР, выпадкова наткнуўся на некралог Паўла Карбоўскага. Гэты чалавек меў непасрэднае дачыненне да Магілёва. Але праз памылку ў назве вобласці, дзе яна была пазначана як Магілянская, ён проста выпаў з гісторыі магілёўскай міліцыі. Сам факт існавання некралога ў такім аўтарытэтным выданні сведчыць, што чалавек быў паважаны.

Ёсць невядомы перыяд і ў біяграфіі Віктара Бальзоўскага, які пэўны час узначальваў магілёўскую акруговую міліцыю. Пасля паспяховага кар'ернага росту да начальніка Мінскай школы міліцыі ён нечакана ў 1944 годзе трапіў у спісы ворагаў народа і быў сасланы ў Сіблаг. У 1960 годзе быў рэабілітаваны пасмяротна.

Імя Дзмітрыя Вольскага ўвекавечана даўно. Ён загінуў у 1941-м пры абароне мосту цераз Днепр у Магілёве. Упраўленнем ДАІ Магілёўскага аблвыканкама нават праводзіцца конкурс на прыз гэтага героя. «Але пра яго доўгі час нічога не ведалі родныя, — расказвае Дзмітрый Пануждаеў. — Некалькі гадоў таму ў Магілёў прыязджала яго ўнучка. Яна расказала пра свайго бацьку — сына гэтага абаронцы. Ён доўгі час шукаў сляды Дзмітрыя Вольскага, але беспаспяхова. Сам прыехаць не змог, узрост не дазваляў ды яшчэ і аперацыя на сэрцы. А вось унучка героя паклала гваздзікі каля сімвалічнага каменя на Савецкай плошчы, якая сёння носіць імя Славы.

### Па слядах батальёна капітана Уладзімірава

Гэта імя амаль свяшчэннае для Магілёва, а для міліцыі — яскравы прыклад самаахвярнасці і мужнасці. Пры абароне Магілёва ў ліпені 1941 года на чале міліцэйскага батальёна з 250 байцоў Канстанцін Уладзіміраў на працягу сямі дзён стрымліваў націск фашыстаў на паўночных подступах да горада. Калі сілы былі на зыходзе, паранены камандзір падняў апошніх байцоў батальёна ў атаку. Пасмяротна ён быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Штогод каля помніка батальёну міліцыі ў вёсцы Гаі адбываюцца ўрачыстыя мітынгі, але дагэтуль усё яшчэ існуюць стыхійныя пахаванні гэтых герояў. Невядомымі застаецца і большасць байцоў гэтага батальёна. Пакуль вядома толькі 41 прозвішча.

— Мы таксама займаліся пошукамі інфармацыі, апытвалі відавочцаў, — расказвае **старшы інспектар па асобых даручэннях групы міжнароднага супрацоўніцтва інстытута МУС Аляксей ЦЮЦЮНКОЎ.** — Цяпер паявіліся новыя звесткі. Відавочца гэтых падзей Браніслаў Дашкевіч, ураджэнец вёскі Гаі, быў на той час дзіцем, але ўдзельнічаў у пахаванні салдат і міліцыянераў. Расказаў, што на тэрыторыі самой вёскі трымалі абарону чырвонаармейцы, а міліцыянеры — на ўзвышшы. Пасля нямецкага артабстрэлу лясок на той вышыні амаль знік. Але байцы змагаліся да апошняга. Дзе мясцовыя закапалі загінулых міліцыянераў, ён не ўспомніў, затое паказаў месца пахавання чырвонаармейцаў. А вось відавочца Мікалай Сляпнёў паведаміў, што дапамагаў дарослым хаваць менавіта міліцыянераў. І нават паказаў тую траншэю, дзе, па яго словах, ляжыць 20 чалавек. У маі, як толькі надвор'е будзе спрыяць, збіраемся пачаць раскопкі з удзелам пошукавікоў з клуба ВІККРУ, 52-га асобнага спецыялізаванага батальёна і нашых курсантаў.

Удзел у пошукавай дзейнасці для курсантаў інстытута гэта свайго роду пасвячэнне ў прафесію.

— Вучым іх навыкам работы з архіўнымі дакументамі, расказваем, як іх шукаць, што яны з сябе ўяўляюць. Усё гэта дапамагае маладым людзям адчуць сваё дачыненне да гісторыі і выхаваць любоў да справы, якой яны займаюцца, — кажа Дзмітрый Пануждаеў. — У будучыні мы збіраемся ўстанавіць па апісаннях за 1921 год, дзе ў Магілёве знаходзіліся аддзелы міліцыі. І тут зноў-такі вялікія надзеі ўскладаюцца на нашых курсантаў.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*




У магілёўскай міліцыі — багатая гісторыя.

■ Навіны 102

## У сталіцы затрымалі серыйных «дамушнікаў»

### У пагоні за нажывай тыя кралі ўсё, што бачылі

**Супрацоўнікамі аддзела па раскрыцці кватэрных крадзяжоў упраўлення крымінальнага вышуку ГУУС Мінгарвыканкама сумесна з калегамі з раённых УУС Мінска, а таксама УУС Брэсцкага аблвыканкама спынена дзейнасць злачыннай групы, якая з ліпеня гэтага года здзейсніла серыю кватэрных крадзяжоў на тэрыторыі сталіцы.**

Прафесійнымі «дамушнікамі» былі 41-гадовы жыхар мікрараёна Серабранка і 48-гадовы выхадзец з Баранавіч. Крадзяжы мужчыны здзяйснялі двума спосабамі — пракручваннем асяродка замка і адціскannем шклопакета. Была таксама адна спроба трапіць у кватэру праз дах, аднак той план не спрацаваў, паведамілі ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама.

З мэтай пажывіцца маёмасцю мінчан (а зламыснікі бралі ўсё, што траплялася пад руку), крымінальны тандэм паспеў пабываць у кватэрах Заводскага, Ленінскага і Першамайскага раёнаў. Усяго вядома пра дзевяць такіх эпізодаў. Дарэчы, у верасні 48-гадовы фігурант паспеў здзейсніць крадзеж у Брэсце (здабычай сталі больш за 50 найменняў залатых вырабаў на суму звыш 5000 дэнамінаваных рублёў). А праз два дні ён быў затрыманы мінскімі міліцыянерамі. Гэты зламыснік судзімы за крадзяжы восем разоў. Затрыманы і яго 41-гадовы прыяцель, якога ў пагоні за чужой маёмасцю нічога не спыняла. Ён трапіў у кватэру свайго таварыша, з якім пазнаёміўся ў ЛПП, і выкраў брэндавы парфум, хоць рашуча быў настроены разжыцца некалькімі тысячамі долараў. Справа ў тым, што напярэдадні гаспадар кватэры, які цяпер усё яшчэ знаходзіцца ў ЛПП, неяк абмовіўся, што мае дома буйную суму грошай. Таму прафесійны «дамушнік» быў упэўнены, што варта наведацца да прыяцеля дадому без яго ведама.

## Сагналі старое аўто з трэцяй спробы

Сталічныя міліцыянеры затрымалі студэнтаў адной з мінскіх ВНУ, якія сагналі ВАЗ-2103 1980 года выпуску. Прычым гэта трэцяя па ліку машына, з якой у іх атрымалася гэта зрабіць.

— Позна ўвечары нашы супрацоўнікі вярталіся ў райаддзел, калі звярнулі ўвагу на аўтамабіль, які рухаўся павольна з выключанымі фарамі. Пры з'яўленні службовай машыны кіроўца ВАЗа яшчэ больш знізіў хуткасць. Міліцыянеры вярнуліся да падазронага аўтамабіля, з якога ў гэты момант збеглі ў розныя бакі два малады чалавекі, — расказала **прэс-афіцэр Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ.** — Аднаго з іх хутка дагналі. Прычына ўцёкаў была відавочная: у машыне была ўскрыта панэль, вывернуты і перакручаны паміж сабой правады запальвання.

Было ўстаноўлена, што два 18-гадовыя студэнты другога курса адной са сталічных ВНУ пасля сумеснага распіцця алкаголю пайшлі гуляць па раёне. Падчас шпацыру адзін з іх прапанаваў пакатацца на чужым аўто. Напачатку хлопцы трапілі ўнутр аднаго ВАЗа, аднак завесці яго не змаглі. Тое ж у іх не атрымалася зрабіць і з другой машынай. Ажыццявілі задуманае згоншчыкі толькі з трэцім ВАЗам.

Студэнтам пагражае да пяці гадоў пазбаўлення волі за згон аўтамабіля, заведзены крымінальныя справы і за спробу сагнаць яшчэ два. Кіроўца нападпітку можа быць пакараны яшчэ і за ваджэнне ў п'яным выглядзе.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*



■ Сітуацыя

# Не атакаваць першым і не перагінаць палку

## Што адносіцца да неабходнай абароны і якія сродкі самааховы найбольш эфектыўныя

**У дзяцінстве адным з галоўных бацькоўскіх урокаў з'яўляецца тлумачэнне правілаў паводзін у канфліктах. Што рабіць, калі цябе задзіраюць ці нават б'юць? Камусьці раілі адразу ж уцякаць, камусьці — ігнараваць крыўдзіцеля, а некаторым і наогул — не раздумваючы даваць здачы. Дзеці вырастаюць і адаптуюць тыя ж правілы да дарослага жыцця, аднак тут галоўную ролю адыгрываюць не асабістыя маральныя асновы, а закон. Пра тое, як варта сябе паводзіць у небяспечнай сітуацыі, каб захаваць сваё жыццё, не здзяйсняючы злачынства, расказаў начальнік арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС палкоўнік міліцыі Ігар ГАТАЛЬСКІ.**

Артыкулам 34 Крымінальнага кодэкса вызначана, што адносіцца да паняцця неабходная абарона. Гэта дзеянне, якое падразумявае прычыненне шкоды нападаючаму, але не з'яўляецца злачынствам, паколькі было накіравана на абарону жыцця, здароўя, правоў асобы, інтарэсаў грамадства або дзяржавы ад небяспечнага замаху. Аднак дапушчальныя межы гэтай шкоды — пытанне складанае. Адзінага алгарытму ў гэтай справе няма, усё залежыць ад канкрэтнай сітуацыі. Калі вам пагражаюць на словах, а вы адразу ж пускаеце ў ход кулакі, то неабходнай абаронай гэта з'яўляцца не будзе — дзейнічаць на апярэджанне тут не дарэчы. Але калі хтосьці падняў на вас руку з сапраўдным намерам ударыць, а не проста замахнуўся, знаходзячыся на кароткай адлегласці, вы маеце права, каб прадухіліць наступныя спробы, атакаваць нападніка. Але і ў гэтым выпадку не варта забываць, што біцца да перамогі — не выйсце: ваша задача — абараніць сябе, спыніць нападніка, а не пакараць вінаватага.

Ёсць катэгорыі грамадзян, якія першапачаткова знаходзяцца ў групе рызыкі, — гэта жанчыны і непаўналетнія, таму, калі раптам паўстала неабходнасць абараняцца ад іх, варта ўлічваць розніцу фізічных габарытаў і сіл, гэта значыць ступень прычынення шкоды павінна быць нязначнай. Дарэчы, неабходная абарона можа прымяняцца не толькі, каб захаваць сваё ўласнае жыццё і здароўе, але і каб дапамагчы іншым асобам. Калі чалавек быў уведзены ў зман, памылкова ўспрыняў абставіны канфлікту, дзеянні яго будуць ацэньвацца ў межах закона, аднак, калі ён паддаўся на правакацыю, ніякія паслабленні не прадугледжаны.

За 10 месяцаў бягучага года былі зарэгістраваны 3 выпадкі перавышэння межаў неабходнай абароны, якія прывялі да смерці, і 7 — да цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Так у Маладзечна паміж двума прыяцелямі, адзін з якіх быў асобай без пэўнага месца жыхарства, распачалася сварка. На той момант яны разам ужывалі спіртное ў гаражы. Бяздомны пачаў пагражаць прыяцелю нажом, за што быў збіты, аднак «гасцінны гаспадар» не разлічыў свае сілы, так што яго «праціўнік» неўзабаве памёр у бальніцы ад атрыманых траўмаў. Жыхарка Магілёўскага раёна, якая пакутавала ад хатняга гвалту, не проста дала адпор, а забіла свайго мужа. А ў Бабруйску канфлікт разгарэўся ў бары каля крамы: нечым раззлаваны мужчына кінуў у іншага крэсла. Пацярпеламу прыйшлі на дапамогу двое сяброў, яны збілі крыўдзіцеля, хоць маглі проста яго ўтрымаць.

Абарона лічыцца неабходнай, калі рэальная пагроза прысутнічае менавіта ў гэты канкрэтны момант часу. Падставай для яе не могуць быць злачынствы, шкода ад якіх мае адкладзены эфект, такія, як, напрыклад, хабарніцтва або незаконнае звальненне.

Калі ж вы не надта верыце ў свае ўласныя сілы, можна звярнуцца да спецыяльных, дазволеных заканадаўствам, сродкаў самаабароны. Да іх адносяцца газавыя пісталеты, газавыя балончыкі слёзатачывага і раздражняльнага дзеяння, электрашокавыя прылады і іскравыя разраднікі. Аднак усё не так проста: любыя прыстасаванні павінны адпавядаць пэўным параметрам, для таго каб, хутчэй, напалохаць нападніка, чым нанесці яму сур'ёзную шкоду.

Для набыцця газавай зброі неабходны адпаведны дазвол органаў унутраных спраў. Каб яго атрымаць, трэба прадаставіць медыцынскую даведку аб стане здароўя. Пастаноўка на ўлік у псіханеўралагічным дыспансеры выключае такую магчымасць, таксама як нязнятыя і непагашаныя судзімасці, прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці за шэраг правапарушэнняў. Не радзей разу ў год праводзіцца праверка ўмоў захоўвання, на адну асобу не можа быць зарэгістравана больш за дзве адзінкі газавай зброі, кожныя тры гады дазвол на захоўванне трэба падаўжаць.

| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | Лот № 1. UMT-02 универсальный станок с ЧПУ, включая инструмент для кручения ТТ-12, 20, 25 мм стоимостью 21437,75 рублей.<br>Лот 2. ТТ-10 инструмент для кручения 10 мм стоимостью 111,81 рублей.<br>Лот 3. ТТ-14 инструмент для кручения 14 мм стоимостью 111,81 рублей.<br>Лот 4. ТТ-16 инструмент для кручения 16 мм стоимостью 111,81 рублей.<br>Лот 5. RB-03 вальцовочный блок, включая 1 гладкий валец и 3 вальца со стандартным рисунком стоимостью 17479,68 рублей.<br>Лот 6. RR-301 валец диз.1 стоимостью 1118,09 рублей.<br>Лот 7. RR-327 валец диз.27 пол 40 мм стоимостью 1118,09 рублей.<br>Лот 8. RR-355 валец диз.55 кв. 10, 12, 14 мм стоимостью 1118,09 рублей.<br>Лот 9. RR-340 валец диз.40 пол 40 мм стоимостью 1878,40 рублей.<br>Лот 10. RR-377 валец диз.77 стоимостью 1878,40 рублей.<br>Лот 11. RDM-3 направляющая к RB-03, включая 2 вальца RHE-3 стоимостью 2638,72 рублей.<br>Лот 12. RP-3 комплект вальцов для трубы 30/40 мм стоимостью 1952,94 рублей.<br>Лот 13. RP-3 комплект вальцов для трубы 20/60 мм стоимостью 1952,94 рублей.<br>Лот 14. RP-3 комплект вальцов для трубы 80 мм стоимостью 1952,94 рублей.<br>Лот 15. RP-3 комплект вальцов для трубы 100 мм стоимостью 1952,94 рублей.<br>Лот 16. RPU-3 комплект вальцов для трубы 15/20 мм стоимостью 1624,91 рублей.<br>Лот 17. FB-02 кузнечный блок, включая 2 гладких вальца и 3 вальца с рисунком стоимостью 7453,99 рублей.<br>Лот 18. FR-201 комплект кузнечных вальцов с рисунком стоимостью 1162,87 рублей.<br>Лот 19. SMT-03 специальный станок ЧПУ, включая специальные штампы SD-2, 6, 14 стоимостью 14759,02 рублей.<br>Лот 20. SD-1 специальный штамп стоимостью 238,54 рублей.<br>Лот 21. SD-10 специальный штамп стоимостью 268,28 рублей.<br>Лот 22. SD-11 специальный штамп стоимостью 298,15 рублей.<br>Лот 23. SD-29 специальный штамп стоимостью 760,32 рублей.<br>Лот 24. SD-18 специальный штамп стоимостью 387,62 рублей.<br>Лот 25. SD-19 специальный штамп стоимостью 313,09 рублей.<br>Лот 26. SD-20 специальный штамп стоимостью 357,77 рублей.<br>Лот 27. SD-22 специальный штамп стоимостью 387,62 рублей.<br>Лот 28. SD-23 специальный штамп стоимостью 313,09 рублей.<br>Лот 29. SD-24 специальный штамп стоимостью 315,30 рублей.<br>Лот 30. HP-01 гидравлический пресс с ЧПУ, включая штамп HD-3 стоимостью 14609,94 рублей.<br>Лот 31. HD-2 штамп для гидравлического пресса стоимостью 357,77 рублей.<br>Лот 32. HD-5 штамп для гидравлического пресса стоимостью 357,77 рублей.<br>Лот 33. HD-41 штамп для гидравлического пресса стоимостью 2039,83 рублей.<br>Лот 34. ATE приспособление для плотной скрутки окончаний завитков стоимостью 4162,94 рублей.<br>Лот 35. HPB гидравлический блок для изготовления «корзинок», включая инструмент для «корзинок» ТВ-12, 16, 20, 25 мм, стоимостью 7257,37 рублей.<br>Лот 36. UBM универсальный гибочный станок 6383,11 рублей.<br>Лот 37. KB-02 дополнение к универсальному комплекту роликов стоимостью 360,80 рублей.<br>Лот 38. DMS устройство для изготовления спиралей стоимостью 1248,86 рублей.<br>Лот 39. FF-01 кузнечная печь стоимостью 416,29 рублей.<br>Лот 40. RedMIG 2800 K сварочный аппарат стоимостью 1686,05 рублей.<br>Лот 41. Угломер 80 см арт. 1102 стоимостью 3233,33 рублей.<br>Лот 42. Телефикс 5 м арт. 6805 стоимостью 277,19 рублей.<br>Лот 43. Покрасочный пистолет Ransburg №2-701 стоимостью 9524,81 рублей.<br>Лот 44. RR-355 валец диз.55 кв. 10, 12, 14 мм стоимостью 1040,71 рублей.<br>Лот 45. RR-355 валец диз.1 стоимостью 1040,71 рублей |
| **Собственник (владелец) имущества** | ООО «АСПром» (УНП 391502005) |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Витебск, ул. Ленинградская, 217/12-2, ком. 2 |
| **Наличие обременений** | Залог ЗАО «Цептер Банк» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 14.12.2016 в 11.00<br>г. Витебск, ул. Кирова, д. 16, каб. 11 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения Железнодорожного района г. Витебска<br>210001, г. Витебск, ул. Кирова, д. 16.<br>Судебный исполнитель Мухина Наталья Михайловна, тел./факс (80212) 63-64-76,<br>начальник отдела Зарецкая Елена Витальевна, тел. (80212) 60-84-42 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Железнодорожного района г. Витебска р/с № 3642903000328 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801635, УНП 300002505 **не позднее 11.00 12.12.2016 г.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 486 Гражданского процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |

**Уважаемые акционеры**

## ОАО «Белавтотехсервис»,

**07.12.2016 г. СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 2. Время начала собрания 15.00**
**Регистрация участников собрания будет проводиться с 14.00 до 14.45 07.12.2016 г.**

**Повестка дня:**

1. О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Белавтотехсервис».
2. Об утверждении Положения о наблюдательном совете ОАО «Белавтотехсервис».

УНП 100003090

**8 декабря 2016 года в 10.00 в актовом зале общества**
**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «Вишневка–2010»

**С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

1. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Вишневка-2010».

Регистрация участников внеочередного общего собрания акционеров будет осуществляться 8 декабря 2016 года с 09.00 до 09.45 по месту проведения собрания. Для регистрации необходимо иметь при себе акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по месту нахождения общества (Минский район, а.г. Вишневка, ул. Центральная, д. 1А) с 08.00 до 17.00 с 27 ноября по 7 декабря 2016 года. УНП 600041880

## Ликвидатор УП «Брестская мебельная фабрика» – ООО «Центр правовых услуг» проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества Унитарного предприятия «Брестская мебельная фабрика»

| № лота | Наименование | Ед. изм. | Кол-во | Начальная стоимость предмета торгов без НДС, бел. руб. | Ставка НДС, % | Сумма НДС, бел. руб. | Цена предмета торгов с НДС, бел. руб. | Сумма шага аукциона в размере 5%, бел. руб. | Размер задатка за участие в аукционе 10%, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 100/С78148, площадью 12070,2 кв.м, наименование – главный корпус, назначение – здание неустановленного назначения; находящееся на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029350 площадью 0,8928 га по адресу: г. Брест, ул. Краснознаменная, 4. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель – земельные участки, находящиеся:<br>в водоохранной зоне водного объекта, код 4,1, площадь – 0,8928 га,<br>в охранной зоне линий электропередачи, код 13,2, площадь – 0,0168 га,<br>в охранной зоне сетей и сооружений водоснабжения, код 13,4, площадь – 0,2047 га,<br>в охранной зоне сетей и сооружений канализации, код 13,5, площадь – 0,1721 га,<br>в охранной зоне сетей и сооружений теплоснабжения, код 13,6, площадь – 0,0140 га | шт. | 1 | 2568858,60 | 20 | 513771,72 | 3082630,32 | 154131,52 | 308263,03 |
| **2** | Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-78151, площадью 1671,7 кв.м, наименование – ремонтно-механический цех, назначение – здание неустановленного назначения; находящееся на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029344 площадью 0,3886 га по адресу: г. Брест, ул. Краснознаменная, 6. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель – земельные участки, находящиеся:<br>в водоохранной зоне водного объекта, код 4,1, площадь – 0,3886 га,<br>в охранной зоне сетей и сооружений водоснабжения, код 13,4, площадь – 0,1390 га,<br>в охранной зоне сетей и сооружений канализации, код 13,5, площадь – 0,1350 га,<br>в охранной зоне сетей и сооружений теплоснабжения, код 13,6, площадь – 0,0750 га | шт. | 1 | 839226,30 | 20 | 167845,3 | 1007071,56 | 50353,58 | 100707,16 |
| **3** | Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-78152, площадью 5604,4 кв.м, наименование – вспомогательный корпус и тепловой пункт, назначение – здание неустановленного назначения; находящееся на земельных участках с кадастровыми номерами 140100000001029351 и 140100000001029352 общей площадью 0,676 га по адресу: г. Брест, ул. Краснознаменная, 4В. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель – земельные участки, находящиеся:<br>в водоохранной зоне водного объекта, код 4,1, площадь – 0,676 га,<br>в охранной зоне линии связи и радиофикации, код 13,1, площадь – 0,0035 га,<br>в охранной зоне линий электропередачи, код 13,2, площадь – 0,0316 га,<br>в охранной зоне сетей и сооружений водоснабжения, код 13,4, площадь – 0,1585 га,<br>в охранной зоне сетей и сооружений канализации, код 13,5, площадь – 0,2308 га,<br>в охранной зоне сетей и сооружений теплоснабжения, код 13,6, площадь – 0,2125 га | шт. | 1 | 1185626,50 | 20 | 237125,3 | 1422751,80 | 71137,59 | 142275,18 |
| | **Итого:** | | **3** | **4593711,40** | | **918742,28** | **5512453,68** | **275622,68** | **551245,37** |

**Аукцион состоится 27 декабря 2016 года в 10 часов 00 минут по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203**

Заявления на участие в аукционе с приложением копий свидетельств о государственной регистрации, доверенностей, выданных представителю (для юридических лиц и ИП) или копий паспортов (для физических лиц), заверенных банком документов, подтверждающих внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет УП «Брестская мебельная фабрика», принимаются с момента опубликования настоящего извещения по **26 декабря 2016 года** до 16.30 по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203.

Шаг аукциона равен пяти процентам от начальной цены имущества. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10 (десяти) дней с даты проведения торгов. Победитель аукциона обязан оплатить предмет торгов в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее пятнадцати банковских дней с момента заключения договора. Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением торгов в части оплаты объявления о проведении торгов и оценки предмета торгов в течение 5 дней с даты проведения торгов.

*Размер задатка для участия в аукционе составляет 10% от начальной цены имущества и перечисляется на расчетный счет УП «Брестская мебельная фабрика» №3012440572034 в дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Брестской области, код 153001739, УНП 200274176 в срок до 26 декабря 2016 года.*

Победителем аукциона признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за лот.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Результаты по проведению торгов оформляются протоколами.

**Сведения об организаторе торгов:** ООО «Центр правовых услуг», адрес: 224000, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203, контактный телефон 80162-33-93-88.

**Сведения о продавце:** Унитарное производственное предприятие «Брестская мебельная фабрика», юридический адрес: г. Брест, ул. Краснознаменная, 2, контактный телефон 80162-33-93-88.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения при продаже имущества должника на аукционе – в любое время, но не позднее чем за три дней до наступления даты его проведения.

Иную информацию о порядке и условиях проведения торгов, ознакомлении с предметом торгов можно получить в рабочие дни с 9.00 до 16.30 по адресу: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203, тел./факс 80162-33-93-88.

Наш культурны асяродак
# Жырандоля
Выпуск № 43 (343)





У цэнтры — Заза Урушадзэ.

■ Падзея месяца

# ТЫДНЁВЫ КІНАФЕСТЫВАЛЬ «ЛІСТАПАД» НАСАМРЭЧ ПРАЦЯГНЕЦЦА НА ЎСЁ ВАША ЖЫЦЦЁ

**Для каманды «Лістапада» праца над стварэннем праграмы, фарміраваннем журы, запрашэннем гасцей і арганізацыяй мерапрыемстваў ідзе цэлы год. Аматары фестывальнага кіно, што сочаць за галоўнай кінападзеяй года, атрымліваюць першыя весткі за два-тры месяцы да пачатку форуму. Фактычна «Лістапад» доўжыцца восем дзён, але з тымі, хто яго датычны, фестываль застаецца назаўсёды, бо не можа прайсці бясследна.**

Сёлета на форуме паказалі больш за 160 карцін, з якіх каля 80 былі конкурснымі. Ён гасцінна прыняў канадскага рэжысёра Дэні Катэ, генеральнага сакратара міжнароднай федэрацыі кінапрэсы ФІПРЭССІ Клауса Эдэра, адборшчыка кінафестывалю ў Сан-Себасцьяне Рабэрта Куэта, наміната на Оскар грузінскага рэжысёра Заза Урушадзэ, польскага рэжысёра Паўла Лазінскага, аўтараў, прадзюсараў і акцёраў фільмаў, што паказваліся на мінскіх пляцоўках. Форум распахова правёў мерапрыемствы Індустрыяльнай платформы, прызначанай ствараць у краіне адпаведны кантэкст — кініндустрыю. У рэшце рэшт, арганізаваў гледачу ўсе ўмовы для пашырэння свядомасці. Натуральна, «Лістапад» — не проста падзея месяца, гэта важная частка жыцця.

Так не па-лістападаўску падчас фестывалю выпаў снег. Гэта было вельмі прыгожа: мы абмяркоўвалі стужкі, якія толькі што паглядзелі, а на праспект Незалежнасці за акном падалі пушыстыя сняжынішчы. Дарэчы, Дэні Катэ нечым нагадвае Санта-Клауса, так у мяне ўвогуле склаўся чароўны калядны настрой. Падарункамі ў такім выпадку было, канешне ж, кіно. Вялікія вокны бара гасцініцы «Мінск» — пляцоўкі фестывальных вечароў, умоўнага «месца сустрэчы, якое змяніць нельга», куды вялі ўсе дарогі, — выходзяць на Плошчу Незалежнасці, і ў такое надвор'е гасцям адкрывалася цудоўнае відовішча. Пасля абмеркавання фільмаў, сусветнай кініндустрыі, прэзідэнцкіх выбараў у ЗША некаторыя фестывальныя госці выкарыстоўвалі магчымасць упершыню за шмат гадоў прагуляцца пад снегам. Ухутаны вартаўнік каля Дома ўрада жартаўліва раіў ім сядзець у такі час у кватэры, але ён жа разумеў, што для некаторых гэта — падзея.

**Больш за ўсіх, як звычайна, працавала журы кінапрэсы, бо з раніцы да вечара глядзела два конкурсы ігравога кіно, з якога павінна было выбраць уладальніка «Срэбра Лістапада».**

Асноўны конкурс ігравога кіно і «Маладосць на маршы» паказваліся ў кінатэатры «Цэнтральны». Тут тусаваліся журы першай праграмы на чале з сур'ёзным, прадстаўнічым Зазам Урушадзэ і «рокеры» — журы «Маладосці» з Дэні Катэ ў якасці старшыні. Асноўны конкурс дакументальнага кіно дэманстраваўся ў «Міры», яго ацэншчыкі — у асноўным практыкуючыя кінематаграфісты — увесь час імкнуліся пераманціраваць конкурснае кіно і актыўна абмяркоўвалі, як яно зроблена. Напэўна, у польскай карціне «Прычасце» Ганны Замецкай і нямецкім «Аўстэрліц» Сяргея Лазніцы ўсё было на сваім месцы, таму яны аказаліся ў фаварытах. Больш за ўсіх, як звычайна, працавала журы кінапрэсы, бо з раніцы да вечара глядзела два конкурсы ігравога кіно, з якога павінна было выбраць уладальніка «Срэбра Лістапада». І прызначыла яго карціне «Мімозы» Олівера Лакса — другой рабоце француза, які ўжо дзесяць гадоў жыве ў Мароке.

**Гэта было вельмі прыгожа: мы абмяркоўвалі стужкі, якія толькі што паглядзелі, а на праспект Незалежнасці за акном падалі пушыстыя сняжынішчы.**

Золата між тым было заслужана аддадзена карціне «Лілі Лейн», знятай у капрадукцыі Венгрыі, Германіі і Францыі. Дзіўны аповед пра стасункі Рэбекі са сваім сынам праз візуалізаваную падсвядомасць, мерны голас у скайпе, сумеснае баўленне часу. І геаграфічна, і па сутнасці фільм выбіваецца з праграмы Асноўнага конкурсу ігравога кіно, якія з большага канцэнтруецца на чалавеку ў сістэме. Калі ў «Лілі Лейн» і ёсць нейкая сістэма, то гэта чароўны свет вобразаў, у якіх жывуць ці то маці, ці то сын, ці то яны абодва. Назва — гэта проста вуліца, звязаная з падзеямі ці здымкамі, але яна так пасуе магічнай атмасферы на экране. Бацька, з якім галоўная гераіня не жыве, аб'яўляецца толькі ў якасці голаса, памерлая бабуля існуе як прах у скрыні і пакінуты ў спадчыну дом. Апроч маці, сына і казкі, у якой Рэбека насамрэч распавядае гісторыю свайго жыцця, — больш нічога.

І ў каментарыях журналістам, і ў кулуарных размовах госці характарызавалі конкурсныя праграмы «Лістапада» адназначна — як вынік высакаякаснага, сістэмнага, прафесійнага адбору. Ды нам гэта ўжо даўно вядома — Мінскі кінафестываль становіцца ў пэўным сэнсе гарантам якасці. Так, ён не прапануе дарагіх цырымоній, Катрын Дэнёў, зорную чырвоную дарожку — замест гэтага застаецца, можна сказаць, чыстае мастацтва, пэўны абсалют, ад якога гучныя імёны не адцягнуць. Гэта вельмі камерная тусоўка, дзе абмяркоўваецца, вядома ж, сапраўднае мастацтва кіно і завязваюцца хутчэй моцныя сяброўскія сувязі, чым заключаюцца кантракты. У душы «Лістапада» маецца свой жанр.

І нельга без лыжкі дзёгцю: адкрыццё і закрыццё фестывалю выяўляюць, што цырымоніямі і кіно на «Лістападзе» займаюцца дыяметральна розныя людзі. Абавязковыя рытуалы так моцна дысануюць з інтэлектуальнай кінапраграмай, што аказваюцца на процілеглым полюсе пачуцця густу.

Тым не менш лыжка дзёгцю — адна, цырымоніі забудуцца, а кіно застанецца, бо, паўтаруся, «Лістапад» — гэта свята, якое заўсёды з табой.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by
■

# Мікалай ЧАРГІНЕЦ:

# «ПІСЬМЕННІЦТВА СТАЛА МОДНЫМ»

**Беларускае грамадства заўсёды з павагай і піетэтам ставілася да асобы пісьменніка. Нашы класікі — Купала, Колас, Караткевіч, Быкаў, Шамякін — былі фактычна зоркамі ў свой час. Іх пазнавалі на вуліцы, запрашалі на радыё і тэлебачанне, чыталі іх новыя творы. А як у наш час пісьменнік пачуваецца ў грамадстве? Якімі клопатамі жыве? Ці бачыць цікавасць да сваёй асобы і працы? Пра гэта і многае іншае ў інтэрв'ю «Звяздзе» расказаў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, аўтар многіх раманаў Мікалай ЧАРГІНЕЦ.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## ПРА ЎВАГУ І АЎТАРЫТЭТ

— Калі зазірнуць у гісторыю, то можна заўважыць, што пісьменнікі заўсёды знаходзіліся ў цэнтры ўвагі грамадства. І ў часы Савецкага Саюза ні адно ўрачыстае пасяджэнне не адбывалася без прысутнасці пісьменнікаў. Самыя паважаныя аўтары сядзелі побач з кіраўніцтвам краіны. Гэта ўздымала аўтарытэт іх асоб у вачах чытачоў. Вага меркавання творцы яшчэ большая, калі дадаць павышаную ўвагу да кнігі ў цэлым. Пасля таго як Савецкі Саюз спыніў існаванне, змяніліся многія ўмовы жыцця. Некаторы час аўтары знаходзіліся ў разгубленасці. Складана было ўспрымаць новае, адчувалі шкадаванне па старому. Магчыма, з гэтай прычыны пісьменнікі прыкладна на дзесяцігоддзе сышлі з арэны актыўнай працы. Выдаваліся асобныя кнігі, вывучалася гісторыя, але было цяжка казаць пра сучаснасць. З моманту заснавання Саюза пісьменнікаў Беларусі мы працуем на тое, каб развіваць таленты, жаданне да творчасці.

## ПРА ТАЛЕНТЫ І ЗАПАТРАБАВАННІ

— Я не хачу сказаць, што ўвесь саюз — каманда толькі надзвычай таленавітых людзей. Нас аб'ядноўвае жаданне пісаць, а вось які вынік гэтай працы? Не ўсе настолькі таленавітыя, як ім хацелася б быць. Часта пісьменнікі патрабуюць асаблівых ільгот, увагі. Часцей так робяць тыя, хто пакуль не мае ніякіх дасягненняў у літаратуры. А некаторыя нават лічаць, што, проста ўступіўшы ў саюз, маюць права называцца талентам. Былі выпадкі, калі, атрымаўшы членскі білет саюза, пісьменнікі адразу ж задавалі пытанні: а што я з гэтага атрымаю? За 10 гадоў працы мы не прынялі ў творчую суполку каля 700 чалавек. Можна нават сказаць, што пісьменніцтва стала модным. Многія прадстаўнікі старэйшага пакалення сталі пісаць. Некаторыя лічаць, што чытачу будзе цікава прачытаць пра іх жыццё. Ды гэта не так. Трэба быць рэалістамі. Так, твор, магчыма, прачытаюць сваякі і знаёмыя аўтара. Але ж наклад кніг — сотні, тысячы асобнікаў. Каб не пакутаваў выдавец, яны павінны быць прададзенымі. Адразу ж узнікаюць і пытанні фінансавыя, у многіх выпадках яны маюць дачыненне да дзяржаўнага бюджэту. Таму перад намі стаіць задача не адштурхоўваць натхнёных людзей ад творчасці, але нейкім чынам сувымяраць іх творы з запатрабаванасцю ў грамадстве. Мы вітаем выданне рэгіянальнай літаратуры. Гэта ж вельмі цікава, калі аўтар піша пра сваю родную вёску, горад. Калі твор мацнейшы — стараемся, каб ён быў выдадзены на рэспубліканскім узроўні.

## ПРА ПАДТРЫМКУ І ФІНАНСАВАННЕ

— Лічу, што мы, члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, знаходзімся ў лепшым становішчы, чым творцы ў іншых краінах. Адчуваем клопат кіраўніка дзяржавы, Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, які ўказам падтрымаў саюз. У нас ёсць будынак — Дом літаратара. Таксама атрымліваем пэўную дапамогу з дзяржаўнага бюджэту. Мы стварылі літаратурны фонд, які можа выдаваць кнігі, удзельнічаць у сумесных праграмах і атрымліваць прыбытак. Натуральна, і самі стараемся знайсці сродкі, прыцягнуць спонсараў. З іх падтрымкай змаглі набыць мікрааўтобус, наняць вадзіцеля і бухгалтара. Спонсарскія сродкі дапамагаюць арганізоўваць камандзіроўкі, семінары для маладых аўтараў, конкурсы для дзяцей.

## ПРА МОЛАДЗЬ І ПЕРАЕМНАСЦЬ

— У нашай краіне створана цэлая сетка літаратурных аб'яднанняў, творчых гурткоў. Амаль усе іх узначальваюць пісьменнікі — члены саюза. Вопытныя творцы могуць падказаць маладым, як варта працаваць. І плён гэтай дзейнасці відавочны. Толькі за некалькі апошніх месяцаў сябрамі нашай суполкі сталі каля 30 маладых пісьменнікаў. Згадаю такія яркія імёны, як Кацярына Массэ, Маргарыта Латышкевіч, Адам Шостак, Людміла Клачко, Дзмітрый Саўчык, Сяргей Клімковіч. А аўтарка з Гомеля Марыя Маліноўская па рэкамендацыі саюза цяпер з'яўляецца студэнткай Літаратурнага інстытута імя Горкага ў Маскве. Мы стараемся падтрымліваць таленавітых маладых творцаў, выдаць першыя кнігі. Хай кніжка і маленькая, але так мы выказваем сваю ўвагу і падтрымку.

**«Спадзяюся, навукоўцы будуць больш увагі надаваць асэнсаванню творчасці сучасных пісьменнікаў. Так, важна вывучаць класікаў, але часам варта і выходзіць з архіваў».**

## ПРА ТЭМЫ І ЖАНРЫ

— Нам удалося ўсхаляхнуць той пласт літаратуры, які раней заставаўся па-за ўвагай шырокага чытача. Напрыклад, актыўна развіваем краязнаўчую тэматыку. У гэтым кірунку выдатна працуе старшыня Мінскага абласнога аддзялення саюза Алесь Карлюкевіч. Таксама шмат увагі надаём гістарычнай тэме, даследуем лёсы выхадцаў з Беларусі, якія ўнеслі вялікі ўклад у развіццё іншых краін. Тут адзначу Валерыя Чудава. А вось пісьменнік, кандыдат гістарычных навук Барыс Далгатовіч ужо некалькі кніг выдаў пра ваенных адміралаў, якія паходзяць з нашай краіны. Анатоль Матвіенка і Вячаслаў Бандарэнка звяртаюць увагу на тэму Першай сусветнай вайны. Варта таксама згадаць выдатныя раманы акадэміка Уладзіміра Гніламёдава, надзвычай цікавы двухтомнік «Шапка манамаха» Мікалая Ільінскага. Творцы звярнулі больш увагі на жанр песні, і гэтая праца ўжо дала плён: калектыў у складзе паэта Івана Юркіна, кампазітара Алега Елісеенкава і выканаўцы Анатоля Ярмоленкі сёлета адзначаны прэміяй Саюзнай Дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва.

**«За 2,5 гады творы прыкладна паўсотні аўтараў былі запатрабаваныя больш як 2,5 мільёна разоў».**

## ПРА ВЫДАННІ І ГАНАРАРЫ

— Сёння аўтару досыць цяжка выдаць кнігу. Мы ўдзячныя міністру інфармацыі Ліліі Ананіч за падтрымку найлепшых твораў нашых пісьменнікаў, іх фінансаванне. Яны зазвычай выходзяць у дзяржаўных выдавецтвах і распаўсюджваюцца на рэспубліканскім узроўні. Дапамагаюць і камерцыйныя выдавецтвы «Харвест», «Чатыры чвэрці», дзе мы рыхтуем серыі «Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі», «Асоба і час», «Мінскія маладыя галасы», дзіцячыя кнігі, дэтэктывы. Не так даўно міністр інфармацыі прыняла рашэнне ў два разы павысіць аўтарскі ганарар пры выданні кнігі. Гэта надзвычай важна. Сёння пісьменнік часта знаходзіцца ў вельмі складаным фінансавым становішчы. Калі пойдзе на пенсію, то будзе атрымліваць проста мізэрныя грошы. Многія лічаць, што пісьменнік — гэта не прафесія. Але ж яго праца складаная і высокаінтэлектуальная, яе цяжка спалучаць з нейкай іншай дзейнасцю. У рэчаіснасці, бывае, атрымліваецца так: раз на 4—5 гадоў аўтар выдае кнігу, якая аплачваецца ганарарам. Сума грашовай узнагароды часам не перавышае 800 рублёў. Як за іх пражыць 5 гадоў, пры гэтым выплачваць унёскі ў пенсійны фонд? Гэта ж немагчыма!

## ПРА ПРЭМІІ І СЦІПЛАСЦЬ

— Мне падаецца, што для Беларусі мала толькі адной літаратурнай прэміі. Варта заснаваць прэміі ў розных галінах: паэзіі, дзіцячай літаратуры, прозе, каб самі пісьменнікі бачылі, што цікавасць да іх творчасці ёсць і праца ацэньваецца высока. Калі казаць пра Нацыянальную літаратурную прэмію, то яна выклікае шмат увагі і разам з тым раздражнення, зайздрасці многіх аўтараў — перадусім тых, хто не быў узнагароджаны. Але гэта хутчэй пытанне сціпласці пісьменнікаў, адэкватнай ацэнкі сябе і сваёй творчасці. Таму я лічу, што журы прэміі варта фарміраваць з асоб, якія не з'яўляюцца членамі нашага саюза. Узнаўлены акадэмічны Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы, дзе працуюць выдатныя навукоўцы. Менавіта яны могуць даць адэкватную ацэнку творам — прэтэндэнтам на прэмію.

**«Кнігі сучасных беларускіх аўтараў перакладзеныя больш як на паўтара дзясятка моў свету. І гэта сведчыць, што нашых творцаў ведаюць у свеце, сочаць за іх працай».**

## ПРА КРЫТЫКАЎ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎЦАЎ

— У беларускай літаратурнай прасторы мала сапраўды добрых крытыкаў. Я сёння выпадкова натрапіў на стары матэрыял Уладзіміра Гніламёдава пра свае кнігі. Там столькі разважанняў, нямала і сапраўды крытычных заўваг. Я іх і сёння, і ў той час, калі тэкст быў напісаны, успрыняў спакойна — гэта ж парады ад вопытнага даследчыка. Часам мяне крытыкаваў і Васіль Быкаў. Я ўлічваў яго заўвагі, прыслухоўваўся. Спадзяюся, што ўзнаўленне Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы, якім сёння кіруе прафесар, доктар філалагічных навук, пісьменнік Іван Саверчанка дапаможа развіццю крытыкі. Таксама спадзяюся, што нашы навукоўцы будуць больш увагі ўдзяляць асэнсаванню творчасці сучасных пісьменнікаў. Так, нам важна вывучаць класікаў, але часам варта і выходзіць з архіваў.

## ПРА ПУБЛІЧНАСЦЬ І ПРЫСУТНАСЦЬ У СМІ

— Хочацца, каб пісьменнікі часцей з'яўляліся на старонках друкаваных СМІ, каб іх часцей запрашалі на тэлебачанне. Аўтараў трэба ведаць у твар. Можна нават такую цікавую праграму зладзіць «Пісьменнік і чытач», у якой творца адказваў бы на пытанні прысутных. Развагі вядомага аўтара могуць тычыцца не толькі пісьменніцкіх спраў, кніг, але і яго поглядаў на падзеі ў свеце палітыкі, сацыяльным жыцці, стаўлення да з'яў у грамадстве. У нас ёсць творцы, якія з задавальненнем выказаліся б на розныя тэмы. Так, ёсць аўтары, якія адасабляюцца ад грамадства і палітыкі. Але мне падаецца, што кожнаму пісьменніку варта займацца самаадукацыяй, цікавіцца рознымі тэмамі, актуаліямі нашага жыцця, даваць адказы маладому пакаленню.

## ПРА ЦІКАВАСЦЬ І ЗАПАТРАБАВАНАСЦЬ

— Шкада, што многія чыноўнікі не ўспрымаюць кнігу, літаратуру, не разумеюць клопаты пісьменнікаў. Горка чуць, калі нехта кажа, што яму няма калі чытаць кнігі. Нават наш Прэзідэнт знаходзіць магчымасць чытаць. Кнігі сучасных беларускіх аўтараў перакладзеныя больш як на паўтара дзясятка моў свету. І гэта сведчыць, што нашых творцаў ведаюць у свеце, сочаць за іх працай. Скептыкі кажуць: а хто вас чытае? Каб адказаць на гэтае пытанне, мы час ад часу праводзім даследаванні ў бібліятэках, распрацоўваем спецыяльныя анкеты, дзе пытаемся, колькі разоў кнігі членаў нашага саюза выдаваліся чытачам. І атрымалася, што за 2,5 гады творы прыкладна паўсотні аўтараў былі запатрабаваныя больш як 2,5 мільёна разоў. На пытанне скептыкаў пра тое, ці чытаюць, мы такім чынам адказалі.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

■ Фестывалім!

# БЕЛАРУСЬ ЯК АДКРЫЦЦЁ

## На міжнародны фестываль «JAZZinMinsk-2016» завітала амаль 100 замежных музыкаў

**Гэтымі днямі беларуская сталіца стала сусветнай сталіцай джаза. Міжнародны джазававы фестываль «JAZZinMinsk-2016» ужо пяты раз збірае на сваіх пляцоўках сусветных зорак, якія прыязджаюць з-за акіяна. Яны не толькі дзеляцца сваёй яскравай музычнай творчасцю, але і адкрываюць для сябе Беларусь.**



Яўген УЛАДЗІМІРАЎ з амерыканскай спявачкай Сігі ДЭВІС на адным з джазавых фестываляў у Мінску.

За чатыры дні амаль 100 музыкаў з розных краін выступяць на мінскіх пляцоўках — у Палацы прафсаюзаў і Палацы Рэспублікі. На канцэрт-адкрыццё білеты былі раскуплены задоўга да яго пачатку.

**Адзін з самых вядомых джазменаў краіны, мастацкі кіраўнік фестывалю «JAZZinMinsk-2016» Яўген УЛАДЗІМІРАЎ** адзначае:

— Прыемна, што джаз запатрабаваны ўсюды і заўсёды. Ён, як лакмусавая паперка, сведчыць пра развіццё краіны. Хаця б раз на год Мінск робіцца сталіцай сусветнага джаза. Наш фестываль падымае рэйтынг горада на надзвычай высокі ўзровень. Натуральна, вельмі прыемна, што сюды прыязджаюць вялікія музыкі сусветнага ўзроўню — шматразовыя ўладальнікі прэміі Грэмі. Яны з першага погляду пачынаюць любіць горад. Калі замежныя выканаўцы выступаюць перад нашай аўдыторыяй, то ўсе як адзін адзначаюць, што самая падрыхтаваная, душэўная і выхаваная публіка менавіта ў Мінску. Ганарымся, што знакавыя музыкі джаза, блюза, вяртаючыся дадому, дзеляцца самымі станоўчымі водгукамі пра нашу краіну.

Варта адзначыць, што Яўген Уладзіміраў узнагароджаны дыпломам ЮНЕСКА за значны ўклад у развіццё беларускага джаза.

За пяць гадоў існавання фестывалю яго наведала ўжо больш як трыццаць тысяч слухачоў. Сюды прыязджалі музыкі, якія прадстаўлялі не толькі класічны джаз, але і фактычна ўсе сучасныя музычныя кірункі (акрамя хіба рока і шансона). Сёлета адкрываў фестываль легендарны біг-бэнд Раймонда Паўлса. Спецыяльнымі гасцямі аркестра сталі амерыканскія зоркі — галівудскі спявак Фрэд Такс і сусветна вядомы трубач Рональд Бэйкер.

Учора на сцэне Палаца прафсаюзаў можна было пачуць каралеву блюза Анджэлу Браўн. Гэта легендарная выканаўца ўжо пры жыцці ўнесена ў Кнігу рэкордаў Гінеса і Залу славы блюза. А сёння ў беларускай сталіцы выступае саксафаніст Гэры Уігінс, які, як лічыцца, працягвае традыцыі рок-н-рола ў джазе пасля Элвіса Прэслі. Завершыцца фестываль у нядзелю выступленнем гасцей з Арменіі.

— Чатыры дні ў Мінску знаходзяцца вядомыя музыкі — многія з іх прыехалі да нас упершыню, — заўважае **старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва, адзін з галоўных арганізатараў фестывалю «JAZZinMinsk-2016» Уладзімір КАРАГІН.** — Удзельнікі мінулых фестываляў казалі мне, што Беларусь стала для іх адкрыццём. Яны вярнуліся дадому ў Вашынгтон, Нью-Ёрк, Флорыду, Сан-Францыска, Лондан і распаўсюдзілі пра нас надзвычай станоўчую інфармацыю — пра дабрыню і добразычлівасць нашых людзей, прыгажосць і сучаснасць горада і краіны. Гэта спрыяе ўмацаванню бізнес-стасункаў. Канфедэрацыя прадпрымальніцтва атрымлівае дзясяткі прапаноў накіраваць дзелавыя дэлегацыі. Часам мы пытаемся, адкуль яны даведаліся пра нас?.. Чуем у адказ, што ім распавялі пра гэта джазавыя музыканты.

На будучы год джазавы фестываль у Мінску ўжо атрымаў афіцыйную падтрымку кіраўніцтва горада. Таксама ён папоўніцца яшчэ адным, пятым днём — будзе гучаць дзіцячы джаз, а таксама пройдзе міжнародны дзіцячы джазавы конкурс.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

# ТЭАТР БАГАТЫХ ТРАДЫЦЫЙ І ЭКСПЕРЫМЕНТАЎ

**Першыя акцёры скончылі курс знакамітага Маскоўскага мастацкага акадэмічнага тэатра.**

Нацыянальнаму акадэмічнаму драматычнаму тэатру імя Якуба Коласа, аднаму з найстарэйшых у рэспубліцы, споўнілася 90 гадоў.

Галоўныя святочныя падзеі адбыліся на гэтым тыдні. Афіцыйна 21 лістапада — дзень нараджэння тэатра. Калектыў атрымаў віншаванне ад Прэзідэнта краіны. **Першы намеснік міністра культуры Беларусі Ірына ДРЫГА** падкрэсліла, што тэатр імя Якуба Коласа — адзіны нацыянальны калектыў, які працуе ў абласным цэнтры.

У тэатры сярод іншых дзясяткі гадоў служаць мастацтву два народныя артысты.

Адзін з іх — **старэйшы акцёр Тадэвуш КОКШТЫС — народны артыст БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.** Ён узнагароджаны ордэнамі Францыска Скарыны, «Знак Пашаны», медалём «Ветэран працы»... У Коласаўскім тэатры — з 1958-га года. Тут сыграў больш за 150 роляў. З цеплынёй успамінае, як яго, маладога акцёра, шчыра прынялі ў калектыве. Сярод карыфеяў, якія з бацькоўскім клопатам адносіліся да навічка, быў і легендарны народны артыст СССР Аляксандр Канстанцінавіч Ільінскі.

— Ён быў прафесіяналам з вялікай літары. І шмат чаму я ў гэтага творчага чалавека навучыўся. У прыватнасці, як я часта гавару журналістам, «хадзіць па сцэне». З першага дня віцебскі тэатр мне здаўся вельмі цёплым, гасцінным. Мяне і яшчэ двух выпускнікоў інстытута сустрэлі вельмі добра, — успамінае Тадэвуш Антонавіч.

**Святлана АКРУЖНАЯ — народная артыстка Беларусі.** Узнагароджаная ордэнам Францыска Скарыны, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне». У тэатры — з 1969 года.

— Коласаўскі ўваходзіў у дзясятку лепшых тэатраў СССР. І дзе б мы ні выступалі, былі аншлагі. Добра памятаю, як пасля спектакля «Улада цемры» падчас гастроляў у Маскве нас чакалі гледачы, каб пазнаёміцца. І вялікія кошыкі кветак дарылі... У Маскве крытыкі сказалі, што гэты спектакль — адзін з найлепшых. Добра ўспрымалі і спектаклі «Зацюканы апостал», «Таблетка пад язык», «Клоп»... Традыцыі ў Коласаўскага тэатра выдатныя, бо рабілі пастаноўкі розных жанраў і высокага ўзроўню, — распавядае актрыса.

**Доктар мастацтвазнаўства, прафесар Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава Таццяна КАТОВІЧ** лічыць адкрыццё тэатра ў лістападзе 1926 года апошнім акордам «Віцебскага рэнесансу».

— У 1926-м у Віцебску адкрыты БДТ-2 (Другі Беларускі Дзяржаўны тэатр) на базе выпускнога курса Беларускай драматычнай студыі пры Маскоўскім мастацкім акадэмічным тэатры. Уявіце, у правінцыю прыехалі творчыя людзі, якія чулі і чыталі пра тое, што тут адбывалася ў пачатку 1920-х. Я пра дзейнасць Шагала, Малевіча і іншых, якія эксперыментавалі... І нават, калі сітуацыя ў горадзе кардынальна змянілася, прайшоў час творчай свабоды, дух, энергетыка эксперыментаў, думаю, не зніклі. І трупа адчула гэта. У выніку і ў тэатры таксама былі творчыя пошукі, якія апярэджвалі час, — разважае мастацтвазнаўца.

Падчас святкавання юбілею адбылася навукова-практычная канферэнцыя «Беларускі нацыянальны тэатр: традыцыі, пошук, эксперымент». Была прэзентавана кніга, прысвечаная гісторыі тэатра. У Віцебскім абласным краязнаўчым музеі праходзіць тэматычная выстава.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

## Ён сябраваў з Шастаковічам

**Міжнародны музычны фэст імя вядомага мастацтвазнаўца, тэатральнага і музычнага крытыка Івана Іванавіча Салярцінскага 28-ы раз адбудзецца ў Віцебску. Салярцінскі тут нарадзіўся ў 1902 годзе (памёр у 1944-м у Новасібірску). У абласным цэнтры яму ўсталявалі помнік, музычнае вучылішча носіць яго імя.**

Да 110-годдзя з дня нараджэння Д. Шастаковіча, з якім Салярцінскі сябраваў, прымеркаваная канцэртная праграма адкрыцця фэсту. Яе можна будзе наведаць 3 снежня.

Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскай абласной філармоніі, у культурным праекце возьмуць удзел музыканты, тэарэтыкі з Беларусі, Ізраіля, Расіі, Латвіі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■ Нота душы

# «ДАЛОНЯЎ ЦЁПЛЫХ ДРОГКАЕ КРАНАННЕ...»

**Нехта скажа, што літаратурнае жыццё віруе адно ў сталіцы. Толькі тут ёсць і тусоўка, і вечарыны, і магчымасць чытачам ледзь не штодзень сустракацца з пісьменнікамі, а творцам — выходзіць да публікі. Але прыклад паэткі з Піншчыны Марыі КОБЕЦ даказвае зусім адваротнае: можна быць і жыць у літаратуры, нават жывучы ў вёсачцы на Палессі. Яна актыўна друкуецца ў літаратурна-мастацкіх выданнях, выступае на творчых вечарынах, а не так даўно прадставіла сваю другую кнігу вершаў «Пальновая квецень». Марыю Кобец як паэтку хвалююць розныя аспекты. Гэта і горкая адзінота, і шчаслівыя моманты радасці (адсюль і сімвалізм назвы новай кнігі), і адвечная антытэза горада і вёскі, і жаданне простага жаночага шчасця. Ёсць тут ноты філасофскіх роздумаў, клопат аб лёсе роднай зямлі. Ды што казаць — лепш чытаць. Таму прапануем чытачам «Звязды» некалькі новых вершаў гэтага аўтара.**



Марыя КОБЕЦ

***

З гасцінца крочу я ў сяло —
Вяртаюць карані з дарогі.
Сталіцы шумнае сіло
Стаміла цела да знямогі.

Ступаю роснаю травой,
Па быльнягу, па ўзмежках.
Здыму абцасы з ног далоў —
Ды басанож з усмешкай!

Глядзі ж ты — ў небасхіле, вунь,
Вясёлкі карагодзяць.
Гэй, поля веснавая рунь!
Ралля, што так лагодзіць!

Гэй, далеч, сонейка, цяпло!
Гэй ветрык, лес, мурогі!
Дамоў, у роднае сяло!
Бывайце ўжо, трывогі!

***

Вецер лашчыць зімовую хмарку.
Ён каханак яе і вястун.
Даланёю падхопіць і шпарка
Закалыша, гарэза-пястун.

Валасы ёй расчэша лісліва,
Клапатлівай расправіць рукой.
Сарамліва, ласкава, цнатліва
Пацалуе, крануўшы шчакой.

Побач зорка — нябёсаў істота —
Ззяе ярка на Млечным Шляху.
Але ў бляску — нуда і самота.
Ёй жа ласкі ну хоць бы крыху!

Маладзік — прыгажун яснавокі —
Асвятляе наўкола усіх.
Ды пагляд свой халодны, высокі
Ёй не дорыць, а звыкла прыцих.

Толькі зорачка з даляў далёкіх
Бляск свой дзеліць са мной
надвая.
І здаецца такой адзінокай!
Адзінокай... Такой жа, як я.

***

...Усмешкі Вашай шчырае
святло,
Далоняў цёплых хуткае
крананне —
Да дрыжыкаў,
Бяспамяцтва...
Сышло
Зімы мярзотнай золкае
трыванне.

Заззяў Сусвет адценнем
Вашых воч,
Згарэлі ўміг сумнеў
і спадзяванні.
...Стаў Новы Свет!
Былое ўсё — апроч!
Дзень добры,
Час адчайных парыванняў!

Бывай навекі ўжо, назола-тло!
Бывай...
Спатоліць хай імклівае
адхланне —
Усмешкі роднай шчырае святло,
Далоняў цёплых дрогкае
крананне...

***

Вечар.
Ціша.
Плыве далячынь.
Піша дождж на шкле
вокнаў нататкі.
Вечар.
Вы.
І рука на плячы.
Падваконне...
і Вашы пальчаткі.

Словаў шквал.
Усвядоміць б змагчы!
Рысы, рухі,
Загадкі, загадкі...
Ноч і Вы.
Галава на плячы
Падваконне...
і Вашы пальчаткі.

Забыццё.
Ноч сышла на спачын.
Завіхаецца золак — і раптам...
Падваконне...
Яно ж ні пры чым...
Падваконне —
без Вашых пальчаткаў.

Так. Адсутнасць.
Крычы — не крычы.
Без адказу — адно толькі
згадкі.
Падваконне... і Вашы ключы.
Падваконне...
без Вашых пальчаткаў.

■ КІНО Д'АР

# Дэні КАТЭ:

# «ЦЯПЕР НІКОЛІ НЕ СКАЖУ: «НІХТО НЕ ГЛЯДЗІЦЬ МАЕ ФІЛЬМЫ, ЗАТОЕ Я МАЮ ЎЗНАГАРОДЫ БЕРЛІНСКАГА КІНАФЕСТЫВАЛЮ»



**Ён прыехаў з Канады на «Лістапад», каб стаць старшынёй журы конкурсу «Маладосць на маршы». Высокі, у чорнай шапачцы над вушкамі, са шматлікімі татуіроўкамі і масіўнымі пярсцёнкамі на пальцах, ён, здаецца, адчуў сябе ў сваёй талерцы, прадставіў мінскай публіцы свае карціны «Вік+Фло ўбачылі мядзведзя» і «Барыс без Беатрыс», а мне паказаў вытатуіраваную сцэну з «Кастрычніка» Сяргея Эйзенштэйна на сваёй спіне.**

**Дэні Катэ — фестывальны рэжысёр, яго імя наўрад ці вядомае масаваму гледачу, яго фільмы хутчэй за ўсё не зацікавяць шырокі пракат — ён так падыходзіць «Лістападу».**

**Рэжысёр стаў зоркай сёлетняга форуму і сказаў, што ў Мінску паўсюль сустракаецца з гасціннасцю і чысцінёй. Не дзіўна.**

***— Як прадстаўнік фестывальнай тусоўкі скажыце, ці застаўся ў ёй нейкі снабізм у адрас так званых аматараў — рэжысёраў, што прыйшлі ў кінематограф без спецыяльнай адукацыі?***

— О, гэта вельмі цікавае пытанне. Фестывальны свет складаецца з пэўных суполак людзей, тут часта можна пачуць пра некага: «той з лакарнаўскіх», «той з канскіх» альбо «той з берлінскіх». Гэтыя суполкі становяцца ў некаторым сэнсе элітнымі сем'ямі, і ты павінен быць часткай гэтай сям'і. Яны існуюць самі па сабе і не вельмі цікавяцца аўтсайдарамі. Я не думаю, што яны грэбуюць некім з-за адсутнасці ў таго адукацыі, хутчэй — проста таму, што ён не з'яўляецца часткай элітнай групы. Я належу да пэўнай сям'і, я фестывальная персона, раблю фестывальныя фільмы, вандрую па свеце. У нейкім сэнсе мне сумна гэта казаць: разам з папулярнасцю на кінафестывалях мае фільмы не вельмі папулярныя ў публікі, іх не купляюць для паказаў на тэлебачанні альбо ў замежны пракат. З-за такога парадоксу свету кінематографа часам я знаходжуся ў захапленні, а часам вельмі сумую. У Мінску на паказы маіх фільмаў прыйшло прыкладна па 75 чалавек — гэта мая кар'ера ў Беларусі, гэта ўсе людзі, што тут мяне ўбачылі. З аднаго боку, я ўсцешаны і ўсхваляваны, а з другога — магчыма, праз некалькі дзён я падумаю: «І гэта ўсё?»

> **«Я цяпер размаўляю па-англійску, але, калі на вуліцы мяне ледзь не саб'е машына, я вылаюся на роднай мове. Так і персанажы фільма: калі яны напалоханы ці хочуць нешта сказаць у адкрытую — размаўляюць на рускай».**

***— Вам не падаецца, што адсутнасць поспеху ў публікі — гэта ў нейкай ступені камплімент для рэжысёра?***

— Ты можаш так думаць, калі малады, калі пачынаеш. Ты здымаеш складаныя заблытаныя стужкі, якія ніхто не хоча глядзець, ходзіш з ганарліва паднятай галавой і кажаш: «Яны нічога не разумеюць, я ствараю высокае мастацтва». Але ты становішся старэйшым, сустракаеш гледачоў, гутарыш з аўдыторыяй і разумееш яе. І тады пачынаеш ствараць не толькі для сябе, але і для людзей, і гэта не значыць, што ідзеш на кампраміс ці робіш камерцыйнае кіно. Я спадзяюся, у мяне атрымалася знайсці гэты баланс, цяпер ніколі не скажу: «Гэй, ніхто не глядзіць мае фільмы, затое я маю ўзнагароды Берлінскага кінафестывалю». Магчыма, мае карціны сапраўды «не для ўсіх», але нягледзячы на скептычныя позіркі з аўдыторыі, стараюся ўсміхацца, быць добразычлівым і гатовым адказаць на любыя пытанні. Калі падчас абмеркавання сваіх першых фільмаў я імкнуўся выглядаць таямнічым, цяпер кажу: «Вы не ўсё зразумелі? Добра, я абмяркую гэта з вамі». Мы павінны выхоўваць аўдыторыю.

***— Мне становіцца зразумелым, чаму ваш апошні фільм «Барыс без Беатрыс», у адрозненне ад папярэдніх работ, пабудаваны на даволі прадказальным жанры, так скажам, прытчы.***

— Так, я чуў падобную думку — гэтую карціну называлі больш даступнай і прамалінейнай. І сапраўды, фільм атрымаўся ў нейкім сэнсе класічным. Але я не ставіў сабе такой мэты, проста маю ідэю варта было рэалізаваць менавіта так. Калі, як у выпадку з карцінай «Барыс без Беатрыс», ты маеш справу з камерцыйным праектам, вялікім бюджэтам і з табой працуе трыццаць чалавек, ты не тое каб займаешся самацэнзурай, але адчуваеш адказнасць. Магчыма, гэта і ёсць прычына большай даступнасці фільма.

***— Якое ўвасабленне ў рэальным жыцці можа мець таямнічы герой Дэні Лавана, які прымушае Барыса задумацца над сваім жыццём і ў выніку яго змяніць?***

— Барыс фактычна размаўляе сам з сабой. Персанаж Дэні Лавана, яго касцюм, таямнічае асвятленне, пляцоўка на пустыры, дзе адбываюцца размовы, — гэта ўсё ідэі для мізансцэны, якія мусяць візуалізаваць гутарку са сваім сумленнем. Было забаўна пачынаць пісаць сцэнарый для «Барыса», таму што ідэя фільма заключаецца, можна сказаць, у тым, што чалавек дзевяноста хвілін размаўляе сам з сабой. Мне трэба было прыдумаць спосаб займальна гэта рэалізаваць.



Кадр з фільма «Барыс без Беатрыс».

***— У фільме даволі вялікая колькасць славянскіх водгукаў...***

— Гэта выпадковасць. Я хацеў працаваць з Ізольдай Дзіхаўк (яна нарадзілася ў Расіі. — **Аўт.**), але яна не ведала французскай мовы, тады я звязаўся з выканаўцам галоўнай ролі Джэймсам Хайндмэнам і запытаўся, ці не ведае ён выпадкова нямецкую ці рускую. Аказалася, ён мог размаўляць на рускай — так, уласна, стварыліся гэтыя славянскія сувязі. Гэта было збегам абставін, адпаведна я не задаваўся мэтай зрабіць каментарый у бок славянскай культуры, але гэта прынесла ў фільм дадатковую ідэю. Я цяпер размаўляю па-англійску, але, калі на вуліцы мяне ледзь не саб'е машына, я вылаюся на роднай мове. Так і персанажы фільма: калі яны напалоханы ці хочуць нешта сказаць у адкрытую, размаўляюць на рускай. Мне гэта падаецца мілым: калі ў нас праблемы, мы звяртаемся да сваіх вытокаў. Да таго ж галоўны герой Барыс — не карэнны канадзец, што ў пэўным сэнсе характарызуе аблічча цяперашняй французскай Канады.

> **«Нягледзячы на тое, што апошнія дваццаць хвілін займаюць сцэны гвалту, «Вік+Фло ўбачылі мядзведзя» — рамантычны фільм».**

***— Ці ёсць нейкае адрозненне паміж квебекскім і канадскім кінематографам?***

— У англамоўнай Канадзе існуе пэўная праблема: за апошнія трыццаць гадоў вы наўрад ці зможаце назваць іншых рэжысёраў, апроч Атома Эгаяна, Дэвіда Кроненберга і Гая Мэдзіна. Мы не ведаем, чаму яна не здольная ствараць новыя імёны. Ёсць маладыя рэжысёры, але яны здымаюць першыя фільмы і знікаюць. Калі мы хочам быць жорсткімі з англамоўнымі канадцамі, мы кажам, што яны з'яўляюцца проста 51 штатам ЗША, бо размаўляюць па-англійску, глядзяць амерыканскія серыялы і не маюць уласнай культуры. Гэта нядобрыя словы, але ў іх ёсць праўда. У франкамоўнай Канадзе спрацоўвае пэўны культурны рэфлекс: навокал жывуць англамоўныя, і нашы маленькія 8 мільёнаў маюць мову, музыку, тэлебачанне, камерцыйнае кіно, арт-мэйнстрым і такіх рэжысёраў, як я (што не маюць шырокага пракату, але ўдзельнічаюць у міжнародных кінафестывалях). Можна сказаць, існуе сумная англамоўная Канада і творчая, актыўная франкамоўная. Апошнія гады мы маем таксама Ксаўе Далана, але ён ужо не ўспрымаецца як французскі канадзец, бо стаў як бы асобнай планетай. Як Пэдра Альмадовар, які таксама не іспанец. Пэдра Альмадовар — гэта Пэдра Альмадовар.

***— Як вы прыдумалі смерць галоўных герань для фільма «Вік+Фло ўбачылі мядзведзя»? Ёсць нейкі сімвал у мядзведзі ці ў тым, што памерлых раздзяляе дарога?***

— Яшчэ на этапе ідэі фільма я ведаў, што «заб'ю» галоўных герань, але сумняваўся, ці дазволена рэжысёру так рабіць з персанажамі, якіх ён любіць. Нягледзячы на тое, што апошнія дваццаць хвілін займаюць сцэны гвалту, «Вік+Фло ўбачылі мядзведзя» — рамантычны фільм. Смерць герань — гэта выйсце для іх абедзвюх, я знайшоў спосаб зрабіць так, каб яны былі разам вечна, для мяне гэта хэпі-энд. У фільме я гуляю з жанрамі і чаканнямі гледача, таму і назву хацеў выбраць адпаведную. Вы чытаеце «Вік+Фло ўбачылі мядзведзя» і думаеце: Вік і Фло — гэта мужчынскія ці жаночыя імёны? Ці людзі гэта? Чаму тут плюс, а не злучнік «і»? Вы не ведаеце. Згадка пра мядзведзя дае адчуванне небяспекі. Усё разам гучыць, як назва дзіцячага анімацыйнага фільма, а гэта працяг маёй гульні. Паколькі гераіні паміраюць у пастках для мядзведзя, яны як бы бачаць яго. Гэта не столькі метафара, як гульня слоў.

***— У вашых фільмаў ёсць пэўныя лейтматывы — лес, вытворчасць, эмігранты. Ці можаце вы гэта неяк пракаментаваць?***

— Так можна сказаць. Лес для мяне... Я вельмі гарадскі чалавек, не маю машыны, вадзіцельскіх правоў і ніколі не пакідаю горад. Калі я пішу гісторыю, я наўмысна выношу яе за межы горада, таму што мяне гэта натхняе. Я не ведаю, што там, за горадам, для мяне гэта страшна, уяўляецца, што тут можна сустрэць монстраў. Што тычыцца вытворчасці: мяне цікавіць, як у маім фільме «Гэта радасць была дасканалай» адбываецца ўзаемадзеянне машыны і чалавечага цела. У маёй новай карціне гаворка ідзе пра бодзібілдараў. Уласна ў мяне праблемы са здароўем, таму мне цікава працаваць з тэмай чалавечага цела. Нарэшце, пра эмігрантаў. Мы размаўлялі пра франкамоўную Канаду, дык вось яна зацыклена на сабе, на сваім свеце, і мне хочацца рабіць гэтаму выклікі, умяшчаць у свае фільмы людзей рознага паходжання, гуляць са стэрэатыпамі. Напрыклад, у «Вік+Фло ўбачылі мядзведзя» ёсць два цёмнаскурыя персанажы і яны абодва нясуць небяспеку — гэта непаліткарэктна і для мяне вельмі весела. Героі рознага паходжання — гэта мой палітычны каментарый на закрытасць франкамоўнай Канады.

> **«У Мінску на паказы маіх фільмаў прыйшло прыкладна па 75 чалавек — гэта мая кар'ера ў Беларусі, гэта ўсе людзі, што тут мяне ўбачылі».**

***— Калі вы сталі рэжысёрам пасля работы кінакрытыкам, ці зразумелі, што крытык насамрэч не здольны аб'ектыўна ацэньваць кіно?***

— Пытанне на сто долараў? *(Смяецца.)* Я працаваў кінакрытыкам дзесяць гадоў, але не таму, што асабліва імкнуўся. Я быў сінефілам, праводзіў шмат часу ў мясцовай сінематэцы, і мне прапанавалі выступіць у гэтай ролі. Я займаўся кінакрытыкай з задавальненнем, ставіўся да яе адказна і сур'ёзна, але ўспрымаў як часовы занятак. Нават тады маёй галоўнай мэтай было стаць рэжысёрам: паралельна я здымаў караткаметражкі і ведаў, што вялікія фільмы яшчэ наперадзе. Я перастаў быць кінакрытыкам у 2005 годзе, але па-ранейшаму паважаю гэту прафесію, у адрозненне ад тых рэжысёраў, што ставяцца да яе насцярожана. Я не думаю, што трэба зняць фільм, каб ацэньваць кіно, бо задача кінакрытыка — ствараць сувязь паміж аўтарамі і гледачамі. У яго іншы інструмент — не камера, а слова. Я зацікаўлена, спакойна чытаю артыкулы пра свае фільмы і не ўспрымаю іх блізка да сэрца. Але я думаю, кінакрытыкам было б карысна ўбачыць здымачны працэс і працэс мантажу, таму што паміж тымі, хто здымае кіно і піша пра яго, часам існуе надта вялікая дыстанцыя.

***— Што такое мастацтва кіно?***

